WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 МАЯ 2010 г.
СЕРАДА
№ 85
(26693)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

АБ СПРАВАХ САРДЭЧНЫХ

мы пагаворым на нашай чарговай «прамой лініі», у якой возьмуць удзел **загадчык інфарктнага аддзялення №2 10-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы Наталля Якаўлеўна ПАЛЯЎКОВА** і **ўрач-кардыёлаг таго ж аддзялення Ірына Віктараўна ГРЫШЫНА.** У нашых гасцей вы зможаце запытаць пра хваробы, звязаныя з артэрыяльным ціскам, пра тое, як папярэдзіць інфаркты і інсульты, пра лячэнне гэтых паталогій і рэабілітацыю пасля іх.

«Прамая лінія» адбудзецца 11 мая, у аўторак, з 16.00 да 17.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

ПРАДСТАЎНІКІ ВЕТЭРАНСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ЎДАСТОЕНЫ ДЗЯРЖУЗНАГАРОДАЎ

Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў дзяржаўнымі ўзнагародамі прадстаўнікоў ветэранскіх арганізацый за шматгадовую плённую працу, вялікі асабісты ўклад у гераіка-патрыятычнае выхаванне моладзі, дапамогу ў вырашэнні сацыяльных пытанняў ветэранаў. Адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 3 мая.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны першы намеснік старшыні Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Міхаіл Жукоўскі і старшыня камітэта ветэранаў вайны — намеснік старшыні Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Міхаіл Самонаў.

Ордэна Пашаны ўдастоены старшыня Мядзельскай раённай арганізацыі ветэранаў Міхаіл Гордан, старшыня камісіі па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў войнаў Гродзенскай абласной арганізацыі ветэранаў Васіль Каламіец, першы намеснік старшыні савета Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Віктар Кастко.

Гэтай узнагародай таксама адзначаны старшыня камітэта ветэранаў вайны Брэсцкай абласной арганізацыі ветэранаў Аляксей Кот, старшыня савета Магілёўскай абласной арганізацыі ветэранаў Анатоль Любчанка, старшыня рэвізійнай камісіі Віцебскай абласной арганізацыі ветэранаў Валянцін Серабракоў.

Ордэна Пашаны таксама ўдастоены старшыня савета Калінкавіцкай раённай арганізацыі ветэранаў Рыгор Торап, старшыня камітэта ветэранаў вайны і Узброеных Сілаў Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Міхаіл Чумакоў.

ПАДЗЯКА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ АБ'ЯЎЛЕНА ПРАДСТАЎНІКАМ ВЕТЭРАНСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, СТАТКАМІТЭТА, СПАРТСМЕНАМ І ТРЭНЕРАМ

Адпаведнае распараджэнне Аляксандр Лукашэнка падпісаў 3 мая.

За высокі прафесіяналізм і значны ўклад у падрыхтоўку і правядзенне ў 2009 годзе перапісу насельніцтва Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена супрацоўніцы Нацыянальнага статыстычнага камітэта Наталлі Новік і начальніку аддзела статыстыкі Асіповіцкага раёна Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Магілёўскай вобласці Ліліі Пышнай.

Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена таксама прадстаўнікам ветэранскіх арганізацый краіны за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у гераіка-патрыятычным выхаванні моладзі, дапамогу ў вырашэнні сацыяльных пытанняў ветэранаў. Сярод іх — старшыня камісіі па гераіка-патрыятычнаму выхаванню моладзі Кастрычніцкай раённай арганізацыі ветэранаў г. Гродна Надзея Башко, старшыня Іўеўскай раённай арганізацыі ветэранаў Аляксей Гончанка, старшыня савета Маладзечанскай раённай арганізацыі ветэранаў Станіслава Зубкова, першы намеснік старшыні савета Віцебскай абласной арганізацыі ветэранаў Леанід Мацкевіч, старшыня Слуцкай раённай арганізацыі ветэранаў Раіса Мельнікава.

За дасягненне высокіх спартыўных вынікаў на XXI Дэфлімпійскіх летніх гульнях 2009 года ў г.Тайбэй (Тайвань), плённую дзейнасць па развіцці фізічнай культуры і спорту сярод інвалідаў Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена члену ГА «Беларускае таварыства глухіх» Кацярыне Белай, начальніку каманды — старшаму трэнеру нацыянальнай каманды Беларусі па інваспорце Святлане Жыгайлавай і спартсмену-інструктару Саслану Сідакову, слесару механазборачных работ ААТ «Мінскі аўтамабільны завод» ВА «БелаўтаМАЗ» Таццяне Клімовіч, токару механічнага цэха Мінскага ВПУП «Віток» ГА «Беларускае таварыства глухіх» Аляксандру Козічу і іншым.

Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена спартсменам і трэнерам нацыянальнай каманды па веславанні на байдарках і каноэ за дасягненне высокіх спартыўных вынікаў на чэмпіянаце свету 2009 года ў г. Дартмут (Канада), забеспячэнне якаснай падрыхтоўкі нацыянальнай каманды Беларусі. У прыватнасці, сярод іх — старшы трэнер Мікалай Банько, дзяржаўны трэнер Яўген Чучкевіч, спартсмены-інструктары Аляксандр і Андрэй Багдановічы, Аляксандр Ваўчэцкі, Дзмітрый Рабчанка.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАЎ ІНТЭРВ'Ю ІНФАРМАГЕНЦТВУ «РЭЙТЭР»

На працягу двухгадзіннай гутаркі кіраўнік дзяржавы адказаў прыкладна на 30 пытанняў па рознай тэматыцы: аб адносінах з Захадам і Расіяй, развіцці Саюзнай дзяржавы, перспектывах прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў, будучай прэзідэнцкай кампаніі, актуальных пытаннях міжнароднай палітыкі.

Агенцтва «Рэйтэр» — адно з буйнейшых у свеце міжнародных агенцтваў навін — было заснавана ў Лондане ў 1851 годзе. У агенцтве працуюць больш як 14 тыс. супрацоўнікаў у 128 краінах. «Рэйтэр» налічвае больш як 190 бюро па ўсім свеце. Пачынаючы з 2007 года агенцтва «Рэйтэр» штогод бярэ інтэрв'ю ў Прэзідэнта Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

УВАГА, КІРОЎЦЫ!

З 5 па 8 мая з 13.30 па 19.30 будзе абмежаваны рух усіх відаў транспарту ў абодвух накірунках па праспекце Машэрава на ўчастку ад вуліцы Даўмана да праспекта Пераможцаў.

У акрэслены час плануецца правесці рэпетыцыі параду, прымеркаванага да 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Дзяржаўтаінспекцыя Мінска просіць усіх кіроўцаў загадзя планаваць свой маршрут руху.

Надзея ДРЫЛА.

СМІ ў Беларусі

4–7 МАЯ 2010 ГОДА

У СВЯТЛЕ ПЕРАМОГІ

У Беларусі, а таксама на ўсёй тэрыторыі былога СССР, няма газеты з такой адметнай біяграфіяй, як «Звязда». Пра гэта расказаў стэнд газеты на штогадовай прафесійнай выставе, прысвечанай сёлета 65-годдзю Вялікай Перамогі. Пра гэта ж усім прысутным пры адкрыцці выставы нагадалі вядучыя. Бо, як кажуць, з песні слова не выкінеш. І невыпадкова галоўнымі гасцямі нашага стэнда, як заўсёды, сталі простыя людзі — тыя, для каго мы працуем. І ў гэтым — сіла «Звязды», непадуладная павевам часу. І гэта застанецца, гэтага не абмінуць...

Усіх, хто завітаў на стэнд «Звязды», і ў першую чаргу ветэранаў, частавалі смачнай салдацкай кашай.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Беларускія СМІ ўпэўнена адчуваюць сябе ў сусветнай інфармацыйнай прасторы. Такую думку выказаў журналістам на XIV Міжнароднай спецыялізаванай выстаўцы «СМІ ў Беларусі» міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі.

Паводле слоў міністра, мінулы год быў для ўсіх сродкаў масавай інфармацыі даволі цяжкі, аднак беларускія журналісты і выдаўцы змаглі не толькі выжыць у гэтых умовах, але і павялічыць тыражы рэгіянальных газет. Гэта добрае дасягненне, лічыць Алег Праляскоўскі.

У Беларусі ў 2009—2010 гадах сталі актыўна развівацца рэгіянальныя сродкі масавай інфармацыі. Міністр адзначыў цікавую і плённую работу СМІ Гродна, Ліды, Оршы і Салігорска — часопісы, газеты і тэлебачанне гэтых гарадоў ідуць у нагу з часам, выкарыстоўваюць самыя перадавыя тэхналогіі, маюць свайго чытача і павялічваюць колькасць сваіх прыхільнікаў.

Міністр падкрэсліў, што ў гэтым годзе арганізатары выстаўкі ўдзялілі вялікую ўвагу ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку і тым, хто змагаўся з фашызмам не толькі з аўтаматам ў руках, але і пяром.

«Мы рады, што да гэтага часу ў нашым страі ветэраны вайны, ветэраны журналістыкі, — сказаў, вітаючы гасцей, Алег Праляскоўскі. — Яны перадаюць свой вопыт, мудрасць маладым пакаленням».

На адкрыцці выставы.

Фота БЕЛТА.

Завітаў павіншаваць калегаў з прафесійным святам і старшыня Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр ЗІМОЎСКІ: «А тушонкі не пашкадавалі!».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

З прывітаннем ад імя кіраўніка дзяржавы да гасцей выстаўкі і ветэранаў звярнуўся памочнік Прэзідэнта — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Усевалад Янчэўскі.

У прывітанні гаворыцца, што штогадовая дэманстрацыя магчымасцяў рэгіянальных і рэспубліканскіх СМІ, дзелавыя кантакты, абмен вопытам, канструктыўныя дыскусіі пераканаўча сведчаць аб зацікаўленасці ў далейшым развіцці СМІ. Міжнародны статус выстаўкі пацвярджае, што гэтая маштабная падзея выклікае цікавасць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Прафесія журналіста цяжкая і адказная, патрабуе таленту, працавітасці, самааддачы, адданасці сваёй справе, актыўнай грамадзянскай пазіцыі і рынцыповасці. Самая высокая ацэнка дзейнасці СМІ — давер людзей. Менавіта дзякуючы яму старэйшым выданням Беларусі ўдалося захаваць вядучыя пазіцыі на інфармацыйным полі краіны. У той жа час упэўнена заваёўваюць аўтарытэт новыя газеты і часопісы. На тэлебачанні і радыё рэалізуюцца новыя праекты, актыўна ўкараняюцца сучасныя тэхналогіі, адзначаецца ў прывітанні Прэзідэнта Беларусі.

СТАР. 2

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ВЕТЭРАНАМ — БЯСПЛАТНЫ ПРАЕЗД

Увесь гэты тыдзень да 9 мая ўключна ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Брэстчыны могуць бясплатна ездзіць транспартам ААТ «Брэстаблаўтатранс».

Бясплатны праезд ветэранам прапаноўваецца ў аўтобусах і мікрааўтобусах гарадскіх, прыгарадных і міжгародніх маршрутаў у межах Брэсцкай вобласці. Для праезду па горадзе дастаткова паказаць пасведчанне ветэрана, а для міжгародняй паездкі ў адпаведнасці з пасведчаннем выпішуць бясплатны квіток.

Яна СВЕТАВА.

ДАРОГІ ДЛЯ ПРЫЁМУ ВЕТЭРАНСКІХ ДЭЛЕГАЦЫЙ ГАТОВЫЯ

Прадпрыемствы дэпартамента «Белаўтадар» завяршылі комплекс работ па падрыхтоўцы рэспубліканскіх аўтадарог да летняй эксплуатацыі.

У прыватнасці, было пафарбавана і адрамантавана каля 800 кіламетраў бар'ернай агароджы, больш за 5 тысяч дарожных знакаў, каля 100 тысяч сігнальных слупкоў і 5 тысяч аўтапавільёнаў. Усяго з пачатку года на рэспубліканскай сетцы ліквідавана больш за 140 тысяч квадратных метраў ямачнасці. Дарожныя службы распачалі разметку праезнай часткі: зараз нанесена больш за 3 тысячы кіламетраў ліній разметкі.

Сёлета працэс падрыхтоўкі дарог да летняга сезону меў асаблівую спецыфіку, звязаную са святкаваннем 65-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Таму асаблівая ўвага надавалася маршрутам руху дэлегацый на святкаванне Дня Перамогі. Гэта, напрыклад, датычыла аўтадарогі М-1/Е-30 Брэст — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі, М-2 Мінск — Нацыянальны аэрапорт «Мінск», М-3 Мінск — Віцебск з пад'ездам да Хатыні і іншыя. Былі таксама прыведзеныя ў парадак размешчаныя ўздоўж рэспубліканскіх аўтатрас помнікі, абеліскі і мемарыяльныя комплексы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЛАРУСЬ АДСТОЙВАЕ ЗАХАВАННЕ ІСНУЮЧЫХ ПОШЛІНАЎ НА ЛЕГКАВЫЯ АЎТАМАБІЛІ

Беларусь адстойвае захаванне ў Мытным саюзе існуючых пошлінаў на легкавыя аўтамабілі для фізічных асобаў. Аб гэтым заявіў журналістам у Брэсце першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Уладзімір Гошын, перадае БЕЛТА.

Канчатковае рашэнне па пошлінах будзе прымацца на ўзроўні экспертаў трох краін, якія займаюцца падрыхтоўкай дакументаў. Уладзімір Гошын падкрэсліў, што Беларусь адстойвае пазіцыю па захаванні дзеючых на гэты момант унутры краіны пошлінаў для фізічных асобаў на ўвозімыя аўтамабілі. Пры гэтым першы намеснік старшыні ДМК не выключыў магчымасці ў выпадку захавання нізкіх пошлінаў увядзення для грамадзян Беларусі абмежаванняў на адчужэнне транспартных сродкаў. «Мы добра ўсведамляем, што, захоўваючы дзеючыя пошліны, павінны будзем узяць на сябе нейкія абмежаванні. Магчыма, будзе вернута становішча, якое абмяжоўвае права адчужэння аўтамабіля на працягу двух або трох гадоў па дзеючых сёння стаўках», — растлумачыў Уладзімір Гошын.

«МЫ Ж АДНОЛЬКАВЫЯ»

Не зусім звычайнага парушальніка затрымалі пільныя мытнікі на пункце пропуску беларуска-ўкраінскай мяжы «Макраны».

Жанчына спрабавала перасячы мяжу па чужым пашпарце. Але яна была вельмі падобная на тую, што змешчана на здымку ў дакументе. Аказалася, што парушальніца ўзяла пашпарт сястры, а з сястрой яны блізняты. Ды вось толькі падарожніца не мела права ехаць за мяжу, бо ў сваёй краіне мае праблемы з законам.

Яна СВЕТАВА.

РАСПЛАТА ЗА ЗДРАДУ

У Любанскім раёне муж адным стрэлам разбіў любоўны трохкутнік.

У сям'і 53-гадовага брыгадзіра трактарнай брыгады з Любанскага раёна, які пабраўся шлюбам з 35-гадовай запраўшчыцай трактарнай тэхнікі, здавалася б, было ўсё гладка. Але да пары да часу. Пакуль ён летам мінулага года не даведаўся, што жонка здрадзіла яму з яго ж падначаленым — 35-гадовым трактарыстам. Падзеі разварочваліся як у класічным любоўным трохкутніку: сваркі, просьбы спыніць любоўную сувязь і пагрозы забойствам, якія ў рэшце рэшт спраўдзіліся. У мінулую пятніцу каля дзевяці гадзін вечара раўнівы муж з абрэзам паляўнічай стрэльбы прыехаў у вёску, у якой жыў палюбоўнік жонкі, і стрэліў яму ў жывот. Сапернік ад атрыманых цялесных пашкоджанняў загінуў на месцы.

Надзея ДРЫЛА.

МАРШРУТКА ЎЕХАЛА Ў СЦЯНУ

Вадзіцель маршрутнага таксі № 10 у Брэсце на дарозе адчуў сябе дрэнна і, відаць, страціў прытомнасць.

Некіруемы аўтамабіль вылецеў на тратуар у раёне прыпынку «МОПРА» па праспекце Машэрава, зачапіў дзве легкавушкі і ўрэзаўся ў сцяну шматпавярхоўкі. У салоне было 12 пасажыраў. Яны атрымалі лёгкія траўмы і пасля аказання медыцынскай дапамогі былі адпушчаныя дадому. Вадзіцель «ГАЗэлі» атрымаў чэрапна-мазгавую траўму. Акурат на гэтым месцы два гады таму рушыў па дарозе некіруемы тралейбус. Машына «чапляла» легкавушкі, стукалася ў грузавікі, але ў 2008 годзе, на шчасце, абышлося без ахвяраў.

Яна СВЕТАВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДЗЯРЖДУМА АДПРАВІЦЬ ГАСТАРБАЙТАРАЎ З СНД НА ДАКТЫЛАСКАПІЮ

Дзярждума РФ разгледзіць у другім чытанні праект паправак у дзейны федэральны закон «Аб прававым становішчы замежных грамадзян у РФ». Паводле гэтага дакумента, ва ўсіх жыхароў былых савецкіх рэспублік, якія хочуць працаваць у Расіі, будуць браць адбіткі пальцаў. Акрамя таго, грамадзян, якія прыбываюць у РФ у адпаведнасці з дамовай пра бязвізавы рэжым, будуць фатаграфаваць пры выдачы дазволу на працу.

У лютым 2010 года статс-сакратар ФМС Кацярына Ягорава распавяла, што папраўкі кранулі найперш тых мігрантаў, якія працуюць у фізічных асобаў. Да іх ліку адносяцца выхавальнікі, садоўнікі, вартаўнікі і іншы абслуговы персанал. Гаворка ідзе аб працах, не звязаных з прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Для атрымання дазволу на працу працоўным мігрантам трэба будзе аформіць адмысловы патэнт. За яго прыйдзецца заплаціць 1000 рублёў. Патэнт будзе выдавацца на тэрмін ад аднаго да трох месяцаў. Пасля яго можна будзе падоўжыць на тэрмін да аднаго года. Гэты дакумент дазволіць мігранту працаваць на тэрыторыі таго суб'екта РФ, у якім ён быў выдадзены.

АХМАДЗІНЕЖАД ЗАКЛІКАЎ ЗША ДА АДКАЗНАСЦІ З ТРЫБУНЫ ААН

Галоўным пытаннем першага дня канферэнцыі ААН, прысвечанай Дамове пра нераспаўсюджанне ядзернай зброі, стала іранская атамная праграма, паведамляе Deutsche Welle.

У Нью-Ёрку 3 мая пачалася канферэнцыя ААН па выкананні міжнароднай Дамовы аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі. Адкрываючы яе, Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун у чарговы раз папярэдзіў пра небяспеку новай гонкі ядзернага ўзбраення. «Калі краіны, якія валодаюць атамнай зброяй, не будуць прытрымлівацца палажэнняў дамовы, гэта стане кропкам назад», — цытуе Пан Гі Муна агенцтва AFP.

На адкрыцці канферэнцыі генеральны сакратар ААН заклікаў усе краіны, якія яшчэ не далучыліся да дамовы пра нераспаўсюджанне ядзернай зброі, як мага хутчэй ратыфікаваць яе. Яго зварот, у прыватнасці, быў адрасаваны ўрадам Ізраіля, Індыі, Пакістана і Паўночнай Карэі — краін, якія валодаюць, па ўсеагульных перакананнях, значным ядзерным арсеналам.

Галоўным пунктам першага дня канферэнцыі стала іранская атамная праграма. Пан Гі Мун звярнуўся да іранскіх улад з заклікам развеяць падазрэнні міжнароднай супольнасці пра ядзерную праграму Тэгерана і прыняць прапанову МАГАТЭ пра супрацоўніцтва ў вобласці атамных даследаванняў.

Іранскі прэзідэнт выкарыстоўваў трыбуну ААН для крытыкі Злучаных Штатаў. «ЗША не толькі падарвалі атамную бомбу. Яны пагражаюць ёю іншым дзяржавам, у тым ліку маёй», — заявіў Ахмадзінежад. Паводле яго слоў, ЗША, якія распаўсюдзілі над светам «цень страху», з'яўляюцца пагрозай усяму чалавецтву. Ахмадзінежад таксама абвінаваціў Злучаныя Штаты ў дапамозе тэрарыстам і запатрабаваў дэмантаваць ядзерную зброю на амерыканскіх ваенных базах.

Канферэнцыя, на якой сабраліся прадстаўнікі 189 дзяржаў, што падпісалі Дамову пра нераспаўсюджанне ядзернай зброі, працягнецца да 28 мая.

РАСІЯ ЗА МЕСЯЦ ПАТРАЦІЛА ЧАЦВЁРТУЮ ЧАСТКУ РЭЗЕРВОВАГА ФОНДУ

Рэзервовы фонд Расіі ў красавіку скараціўся на 23,4 працэнта — з 1,553 да 1,189 трыльёна рублёў, тады як Фонд нацыянальнага дабрабыту (ФНД) паменшыўся на 1,1 працэнта — з 2,63 да 2,6 трыльёна рублёў. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным прэс-рэлізе Мінфіна.

Рэзервовы фонд няўхільна скарачаецца з 2009 года. Міністэрства неаднаразова заяўляла, што сродкі Рэзервовага фонду будуць фактычна вычарпаны да канца 2010 года. Каб кампенсаваць недахоп сродкаў, урад Расіі выйшаў на знешні рынак запазычанняў.

Беларусь нарошчвала ў I квартале гандаль таварамі

Па выніках студзеня—сакавіка, згодна з аператыўнымі звесткамі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, аб'ём знешняга гандлю таварамі краіны павялічыўся на 17,1 працэнта ў параўнанні з першым кварталам мінулага года і склаў 11 мільярдаў 776,1 мільёна долараў ЗША.

Экспарт за першыя тры месяцы гэтага года ўзрос на 29,2 працэнта да 5 мільярдаў 269,9 мільёна долараў, імпарт павялічыўся на 8,9 працэнта да 6 мільярдаў 506,2 мільёна долараў. Такім чынам, адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі склала 1 мільярд 236,3 мільёна долараў, прычым што летась па выніках першага квартала яно было адмоўнае і раўнялася 1 мільярду 896,8 мільёна долараў. З краінамі СНД рэспубліка ў студзені—сакавіку гандлявала з мінусам: сальда склалася адмоўным у памеры 1 мільярд 355,3 мільёна долараў (летась за аналагічны перыяд — мінус 1 мільярд 985,7 мільёна). Экспарт вырас на 48,7 працэнта да 2 мільярдаў 659,7 мільёна долараў, імпарт — на 6,4 працэнта да 4 мільярдаў 15 мільёнаў.

А вось з краінамі па-за Садружнасцю наша рэспубліка па гандлі таварамі ў плюсе: сальда склалася станоўчым у памеры 119 мільёнаў долараў. Экспарт у краіны па-за СНД павялічыўся на 14 працэнтаў да 2 мільярдаў 610,2 мільёна долараў, імпарт — на 13,2 працэнта да 2 мільярдаў 291,2 мільёна. Аб'ём знешняга гандлю таварамі з краінамі па-за Садружнасцю ў першым квартале склаў 5 мільярдаў 101,4 мільёна і ў параўнанні са студзенем—сакавіком 2009 года вырас на 13,6 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

Каштоўныя металы. Новыя цэны

Пастановай Міністэрства фінансаў уведзены новыя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, што скупліваюцца ў фізічных асобаў (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асобаў) і пастаўляюцца ў Дзяржфонд. У сілу яны ўступілі ў пачатку месяца. Дагэтуль, нагадаем, цэны на каштоўныя металы змяняліся з 4 сакавіка, перад гэтым — з 1 студзеня.

З пачатку мая скупачныя цэны ў рублях за грам металу ўстаноўлены наступнымі. Золата ў вырабах і ломе: 375-й пробы — 35 450 рублёў (з 4 сакавіка было 32 920 рублёў за грам металу); 500-й пробы — 47 260 рублёў (было 43 900 рублёў); 583-й і 585-й пробы — 55 300 рублёў (51 360 рублёў); 750-й пробы — 70 900 рублёў (65 840 рублёў); 900-й пробы — 85 070 рублёў (79 010 рублёў); 916-й пробы — 86 590 рублёў (80 420 рублёў); 950-й пробы — 89 800 рублёў (83 400 рублёў); 958-й пробы — 90 560 рублёў за грам металу (ранейшая цана складала 84 100 рублёў).

Плаціна ў вырабах і ломе: 950-й пробы — 133 930 рублёў за грам металу (дагэтуль было 116 150 рублёў). Серабро ў вырабах і ломе: 750-й пробы — 1 120 рублёў за грам металу з пачатку мая (з 4 сакавіка цана была 950 рублёў); 800-й пробы — 1 200 рублёў (1 020 рублёў); 875-й пробы — 1 310 рублёў (1 110 рублёў); 916-й пробы — 1 370 рублёў (1 170 рублёў); 925-й пробы — 1 380 рублёў (1 180 рублёў); 960-й пробы — 1 430 рублёў за грам металу (1 220 рублёў дагэтуль).

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.05.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 971,00	1 чэшская крона	152,87
▼ 1 еўра	3 910,73	1 польскі злоты	996,33
1 латвійскі лат	5 532,07	▼ 1 расійскі рубель	101,41
1 літоўскі літ	1 133,58	1 украінская грыўня	372,77

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,2982
10 UAH	36,7606
1000 BYR	9,8914
EUR	38,6004

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

БЕЛАРУСБАНК
Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»

В связи с 65-летием Великой Победы
ОАО «АСБ Беларусбанк» проводит акцию
по снижению в два раза процентных ставок по действующим кредитным договорам на общих основаниях, заключенным с ветеранами, инвалидами Великой Отечественной войны и бывшими узниками.

65 ЛЕТ ВЕЛИКОЙ ПОБЕДЫ

Подробности — в учреждениях банка и на сайте www.belarusbank.by

УНП 100325912
Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ N 1 от 28.08.2008 г.

Ільготныя крэдыты на рамонт пустуючых жылых дамоў у вёсцы будуць выдавацца ў Беларусі

Рэжым ільготнага крэдытавання будзе распаўсюджаны на рамонт пустуючых індывідуальных дамоў (кватэр), якія знаходзяцца на балансе сельскагаспадарчых арганізацый Беларусі. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта Беларусі, адпаведны ўказ № 212, якім унесены змяненні ва ўказ ад 2 верасня 1996 года № 346 «Аб некаторых мерах па развіцці жыллёвага будаўніцтва ў вёсцы», Аляксандр Лукашэнка падпісаў 30 красавіка.

На канец 2009 года ў рэспубліцы налічвалася 6225 пустуючых жылых дамоў (кватэр), якія знаходзяцца на балансе сельскагаспадарчых арганізацый. Як правіла, гэтыя жылыя дамы (кватэры) падубаваны 10 і больш гадоў таму і патрабуюць правядзення капітальнага рамонту.

Па выніках вывучэння гэтай праблемы прызнана магчымым аднаўленне (рамонт) і далейшае выкарыстанне 3015 пустуючых жылых дамоў (кватэр), або 48 працэнтаў агульнай іх колькасці. Фінансавыя затраты на правядзенне рамонту ацэньваюцца ў Br122,4 млрд. Паводле інфармацыі Мінбудархітэктуры, на будаўніцтва такой жа колькасці жылых дамоў (кватэр) спатрэбіцца Br722,5 млрд, або практычна ў 6 разоў больш, чым на рамонт. Такім чынам, рамонт гэтай часткі пустуючых дамоў (кватэр) з далейшым уключэннем іх у гаспадарчы абарот з'яўляецца эканамічна мэтазгодным.

Прадастаўленне на гэтыя мэты льготных крэдытаў ААТ «Белаграпрамбанк» будзе садзейнічаць зніжэнню колькасці пустуючага жылля ў сельскай мясцовасці і вырашэнню жыллёвага пытання для работнікаў гаспадарак і арганізацый сацыяльна-культурнай сферы.

Паводле інфармацыі Мінсельгасхарча, колькасць маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у сельскагаспадарчых арганізацыях на лістапад 2009 года складала 8854 чалавекі.

Акрамя таго, прыведзены ў адпаведнасць з іншымі нарматыўнымі актамі некаторыя нормы ўказа, якія датычацца выдзялення льготных крэдытаў на будаўніцтва жылых дамоў па зацверджаных Мінбудархітэктуры тыпавых праектах і праектах паўторнага прымянення, а таксама ў частцы аплаты паслуг па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці.

Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Беларусь і Аўстрыя правядуць перагаворы па праекце пагаднення аб узаемнай дапамозе ў мытных справах

Прэзідэнт Беларусі адобрыў у якасці асновы для правядзення перагавораў праект міжурадавага пагаднення з Аўстрыяй аб супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе ў мытных справах. Адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 3 мая.

На правядзенне перагавораў па праекце пагаднення, дазволіўшы пры неабходнасці ўносіць у яго змяненні і дапаўненні, якія не маюць прынцыповага характару, упаўнаважаны старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Аляксандр Шпілеўскі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗВАРОТ

кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў да народаў дзяржаў — удзельніц Садружнасці і сусветнай грамадскасці ў сувязі з 65-й гадавінай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў

Народы дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў 9 мая 2010 года адзначаюць 65-ю гадавіну Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. У небывалай па напружанасці і жорсткасці вайне шматнацыянальны народ Савецкага Саюза і яго Узброеныя Сілы адстаялі свабоду і незалежнасць сваёй Айчыны, пазбавілі многія краіны свету ад фашысцкага заняволення.

На фронце і ў тыле нашы народы праявілі самаадданасць і масавы гераізм, патрыятызм і інтэрнацыяналізм, нябачаную стойкасць, без якіх перамога была б немагчымая. Такой стойкасці гісторыя не ведала. Не ведала яна і такой волі да перамогі.

З гадамі не меркне веліч подзвігу, здзейсненага нашымі народамі. Чым больш часу аддаляе нас ад гэтай падзеі, тым больш выразна ўсведамляецца значэнне гістарычнай місіі салдатаў Перамогі, якія адстаялі права на будучыню. Таму, звяртаючыся да народаў дзяржаў — удзельніц Садружнасці і сусветнай грамадскасці, мы гаворым сёння «дзякуй» ветэранам, якія жывуць у нашых дзяржавах. Мы заклікаем не толькі словам, але і справай аддаваць даніну павагі героям-пераможцам, праяўляць штодзённы клопат аб удзельніках вайны і працаўніках тылу, аказваць ім увагу і ствараць годныя ўмовы жыцця.

9 мая — Дзень Перамогі — застаецца для нашых людзей днём трыумфу справядлівасці, гонару і ўсенароднага смутку па мільёнах загінулых у гэтай бязмерна жорсткай і страшнай бітве. Для нас святыя і дарагія імёны тых, хто паў смерцю храбрых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мы ў неаплатным даўгу перад тымі, хто цаной свайго жыцця адстаяў Айчыну, а значыць — нашу свабоду.

Мы не забудзем гераізму салдатаў і працаўнікоў тылу, якія выратавалі свет ад фашызму. Таму мы заклікаем свята шанаваць памяць загінулых за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы, праяўляць пастаянны клопат аб захаванні і падтрыманні ў належным стане воінскіх пахаванняў, мемарыяльных комплексаў, помнікаў і абеліскаў, а таксама магіл партызанаў, падпольшчыкаў і вязняў фашысцкіх лагераў; актывізаваць пошук астанкаў воінаў і мірных грамадзян, якія палі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ад рук фашысцкіх захопнікаў.

Мы не дзелім Перамогу на сваю і чужую, заўсёды аддаём даніну мужнасці тых, хто аказаў супраціўленне нацызму. Мы памятаем пра ўнёсак нашых саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі ў Перамогу, іх дапамогу нам. Аднак найбольш маштабныя і, у канчатковым выніку, галоўныя падзеі адбываліся на савецка-германскім фронце. Нашы краіны страцілі за гады вайны дзясяткі мільёнаў грамадзян. Сярод загінулых на палях бітваў былі людзі ўсіх нацыянальнасцяў.

Улічваючы, што народы нашых дзяржаў зрабілі рашаючы ўнёсак у дасягненне Перамогі, мы заклікаем выхоўваць у падрастаючага пакалення пачуццё гонару за агульную гераічную гісторыю і вялікі подзвіг у барацьбе з фашызмам.

Пацвярджаючы сваю прыхільнасць агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права, палажэнням Статута ААН і Хельсінскага Заключнага акта, мы заклікаем да актыўнага ўзаемадзеяння ва ўмацаванні бяспекі і стабільнасці ў свеце, нарошчвання намаганняў у барацьбе з міжнародным тэрарызмам і экстрэмізмам, мірнага палітычнага ўрэгулявання існуючых і прадухілення магчымых канфліктаў.

ЖЫХАР ВЕРХНЯДЗВІНСКА ЗАДУШЫЎ СВАЮ БЫЛУЮ НАСТАЎНІЦУ

Позна ўначы 33-гадовы мужчына прыйшоў да дома састарэлай настаўніцы і стаў выпрошваць у яе грошы на спіртное. Жанчына адмовіла, упікнуўшы маладога чалавека ў дармаедстве. Маралі і натацыі 82-гадовай старой раззлавалі былога вучня. Ён схапіў яе за шыю і задушыў, а пасля, спрабуючы схаваць злачынства, падпаліў дом. У дачыненні да жыхара Верхнядзвінска заведзена крымінальная справа, якая прадугледжвае самае суровае пакаранне аж да пажыццёвага зняволення.

БЕЛТА.

КВАРТАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ

Антыкрызісная эканоміка

У Магілёўскай вобласці вынікі 1 квартала назвалі набліжэннем да нармальнай дакрызіснай працы

Аб'ёмы і склад

— Прамысловасць Магілёўскай вобласці ў асноўным адаптавалася да новых умоў гаспадарання, — лічыць **старшыня аблвыканкама Пётр РУДНІК.**

Доказ гэтай высновы — лічбы росту аб'ёмаў вытворчасці: амаль 115 % у параўнанні з леташнім першым кварталам, і амаль 109 % — у параўнанні з пачаткам дакрызіснага 2008 года. Аднак пра пераадоленне наступстваў крызісу пакуль казаць рана, мяркуе кіраўніцтва рэгіёна. Запасы гатовай прадукцыі на складах прадпрыемстваў засталіся на леташнім узроўні, а гэта болей за 550 мільярдаў рублёў.

Трэцяя частка гэтых запасаў належыць «Белшыне». Прычым, паводле паказчыкаў працы, тэмпы росту ў гэтага буйнога прадпрыемства застаюцца ранейшымі, а вось гатовая прадукцыя назапашваецца.

Праблемы ёсць і на Магілёўскім металургічным заводзе: там запасы складаюць больш за два месячныя аб'ёмы. Падае вытворчасць і рэалізацыя на Клімавіцкім лікёра-гарэлачным заводзе, які з'яўляецца самым буйным падаткаплацельшчыкам у бюджэт вобласці.

Заробак

У Магілёўскай вобласці скарацілася колькасць прадпрыемстваў і арганізацый, дзе сярэдні заробак працаўнікоў ніжэй за 200 долараў. Калі ў студзені іх было 368, то ў сакавіку — ужо 160. У ліку малааплатных — найперш сельскія гаспадаркі, бюджэтныя ўстановы, некалькі гандлёвых арганізацый і нават 9 прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі.

Пётр Руднік назваў бабруйскае прадпрыемства «ФанДОК», дзе працуе 2300 чалавек, а сярэдні заробак складае 186 долараў. Верагодна, што некаторыя прыватныя прадпрыемствы, дзе сярэдні заробак не дацягвае да мінімальных 200 долараў, праверваць кампетэнтныя органы.

У Бабруйску найбольшая колькасць малааплатных устаноў — дзіцячыя садкі. Мяркуецца, што для павелічэння даходаў іх супрацоўнікам давядзецца заняцца аказаннем платных паслуг: напрыклад, арганізацыя групы падоўжанага і выхаднога дня, за якія гатовыя плаціць бацькі выхаванцаў.

Калі ўдасца зусім пераадолець 200-доларавы ўзровень, то ўлады маюць намер шчыльна працаваць з прадпрыемствамі і ўстановамі, дзе плацяць у сярэднім ніжэй за 300 долараў.

— Павелічэнне заробку павінна стаць для кіраўнікоў усіх узроўняў пытаннем № 1, — заявіў кіраўнік вобласці. Сярэдні заробак у Магілёўскай вобласці за першыя тры месяцы склаў 906 тысяч рублёў. Яна павялічылася намінальна і рэальна, але ўсё ж пакуль недастаткова, каб спакойна выйсці на канец года на запланаваныя 444 долары.

Інвестыцыі

Да канца года ў Магілёўскай вобласці не павінна застацца стратных прадпрыемстваў. Рух у гэты бок сапраўды ёсць: калі ў студзені іх было 107, то па выніках 1 квартала — 84, а гэта толькі 8 % ад агульнай колькасці.

Інвестыцыі нездарма называюць самым актуальным паказчыкам. Таму што без тэхнічнага перавобраення пра канкурэнтаздольную прадукцыю, па якасці і па кошце, і казаць не выпадае. Сёлета інвестыцыі павінны павялічыцца на чвэрць у параўнанні з леташнімі.

Напрыклад, прадпрыемствы, якія вядуць перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі, павінны задумацца аб глыбіні перапрацоўкі. Напрыклад, у вядомай еўрапейскай фірмы кілаграм гатовага малочнага прадукту каштуе ў 10 разоў больш, чым кілаграм малака. На нашых малочных камбінатах суадносіны кошту сыравіны і прадукцыі складаюць толькі 1:2.

Праўда, цяпер малочныя і мясныя прадпрыемствы Магілёўскай вобласці больш заклапочаныя недахопам сыравіны для загрузкі магутнасцяў і збытам сваёй прадукцыі. Настолькі, што на пасяджэнні аблвыканкама зайшла размова пра строгі дзяржаўны заказ.

Экспарт і імпарт

Пятра Рудніка непакоіць, што некаторыя пазіцыі па імпарце не скарачаюцца, а нават павялічваюцца. Напрыклад, у пачатку года на 65 % павялічыўся імпарт макароны, на 34 % — кандытарскіх вырабаў і на 37 % — пшанічнай мукі. За два месяцы на гэтыя харчы з-за мяжы было выдаткавана 740 тысяч долараў.

Сёлета ў Магілёўскую вобласць увезлі сметанковае масла амаль у 500 тысяч долараў: летась такой пазіцыі імпарту нават не было. Траціна будаўнічых матэрыялаў, якія прадаюцца ў рэгіёне, завезены з-за мяжы. Кіраўнік вобласці адзначыў: размова ідзе не проста пра расход валюты, але пра тое, што нашы прадпрыемствы прайграюць канкурэнтам па якасці і цане.

— Каб сальда было ў парадку, рэцэпт просты: трэба выраблiць і прадаць на 1 долар і 20 цэнтаў, а набыць толькі на 1 долар, — нагадаў Пётр Руднік.

Увогуле, нягледзячы на жорсткую размову аб праблемах, Магілёўскі аблвыканкам адзначае, што кволая станоўчая тэндэнцыя, якая намецілася напрыканцы мінулага года, замацоўваецца. Галоўная мэта гэтага руху — паляпшэнне якасці жыцця людзей.

Ілона ІВАНОВА.

БЕЗЫНІЦЫЯТЫЎНАСЦЬ ПЕРАШКАДЖАЕ СТРАХАВОМУ БІЗНЭСУ...

Ва Урадзе

Асаблівасцю мінулага года на рынку страхавых паслуг з'яўлялася тое, што страхаванне стала больш даступным з-за зніжэння тарыфаў, а доля добраахвотнага страхавання расла. Разам з тым, падводзячы вынікі рэалізацыі Рэспубліканскай праграмы развіцця страхавой дзейнасці ў рэспубліцы на 2006—2010 гады на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, першы намеснік міністра фінансаў Уладзімір Амарын заўважыў, што доля страхавых паслуг у валавым унутраным прадукце застаецца нізкай — усяго 0,81 працэнта, летась арганізацыям не ўдалося дасягнуць мэтавага арыенціра ў 1,2 працэнта ВУП, устаноўленага праграмай. Сёлета ж, паводле прагнозу Мінфіна, ёсць магчымасць павялічыць гэтую долю да 1 працэнта ВУП.

З апошнім прагнозам не пагадзіўся прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, які запатрабаваў забяспечыць у гэтым годзе збор страхавых прэмій як мінімум на ўзроўні 1,32 працэнта ВУП. Між іншым, у адпаведнасці з праграмай развіцця страхавой дзейнасці, намечаны да збору сёлета аб'ём страхавых прэмій сапраўды перавышае вышэйзгаданы прагноз міністэрства. У сувязі з гэтым прэм'ер заўважыў наступнае: «праграму намецілі, а самі яе не выконваеце». Працягваючы гаворку пра даведзеныя праграмай параметры, прэм'ер таксама падкрэсліў, што павелічэнне паказчыка забяспечыць за год прырост узносаў да 700 мільярдаў рублёў.

Дарэчы, сярод прычын, якія з'яўляюцца своеасаблівым тормазам па выкананні ў поўным аб'ёме намечанага задання, Уладзімір Амарын згадаў і адносіны шэрагу кіраўнікоў страхавых арганізацый да мэтавых арыенціраў праграмы. «Мы пастаянна чуем ад іх пра немагчымасць прыросту ва ўзносах па прычынах слабага фінансавага становішча прадпрыемстваў і невысокіх даходаў насельніцтва, — адзначыў ён. — Як вынік, безынiцыятыўнасць і стандартныя падыходы да працы». Так, за дзесяць месяцаў мінулага года тэмп росту страхавых узносаў складаў толькі 117 працэнтаў. Мінфін у такой сітуацыі быў вымушаны кардынальна змяніць падыходы да арганізацыі кантролю і патрабаванняў да вынікаў працы і ўвёў штотыднёвы кантроль за выкананнем даведзеных заданняў. Гэтыя захады далі плён, бо на рынку адбыліся заўважныя змены. У прыватнасці, у лістападзе-снежні шэраг страхоўшчыкаў спрацавалі з тэмпамі росту ўжо 140—160 працэнтаў, а па добраахвотных відах страхавання паказчык наогул даходзіў да 170—180 працэнтаў. Напрыклад, «Белэксімгарант» летась падвоіў аб'ёмы экспартнага страхавання.

На думку Уладзіміра Амарына, гэта сведчыць пра тое, што патэнцыял як у рынку, так і ў страхавых арганізацый ёсць. Разам з тым, сёлета большасць страхоўшчыкаў пакуль не спраўляецца з зададзенымі на год тэмпамі росту ў 175 працэнтаў да 2009 года. І тут, лічыць першы намеснік міністра фінансаў, шмат залежыць ад кіраўнікоў арганізацый і іх каманды. «Летась, — кажа ён, — было заменена кіраўніцтва Беларускай нацыянальнай перастраховачнай арганізацыі і «Белэксімгаранта». Гэта дакладна пайшло на карысць арганізацыям. У гэтым годзе адбудзецца змена кіраўнікоў у «Стравіце» і «Прамтрансінвесце». Мяркуем, і тут павінны быць паляпшэнні». Акрамя таго, каб зняць праблему інертнасці тых жа кіраўнікоў раённых падначаленых дзяржаўных страхавых арганізацый, якія, між іншым, атрымліваюць далёка не апошнюю па ўзроўні зарплату, Мінфінам былі перазаключаны з імі кантракты тэрмінам на 1 год, а сістэма іх прэміравання была пастаўлена ў прамую залежнасць ад выканання бізнэс-планаў.

Працягваючы тэму развіцця страхавога рынку, Уладзімір Амарын падкрэсліў, што перспектыўным будзе павышэнне яго прывабнасці для замежных інвестараў. Гэта дазволіць прыцягнуць у страхавы бізнэс дадатковыя рэсурсы. «У гэтым годзе, — заўважыў ён, — нам больш актыўна трэба працаваць над павышэннем канкурэнтаздольнасці і інвестыцыйнай прывабнасці страхавога рынку». Для гэтага Мінфінам будзе прапанавана абмеркаваць змены ў заканадаўстве, якія даюць роўныя магчымасці страхоўшчыкам усіх формаў уласнасці, у тым ліку створаных з удзелам замежнага капіталу. Міністэрства ўжо падрыхтавала прапановы аб прадстаўленні магчымасці страхоўшчыкам з удзелам замежнага капіталу ажыццяўляць страхаванне жыцця, спрашчэнні парадку ўзгаднення правілаў страхавання, а таксама прадстаўленні страхоўшчыкам права адносіць страхавыя ўзносы на сабекошт без залежнасці ад формы ўласнасці.

Таксама перад страхавымі арганізацыямі пастаўлена задача інтэнсіўна развіваць рэгіянальныя сеткі, таму што адной з асноўных прычын недастатковага развіцця страхавання з'яўляецца значнае адставанне ў ахопліванні страхавымі паслугамі гарадоў і раёнаў краіны ў параўнанні з дынамікай іх сацыяльна-эканамічнага развіцця. Да таго ж сёлета будзе працягнута апераджальнае развіццё добраахвотных відаў страхавання ў параўнанні з абавязковым. Асаблівая ўвага будзе надавацца развіццю страхавых арганізацый, якія ажыццяўляюць страхаванне жыцця і дадатковай пенсіі. Напрыклад, «Стравіце» неабходна будзе ахапіць страхаваннем жыцця ўсе рэгіёны рэспублікі і павялічыць збор прэміі не менш як у два разы. Рэалізаваўшы гэтыя і шэраг іншых захадаў, упэўнены ў Мінфіне, удасца змяніць да лепшага як якасныя характарыстыкі страхавога рынку, так і аб'ёмныя паказчыкі яго працы.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

85- І 86-ГАДОВЫЯ ПЕНСІЯНЕРЫ СТАЛІ АХВЯРАМІ МАХЛЯРАК

Старыя пусцілі да сябе невядомых жанчын, якія прадстаўляліся сацыяльнымі работнікамі і пацярпелі з-за залішняй даверлівасці.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, пацярпелі пенсіянер і пенсіянерка, якія жывуць у Кастрычніцкім раёне сталіцы. Так, да 85-гадовай мінчанкі, якая жыве на вуліцы Асаналіева, забрылі дзве невядомыя, якія пад выглядам сацыяльных работнікаў трапілі ў кватэру пацярпелай і забралі адтуль 100 тысяч рублёў. А вось 86-гадоваму пенсіянеру з вуліцы Каржанеўскага падобныя байкі, каб пранікнуць у жыллё, «наспявала» нахабніца, якая «працавала» адна: у гэтым выпадку здабычай зламысніцы сталі 800 тысяч рублёў. Між іншым, за тры месяцы гэтага года ў Мінску зафіксавана ўжо 9 такіх злачынстваў, ахвярамі якіх сталі пажылыя людзі. Улічваючы, што крадзяжы пад выглядам сацыяльных работнікаў, а таксама лжэ-работнікаў Мінгаза і ЖЭСа застаюцца актуальнымі, у ГУУС у чарговы раз нагадваюць пра элементарныя меры перасцярогі. Па-першае, не трэба адчыняць дзверы незнаёмым, нават калі яны прадстаўляюцца вышэйзгаданымі работнікамі: як правіла, пенсіянеры ведаюць у твар сацработнікаў ці паштальёнаў, якія іх абслугоўваць, а ў іншых службовых асобаў павінны быць дакументы, што пацвярджаюць іх прыналежнасць да той ці іншай установы. А па-другое, зусім нялішнім будзе патэлефанаваць і праверыць, ці існуе такі супрацоўнік у згаданай арганізацыі.

Між іншым, праваахоўнікі ўжо неаднаразова выкрывалі арганізаваныя групы, якія спецыялізаваліся на злачынствах у адносінах да пенсіянераў. Прычым, адзначаюць у ГУУС, у большасці выпадкаў фігуравалі іншагароднія жанчыны цыганскай нацыянальнасці, некаторыя з якіх да гэтага часу вышукваюцца.

Ігар ГРЫШЫН.

У СВЯТЛЕ ПЕРАМОГІ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Фота Марыны БЕРУНКОВАЙ.

Усевалад Янчэўскі таксама падкрэсліў, што ў Беларусі ніколі не будзе месца фальсіфікацыі вынікаў вайны.

Пісьменнік, ветэран Вялікай Айчыннай Алесь Ануфрыевіч Савіцкі падчас вайны супрацоўнічаў з Ветрынскай падпольнай газетай на Віцебшчыне, друкаваўся ў рукапісных партызанскіх газетах і часопісах, пасля прайшоў вайну нялёгкімі франтавымі дарогамі. Ён вельмі пранікнёна расказаў пра ролю друкаванага слова для тых, хто змагаўся за свабоду Бацькаўшчыны. Вельмі важная яна і сёння, калі хто-ніхто спрабуе пераасэнсаваць ваенныя падзеі і іх значэнне. З цёплынёю адазваўся ветэран пра кнігу нашай былой супрацоўніцы Таццяны Падаляк «Нашчадкі вогненных вёсак» — там усё праўда, сказаў ён, якая патрэбная людзям.

Для «Звязды» гэта сапраўды невыпадкова — прафесійны Дзень Друку напярэдадні Дня Перамогі. У тую, апошнюю, вайну газета ваявала, яна натхняла, давала сілы, заклікала да барацьбы. Яе з'яўленне ў маі 1942 года ў акупаваным Мінску было падобна да выбуху бомбы. Яе перадавалі з рук у рукі, рызыкавалі жыццямі і гінулі дзеля таго, каб іншыя маглі гэта ўбачыць: вось яна, газета «Звязда» — сімвал непераможнасці сыноў гэтай зямлі. Таму, напэўна, цалкам лагічна і натуральна, што стэнд «Звязды» на выставе «СМІ ў Беларусі 2010» быў прысвечаны 65-годдзю Вялікай Перамогі. І атрымаўся ён дзякуючы гэтаму, як заўсёды, вельмі арыгінальным, адметным, і, разам з тым, цёплым. А самае галоўнае, што ён дэманструе жывую сувязь пакаленняў і часоў.

Вядома, так атрымалася дзякуючы тым, хто газету любіць і чытае. Дзякуючы тым, хто прыйшоў яе павітаць, дзякуючы тым, для каго яна выходзіць. Гасцямі звяздоўскага стэнда былі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны **Марыя Міраноўская, Мальвіна Мельнічэнка, Марыя Зарубіна, Марыя Перавозчыкава, Пётр Паваротны, Марыя Шчэрбіна. Прыйшоў павітаць наш стэнд Барыс Александровіч,** бацька якога Хасан Александровіч летам і восенню 1942 года друкаваў у Мінску нумары падпольнай «Звязды».

Дзіцячы вакальна-інструментальны ансамбль «Буслік» завёў публіку, педагогі і вучні мінскай гімназіі № 25, з якой «Звязда» сябруе не першы год, наладзілі прэзентацыю хроніка-дакументальнага фільма **«І помніць свет урataваны...»** і сайта з аднайменнай назвай.

— Калісьці мы сталі вывучаць даваенную гісторыю нашай гімназіі, — тлумачыць інтарэс гімназістаў да газеты **настаўніца беларускай мовы і літаратуры Аліна Пахвалёная.** — І высветлілі, што настаўнік фізкультуры Вольф Данцыг, бацька народнага мастака Беларусі Мая Данцыга, выдаваў «Звязду» ў 1917 годзе, а вучні гімназіі Анатоль Ляўкоў і Міхаіл Каржанеўскі распаўсюджвалі газету ў горадзе і за яго межамі. Наша гімназія носіць імя Рымы Шаршнёвай, мы здаўна падтрымлівалі сувязь з яе сваякамі, і калі нам дастаўся яе архіў, мы знайшлі ў ім першы нумар падпольнай «Звязды». Аказалася, што Рыма таксама распаўсюджвала газету. З таго часу, як мы пра ўсё гэта даведаліся (а гэта супала з 90-гадовым юбілеем «Звязды»), мы сталі неразлучныя з выданнем. Прысвячаем нашай агульнай гісторыі навуковыя працы, ездзім разам у экспедыцыі, вось удзельнічаем у выставах.

Дзесяцікласнікі Мінскай гімназіі № 25 падчас прэзентацыі «Звязды» паказалі харэаграфічную кампазіцыю і спектакль, складзены па ўспамінах ваенных медыкаў, гімназічны музей паказаў частку сваёй экспазіцыі: патэфон, шынель, посуд часоў вайны... Усё гэта арганічна спалучылася з партызанскімі лістоўкамі, макетам зямлянкі з вострава Зыслаў, у якой выдавалася «Звязда» ўжо на тэрыторыі партызанскага атрада, з салдацкай кашай і салам, якімі маглі пачаставацца ўсе ахвотныя, і, вядома, з трафейным матацыклам Zundar, на якім фатаграфаваліся ўсе, хто не мог прайсці міма звяздоўскага стэнда.

А міма не мог прайсці ніхто. Адных толькі георгіеўскіх стужачак журналісты «Звязды» і валанцёры з журфака раздалі больш за 1000. Да нас заходзілі самыя прыгожыя дзяўчаты — Міс Беларусь і Віцэ-міс Беларусь, нашы пастаянныя аўтары — пісьменнікі Уладзімір Ліпскі і Уладзімір Содаль, прадстаўнікі беларускай дыяспары з Латвіі, калегі з іншых выданняў, генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Юрый Комар... Да «Звязды» ішлі тыя, для каго яна працуе — людзі, простыя працаўнікі, з якімі яна была і будзе! — спадзяёмся, заўсёды.

...Праз тры гадзіны каша ўжо была з'едзеная, прызы раздадзеныя, але свята толькі пачыналася. Гэта было бачна па тварах удзельнікаў і гасцей выставы, па тварах мінакоў на вуліцы, па вачах ветэранаў, якія, трошкі стомленыя, але ўдзячныя і натхнёныя раскрывалі парасоны і ўдыхалі водар квітнеючых на вуліцах Мінска дрэў. Мы дыхалі вясновым паветрам разам: «Звязда» жыве, жыве для людзей. Для праўды. Болей нам не патрэбна.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Абзац

◢ **У выхадныя дні прайшла грамадская акцыя па зарыбленні Заслаўскага вадасховішча. За сродкі рыбаловаў-аматараў у рыбаводчай гаспадарцы «Трэмля» закуплена 766 кг шчупака-гадзіка, якога выпусцілі ў вадаём.**

◢ Пракуратура Івацэвіцкага раёна праводзіць праверку па факце смерці навучэнца першага курса Івацэвіцкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці на ўроку фізкультуры, перадае БЕЛТА. Трагічны выпадак адбыўся 3 мая. 17-гадовы юнак прабег дыстанцыю на ўроку фізкультуры, пасля гэтага падышоў да настаўніка, каб даведацца пра вынік, пасля гэтага адышоў убок і нечакана ўпаў. Медыкі канстатавалі смерць. Вядома, што юнак не стаяў на дыспансэрным уліку, якіх-небудзь абмежаванняў па занятках фізкультурай для яго ўстаноўлена не было.

◢ **Мінчанін спрабаваў застрэліць свайго пасынка з пнеўматычнага пісталета. Айчым злоўжываў спіртным. Падчас спрэчкі ён пачаў скандаліць з маці пацярпелага. Пасынак выбег на вуліцу, а айчым тройчы стрэліў яму ў галаву. Пацярпелы дастаўлены ў бальніцу.**

◢ У Магілёўскай вобласці мужчына на гужавой павозцы ўрэзаўся ў цягнік. Сутыкненне адбылося 2 мая на пераездзе, які на ахоўваецца. Мясцовы жыхар на гужавой павозцы выехаў на чыгуначныя пуці на забараняльны сігнал. У выніку павозка сутыкнулася з апошнім вагонам грузавога цягніка. Мужчына атрымаў чэрапна-мазгавую траўму, удар пазваночніка, пералом нагі і трапіў у бальніцу. Вядзецца праверка.

◢ **Трэцяга мая ўначы ў вёсцы Дубейкава Мсціслаўскага раёна здарыўся пажар. Выратавальнікі, якія прыбылі на месца, убачылі, як гарыць адкрытым агнём дах жылога дома. У пажары загінула 27-гадовая жонка гаспадара. Мяркуецца, што прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні.**

Поўны абзац

◢ **Даходы тэгеранскіх жабракоў у пяць разоў перавышаюць пражытковы мінімум, што ўстаноўлены ў краіне. У сталіцы Ірана ім удаецца зарабіць да 15 млн рыялаў у месяц (каля 1500 долараў), у той час як мінімальная заработная плата ў краіне складае 3 млн рыялаў (прыкладна 300 долараў). Штодзень іранскія ўлады разганяюць па 300 жабракоў з цэнтральных вуліц сталіцы краіны. Для частковага вырашэння праблемы планаецца пабудаваць спецыяльныя прытулкі, па якіх жабракоў будуць развозіць увечары.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Хакей

НА ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ НЕ ЕДУЦЬ АЛЕГ АНТОНЕНКА І СЯРГЕЙ ЗАДЗЯЛЁНАЎ

Прыезд братоў Касціцыных таксама пад пытаннем

Сёння нацыянальная зборная Беларусі па хакеі адпраўляецца на чэмпіянат свету, а трэнерскі штаб нарэшце вызначыўся з канчатковым складам. Капітанам нашай каманды будзе вопытны абаронца Руслан Салей. У складзе адсутнічае нападаючы Алег Антоненка, які не раз выручаў каманду і закідваў важныя шайбы на чэмпіянатах. Глен Хэнлан за гэтую асаблівасць называў хакеіста «снайперам на даху», і вось у нядаўніх спарынгах з латвійскай зборнай адзінаю шайбу беларусаў закінуў менавіта Антоненка. Галоўны трэнер Эдуард Занкавец растлумачыў, што Алег на чэмпіянат не едзе толькі з-за траўмы. Гэта прыкрая выпадковасць, і Эдуард Занкавец не выключае, што Антоненка яшчэ працягне кар'еру ў зборнай, нягледзячы на тое, што летам хакеісту споўніцца 39 гадоў.

Няма ў складзе і Сяргея Задзялёнава, у якога таксама траўма. Замест іх у каманду тэрмінова былі выкліканыя Арцём Сенкевіч і Міхаіл Стэфановіч. Поўны спіс хакеістаў выглядае наступным чынам: варатары — Мезін, Коваль, Шабанаў; абаронцы — Салей — Колясаў, Макрыцкі — Дзянісаў, Стасенка — Касцючонак, Гатавец — Радзінскі; нападаючыя — Калюжны — Грабоўскі — Угараў, Мялешка — Стась — Дзямагін, Чупрыс — Міхалёў — Стэфановіч, Захараў — Кавыршын — Кулакоў, Сенкевіч.

Як патлумачыў галоўны трэнер, браты Андрэй і Сяргей Касціцыны могуць далучыцца да каманды ў любы момант — «Манрэаль» выйграў у «Пітсбурга» другі матч серыі Кубка Стэнлі, і відавочна, што супрацьстаянне можа зацягнуцца. Эдуард Занкавец захоўвае для іх месцы ў камандзе і не хавае спадзяванняў на іх прыезд. Запрашэнне моладзі ў зборную, у прыватнасці Кірыла Гатаўца, Эдуард Занкавец пракаментаваў, як працу на будучыню. Прычым ён адзначыў, што ў апошнія гады такога гульца, як Гатавец, у лініі абароны не было. У той жа час капітан каманды Руслан Салей зусім не супраць з'яўлення маладых хакеістаў: «Я гуляю з тымі, каго мне дасць трэнер. Калі гэта будзе Гатавец, буду ставіцца з такім жа энтузіязмам, як калі б гэта быў, скажам, Алег Хмыль».

Гэты чэмпіянат свету стане дэбютным не толькі для Эдуарда Занкаўца ў якасці галоўнага трэнера, але і для яго асістэнтаў. Першым матчам, які правядзе наша зборная, будзе гульня супраць казахаў. Менавіта яе Эдуард Занкавец і лічыць самай складанай. «У псіхалагічным плане першы матч заўсёды самы складаны. Да таго ж зборная Казахстана рыхтавалася да чэмпіянату свету надзвычай сур'ёзна. Яе гульцы — аснова каманды, якая выступае ў КХЛ», — патлумачыў трэнер.

Руслан Салей выказаў меркаванне, што частая змена трэнера не ідзе зборнай на карысць. Але заклік аднесіцца да гэтага з разуменнем, а не апраўдваць такім чынам няўдачы. «Мне заўсёды камфортна ў зборнай. Які б трэнер не быў, я стаўлюся спакойна і імкнуся знайсці агульную мову з любым чалавекам, з якім працую. У любым выпадку мы гуляем не за трэнера, а за краіну», — расказаў капітан нашай каманды.

Задача, якая стаіць перад камандай, — трапіць на чэмпіянаце свету ў васьмёрку наймацнейшых. У адрозненне ад Міхаіла Захарава, які аддаваў перавагу гульні ў адкат, Эдуард Занкавец прыхільнік больш агрэсіўнага хакея, праўда, з дысцыплінай у абароне. «Мы зробім акцэнт на тое, што добрая абарона — залог паспяховай атакі. Уся пяцёрка павінна арганізавана і агрэсіўна дзейнічаць у абароне з добрым пераходам у атаку». Як удасца нашай камандзе рэалізаваць гэтыя пастулаты, мы пабачым у хуткім часе. Ужо 6 мая наша каманда правядзе ў Празе апошні перад чэмпіянатам спарынг з чэхамі, а 9 мая пройдзе першая гульня чэмпіянату супраць зборнай Казахстана. Акрамя гэтага, нашымі супернікамі на групавым этапе будуць каманды Расіі і Славакіі. Апошняй, як вядома, кіруе Глен Хэнлан.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ АУКЦИОНЕ

по продаже в процессе приватизации находящегося в республиканской собственности и хозяйственном ведении могилевского республиканского предприятия «Могилевэнерго» предприятия как имущественного комплекса (филиал Бобруйский завод древесноволокнистых плит)

5
МАЯ
2010 г.
СЕРАДА
№ 17 (15620)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Школа юнкараў

ЛЕПШ НА «ТРАСЯНЦЫ», ЧЫМ НА РОДНАЙ МОВЕ, РАЗМАЎЛЯЦЬ?..

У маім артыкуле не будзе доўгіх і сумных разважанняў на тэму прыгажосці і непаўторнасці нашай беларускай мовы. Пра гэта кожны ведае, у школах пра гэта гавораць амаль што на кожным уроку літаратуры. А вынікаў амаль аніякіх: як размаўлялі вучні на «трасянцы», так і працягваюць гэта рабіць.

Аднойчы я вырашыла размаўляць па-беларуску. Трэба сказаць, што першы дзень быў асабліва цяжкім. І не толькі таму, што на мяне пазіралі, як на нейкую дзівачку (вось вам і беларусы), а яшчэ і таму, што, да майго сораму, я не ведала ўсіх слоў, каб паўнацэнна гаварыць на беларускай мове. Напрыканцы дня шок і здзіўленне аднакласнікаў змяніўся разуменнем. Некаторыя вучні нават захацелі разам са мною размаўляць па-беларуску. Было прыемна.

На наступны дзень я прыйшла ў школу са слоўнікам, чым яшчэ больш здзівіла вучняў свайго класа. Але ў гэты дзень ніхто не захацеў мяне падтрымаць, і я гаварыла па-беларуску адна. Многія нават прасілі, каб я размаўляла «як звычайна». Сказаць папраўдзе, было крыўдна. Вядома, на жаль, я не магу гаварыць на чыстай літаратурнай мове, але навакольныя глядзелі на мяне так, нібы я кажу нейкую брыдоту. Не слухаючы нікога, я працягвала свой эксперымент і ўсё яшчэ спрабавала зразумець, чаму нават у глыбінцы я назіраю такое адмоўе нацыянальнай мовы.

У трэці дзень майго маленькага даследавання аднакласнікі ўжо пачалі казаць, што я размаўляю на роднай мове з якімсьці падтэкстам: ці то пасварылася з некім, ці то хачу вылучыцца. Некаторыя нават злаваліся. Але выкладчыкі гімназіі падтрымалі мае пачынанні: яны ўсміхаліся мне і спрабавалі таксама размаўляць па-беларуску, адзначаючы, што чуць мову на нефармальным узроўні вельмі незвычайна.

Уражанні ад маленькага «эксперымента» розныя. Па-першае, мне вельмі спадабалася размаўляць на роднай мове. Адчувала сябе ў сваёй стыхіі, толькі веды яшчэ трэба падцягнуць. Па-другое, упэўнілася ў тым, што гімназісты не саромеюцца размаўляць на роднай мове, яны проста не хочуць гэтага рабіць. Некаторыя, безумоўна, падыходзілі да мяне і пыталі, ці не саромеюся я размаўляць па-беларуску, на мяне ж глядзяць усе вучні. Мае назіранні зайшлі глыбей. Заўважыла, што вучні нават на уроках беларускай мовы не ведаюць значэння ўсіх слоў, якія там ужываюцца. Але пры гэтым і рускамоўнымі іх не назавеш: гавораць яны больш на «трасянцы». А яшчэ я прыйшла да высновы, што такія «эксперыменты» трэба праводзіць. Нават для самога сябе. Калі не атрымліваецца ўвесь час размаўляць па-беларуску, вылучыце пару дзён на тыдні, напрыклад. Гэта патрэбна менавіта для таго, каб адчуваць сябе сапраўдным беларусам. Вось пагаварыла я тры дні ўсяго на роднай мове, а ўжо і думаць пачала на ёй таксама. І што б ні казалі, а ўспрыманне навакольнага свету таксама іншае. Усё крыху іншае.

Не ведаю, хто кім хоча быць ці проста здавацца, але мне падабаецца Беларусь і ўсё, што з ёй звязана. Беларуская мова — нібы наш з вамі сцяг, які вядзе нас у будучыню. Калі мы яго згубім, будзем сляпымі, і ніякія акуляры нам не дапамогуць. Шануйце родную беларускую мову. Яна вам спадабаецца, толькі паспрабуйце бліжэй падысці да яе.

Марыя БАЗУЛЬКА.

НАВЫПЕРАДКІ ДАДОМУ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маладыя матулі з гарадскога пасёлка Езярышча Гарадоцкага раёна Святлана ІВАНОВА і Аксана ЖАЛТОЎСКАЯ на прагулцы са сваімі гадаванцамі Валерыяй і Ягорам.

НАВОШТА НАМ «ЗЯЛЁНЫЯ» ШКОЛЫ?

Павышэнню экалагічнай інфармаванасці моладзі праз усталяванне і развіццё «зялёных» школ у нашай краіне была прысвечана прэзентацыя аднайменнага сумеснага праекта Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН. Яго грунтоўнае абмеркаванне адбылося ў Бярэзінскім дзяржаўным біясферным запаведніку. Згодна з міжнароднымі правіламі, нацыянальным выканаўчым агенцтвам праекта было абрана Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі. Мэта сустрэчы — даць магчымасць зацікаўленым бакам дамовіцца аб спосабах рэалізацыі праекта.

Што гэта за школы такія і навошта яны патрэбны нашай моладзі? На гэта пытанне даў грунтоўны адказ тэматычны каардынатар праекта Аляксандр Вінчэўскі. Галоўная іх мэта — выхаванне ў падрастаючых пакаленняў ашчадных адносінаў да маці-прыроды ці, як сёння кажуць экалагі, экалагічна правільных паводзінаў юнакоў і дзяўчат. Задача, скажам прама, зусім не новая. Колькі пра гэта было сказана і напісана за папярэднія дзесяцігоддзі. Але тут многае залежыць ад спосабаў і метадаў дасягнення пастаўленай мэты. Калі зыходзіць з замежнага досведу, у прыватнасці, еўрапейскага, то з перанясеннем на беларускую глебу канцэпцыі арганізацыі дзейнасці «зялёных» школ можа гаварыць пра ўкараненне новых падыходаў у экалагічнай асвеце. Што, як чакаецца, прынясе вялікую карысць і ў павышэнні экалагічнай дасведчанасці, і ў матывацыі саміх настаўнікаў. Для іх будуць наладжаныя спецыяльныя трэнінгі, у тым ліку і ў Бярэзінскім біясферным запаведніку. А для самых актыўных і заўзятых ўдзельнікаў праекта будзе арганізаваная паездка ў Вялікабрытанію з мэтай знаёмства з дзейнасцю «зялёных» школ, іх экалагічных цэнтраў. У Еўропе яны лічацца самымі «прасунутымі».

Таму зразумела, чаму для ўдзелу ў распрацоўцы канцэпцыі нашых «зялёных» школ запрасілі Бары Купера, вядомага спецыяліста па міжнароднай экалагічнай адукацыі Каралеўскага таварыства абароны птушак (RSPB) з Вялікабрытаніі. Ён уважліва слухаў усе аргументы, меркаванні, прапановы і выказаў свой пункт погляду на пытанне, якое абмяркоўвалася. Але спачатку ён палічыў неабходным выказацца наконт месца гэтай сустрэчы. Тут яму аднойчы пашчасціла пабываць, і ён літаральна ўлюбіўся ў першароднае асяроддзе запаведніка. На яго думку, гэта фантастычнае месца, дзе захавалася сапраўды дзікая прырода Беларусі. І трэба, каб як мага больш людзей даведаліся пра яго. Ды і Мінск, адхіляючыся трохі ад тэмы, англічанін ухваліў, сказаў, што гэта адзін з самых зялёных гарадоў, у якіх яму даводзілася бываць. Зеляніна пачынаецца адразу на вуліцы, не хаваў ён свайго здзіўлення.

Што датычыць стварэння «зялёных» школ у Беларусі, то Бары Купер лічыць правільным, што ў яе канцэпцыю ўключана ўсё лепшае з досведу падобных еўрапейскіх школ. У выніку беларуская канцэпцыя атрымалася сучаснай і ўдала прыстасаванай да асаблівасяў нашай краіны. Згодна з канцэпцыяй мяркуецца не чытаць вучням лекцыі аб прыродзе, а вывозіць іх на прыроду. Найбольш актыўных дзяцей і школьнікаў маральна і матэрыяльна заахвочваць за ахову прыроды. Напрыклад, узнагароджваць залатым, сярэбраным і бронзавым медалямі ў адпаведнасці з унёскам у экалагічную справу. Варта таксама заахвочваць спробы моладзі весці самастойна навуковыя назіранні і даследаванні на прыродзе, аналізаваць іх вынікі. З гэтай нагоды Бары Купер даў некалькі практычных парад і рэкамендацый з уласнага досведу.

У прынцыпе, кожная айчынная адукацыйная школа можа істотна «пазелянець». Прадугледжваецца вызначыць тры ўзроўні «зялёных» школ. У залежнасці ад іх агульнай экалагічнай прасунутасці і падрыхтаванасці і ўдзелу ў адпаведным інфармаванні тамтэйшай моладзі. Зразумела, спачатку мяркуецца надаць увагу школам, якія знаходзяцца на тэрыторыі зон, што асабліва ахоўваюцца (запаведнікаў, заказнікаў, нацыянальных паркаў), ці побач з імі. Гэта лагічна. І таму такім школам будзе аказана метадычная, арганізацыйная і іншая дапамога. Напрыклад, у арганізацыі назіральных пунктаў за станам дзікай прыроды, падрыхтоўцы інфармацыйных матэрыялаў і дапаможнікаў для настаўнікаў і вучняў.

Месца гэтай сустрэчы было выбрана невыпадкова. У запаведніку, а дакладней, у яго штаб-кватэры ў вёсцы Домжарыцы Лепельскага раёна, ёсць усе ўмовы для правядзення міжнародных канферэнцый, семінараў, «круглых сталоў», іншых мерапрыемстваў. Таму ў рамках праекта ў Доме экалагічнай асветы Бярэзінскага запаведніка плануецца пераабсталяваць некалькі пакояў пад так званы візіт-цэнтр для знаёмства наведвальнікаў з досведам дзейнасці «зялёных» школ. А на тэрыторыі запаведніка «пракласці» дзве экалагічныя сцежкі, якія будуць несці экалагічна-адукацыйную нагрузку без страт для навакольнага асяроддзя. Мяркуецца, што сюды будуць прыязджаць дзеці і вучні з усёй нашай краіны, а магчыма, і блізкага замежжа. Гэтаму можа і павінна спрыяць удалае геаграфічнае знаходжанне запаведніка ў цэнтры Беларусі.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Лепельскі раён.

Запрашальнік

ГУЛЬНІ ДЗЕЛЯ РОЗУМУ

МАЗГАВЫМ ШТУРМАМ МОЖНА АДОЛЕЦЬ БЕЛАРУСКУЮ ГІСТОРЫЮ,

упэўнены ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Вывучаць гісторыю па падручніку — гэта адно. Але яе можна адчуць: праз інтэлектуальную гульню «Не шукаючы не знойдзеш», якую прыдумалі дзеля таго, каб зацікавіць дзяцей ды іх бацькоў. Сапраўды, калі карыстаюцца цікавасцю гульні «Схватка» ці «Мазгавы штурм», то чаму б не выкарыстаць ідэю — і не проста прайсціся па музейных залах, а праз гульню даведацца пра тое, што ў іх захоўваецца.

Шукаць давядзецца адказы на пытанні, якія прапануюць музейныя героі. Праз экспанаты можна зрабіць для сябе столькі важных адкрыццяў і прыўзняць заслону таямніц гісторыі. Прычым адкрыцці абяцаюць нават для дарослых, а не толькі для малых, хоць клопат пра іх усё-такі галоўны для музейных супрацоўнікаў-педагогаў, якія павінны напоўніць сэнсам гадзіну ці паўтары, якія доўжыцца такая гульня. Удзельнічаць у ёй, дарэчы, можна нават кампаніямі, хоць нават для асобных наведвальнікаў задавальненне не надта дарагое. Затое карысці!..

Ларыса ЦІМОШЫК.

МОЛАДЗЬ ШАНУЕ ПОДЗВІГ ВЫЗВАЛІЦЕЛЯЎ

Праз некалькі дзён краіна 65-ы раз адзначыць свята Вялікай Перамогі. Мінае час, аднак у памяці і сэрцах беларусаў подзвіг дзядоў і прадзедаў будзе жыць заўсёды. Навечна ў памяці людзей застануцца подзвігі Мікалая Гастэлы, Кастанціна Заслонава, Марата Казея, Веры Харужай і многіх іншых нашых землякоў, якія паклалі на алтар Перамогі свае жыцці. Моладзь высока цэніць подзвіг загінулых і жывых, тых, хто не шкадаваў свайго жыцця і не думаў пра ордэны і медалі.

Напярэдадні свята Перамогі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі правёў Моладзевы марафон «65!». Яго ўдзельнікамі сталі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, творчая моладзь, зоркі беларускай эстрады, навучэнцы цэнтраў тэхнічнай творчасці краіны, прадстаўнікі моладзевых субкультур Узброеных Сілаў, органаў і падраздзяленняў унутраных спраў. На працягу 6 дзён удзельнікі марафону пранеслі эстафету «Агню Памяці», запаленага ад Вечнага агню на плошчы Перамогі, па беларускіх гарадах, там, дзе падчас Вялікай Айчыннай вайны праходзілі буйныя бітвы. У гарадах прайшлі аўтапрабегі «Дарогамі Перамогі», мітынгі з ускладаннем вянкоў да помнікаў і мемарыялаў, спартыўна-тэхнічныя шоу, тэматычныя флэш-мобы, канцэртныя праграмы, паказальныя выступленні прадстаўнікоў моладзевых субкультур. Флэш-акцыі і флэш-мобы, тэатралізаваныя пастаноўкі, арганізаваныя моладдзю былі настолькі арыгінальныя і запамінальныя, што ўсё цяжка пералічыць. Напрыклад, хочацца прыгадаць акцыю «Гэта — наша!», падчас якой актывісты БРСМ прапаноўвалі ўсім ахвотнікам намаляваць на тыльным баку далоні, твары беларускія знакі (сцяг, арнамент). А ў рамках флэш-акцыі «Дзякуй за жыццё», прахожыя падыходзілі да ватмана, абводзілі свае рукі і на адбітках рук пісалі словы падзякі, пажаданні ў адрас ветэранаў. А падчас «Палявой пошты» актывісты БРСМ прапаноўвалі напісаць ліст (словы падзякі, пажаданні) у адрас ветэранаў, скласці ліст «трохкутнікам» і пакласці яго ў скрынку для пажаданняў. Моладзевы марафон «65!» прайшоў праз Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель, Брэст, Гродна і фінішаваў на «Кургане Славы». Падчас яго самыя цёплыя і шчырыя словы падзякі гучалі ў адрас ветэранаў.

Як адзначыў **міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ**, такія мерапрыемствы значныя і дазваляюць моладзі далучыцца да гісторыі сваёй краіны.

— Гэты марафон — наша павага да подзвігу дзядоў, прадзедаў, бацькоў. Гэта стрыжань нашай ідэалогіі, аснова нашага патрыятычнага выхавання. І цяпер, напярэдадні 65-годдзя Вялікай Перамогі, гэта работа набывае асаблівую значнасць. І, безумоўна, патрэбны такія яркія, прыгожыя моладзевыя акцыі, як мотапрабег, наведванне святых для нас месцаў, такіх як Брэсцкая крэпасць, Курган Славы, Буйніцкае поле. І мы бачым, наколькі моладзь гэта цэніць, як успрымае гісторыю і апавяданні ветэранаў са слязамі на вачах. І гэта патрэбна моладзі, таму што гэта наша гісторыя, наш гераізм. Гэта неабходна і ветэранам, каб яны былі ўпэўнены ў тым, што наша моладзь — іх годная змена. І калі юнакі і дзяўчаты наведваюць ветэранаў дома, дапамагаюць ім, даглядаюць месцы пахаванняў воінаў, вось так удзельнічаюць у марафонах, паходах па месцах баявой славы — гэта, вядома, выхоўвае іх. Мы павінны праз урокі, пазашкольныя мерапрыемствы, праз сустрэчы з вызваліцелямі выпрацоўваць у моладзі сваё стаўленне да падзей нашай гісторыі. Павага да сваіх дзядоў і прадзедаў павінна праходзіць праз вучэбныя праграмы, праз душу, сустрэчы з ветэранамі, праз расказы ў сям'і, паходы па роднай зямлі. А ў нас усё адноўлена і мы ўсё гэта трапятліва захоўваем. І робім гэта разам з дзецьмі. Калі яны самі ў гэтым прымаюць удзел, ходзяць у паходы, наводзяць парадак на мемарыялах, выступаюць з канцэртамі ці дапамагаюць ветэранам — гэта тая работа, якую трэба праводзіць, і яна вельмі эфектыўная. Тады мы можам быць упэўненымі ў тым, што нашы дзеці нас не падвядуць у развіцці эканомікі. І калі раптам цяжка будзе, яны стануць плячо ў плячо, як гэта рабілі нашы дзяды, прадзеды, бацькі. У нас прыгожая, добрая моладзь і яна вартая падзвігу нашых вызваліцеляў, — заўважыў Аляксандр Радзькоў.

Зразумела, самымі галоўнымі і чаканымі гасцямі на мерапрыемствах, арганізаваных БРСМ, становяцца ветэраны. Яны заўсёды маладыя, энергічныя, падцягнутыя. Нават не верыцца, што гэтыя людзі змаглі столькі вытрымаць, вынесці і выжыць, насуперак ворагу. Менавіта яны падарылі нам Перамогу, менавіта перад імі мы, маладое пакаленне, у неаплатным даўгу. Як адзначыў **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Анатоль АДОНЬЕЎ**, у нашай краіне ветэраны не забытыя і пастаянна адчуваюць падтрымку моладзі.

— Вельмі важна, што наша моладзь шануе Вялікую Перамогу і подзвіг вызваліцеляў. І тое, што ў рамках гэтага марафону моладзь пабывала ў рэгіёнах, сустрэлася з ветэранамі, яшчэ раз падкрэсліла і пацвердзіла тую вялікую павагу да тых, хто са зброяй у руках абараняў нашу Радзіму, хто быў у партызанскім атрадзе, у падполлі выконваў свой свяшчэнны абавязак. І мы, ветэраны, шчыра ўдзячны моладзі за тое, што яна шануе гэты вялікі подзвіг. І мы гаворым ёй вялікі дзякуй за гэта і за тое, што яна так любіць свой родны кут і сваю зямлю, — дадаў Анатоль Адоньеў.

У сваю чаргу актыў БРСМ заўважае, што ім прыемна браць удзел у такіх мерапрыемствах. «Гэта для нас вялікі гонар, — гаворыць **Дар'я МІРОНСКАЯ, актывістка саюза**. — Мы вельмі паважаем ветэранаў. Я па святах заўсёды прыходжу на плошчу Перамогі і ўскладаю кветкі». А **Арцём ФІЛІПАЎ** заўважыў, што для яго свята Перамогі асаблівае, бо ў яго дзед ваяваў на фронце. І ўсе яны аднадушныя ў тым, што такія акцыі неабходныя.

І нягледзячы на тое, што моладзевы марафон «65!» ужо фінішаваў, работа, якая праводзіцца маладымі людзьмі па ўвекавечанні памяці абаронцаў і іх падтрымцы, будзе працягвацца. І можна з упэўненасцю сказаць, што ў нашай краіне вызваліцелі не забыты, як і іх подзвіг, які навечна застанецца ў памяці беларусаў.

Святлана СУХАРКО.

КУРЫЛЬШЧЫКІ, ВЫ «СВАБОДНЫЯ»

У Дуброўне актывісты БРСМ і юныя эколагі аб'явілі навучальныя ўстановы тэрыторыяй, свабоднай ад курэння і курыльшчыкаў.

Акцыю «Быць здаровым — гэта модна, кінь курыць ужо сёння» правялі ў раёне з размахам і без фармалізму. Барацьбіты з курэннем на галоўнай плошчы гарадка адкрылі імправізаваную спартыўную пляцоўку. Таксама цыгарэты мянялі на цукеркі, раздавалі памяткі аб шкодзе курэння. А рабочых-курыльшчыкаў Дубровенскага ільнозавода проста на рабочых месцах актывісты БРСМ запрасілі ў вольны час займацца ў трэнажорнай зале прадпрыемства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Мы — маладыя

МАРЫНІНЫ МАРЫ

Марына Белавус — лідар па жыцці. І калі толькі паспявае ўсюды — у конкурсах удзельнічае, у школьных, раённых, абласных мерапрыемствах, займаецца ў розных гуртках... Таму калі па выніках раённага конкурсу «Лідар-2010 года» найбольшую колькасць балаў атрымала яна, вучаніца 11 «Б» класа СШ № 3 г. Століна, гэта нікога не здзівіла, хоць супернікі ў яе былі вельмі моцныя. А ў канцы сакавіка Марына Белавус прыняла ўдзел у абласным конкурсе «Лідар-2010», дзе заняла шостае месца. З гэтай адкрытай дзяўчынай дамовілася сустрэцца пасля прыезду з Брэста, аднак нават на канікулах у Марыны было не так і шмат выхадных...

— Марына, ты адна з найлепшых вучаніц школы...

— Мой сярэдні бал за трэцюю чвэрць склаў 9,8. Я з дзяцінства марыла стаць залатой медалісткай. І калі ў першых класах гэта была толькі мара, то пасля я ўпэўнена рухалася да яе, прыкладаючы максімум намаганняў.

— Ты вучышся ў той жа школе, дзе працуе твая мама?

— Так, мая мама Святлана Іванаўна выкладае беларускую мову і літаратуру ў СШ № 3. Старэйшая сястра звязала сваё жыццё з педагогікай. Цяпер яна — студэнтка адной з мінскіх ВНУ, дзе атрымлівае спецыяльнасць настаўніка пачатковых класаў і беларускай мовы і літаратуры.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Рэзананс

ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ: зрабіць для дзяцей альбо зарабіць на дзецях?

Нядаўна ў «Звяздзе» быў змешчаны ліст настаўніка «Самаадданасць педагогаў нельга бясконца эксплуатаваць». Хачу падтрымаць аўтара гэтага ліста, таму што сама не аднойчы чула пра ўсе гэтыя праблемы, якія закранаюцца ў гэтым тэксце. І пра абавязковую падпіску, часам і на тыя выданні, якія нецікавыя настаўніку, і пра неабходнасць выдаткоўваць са свайго заробку грошы на кнігі і канцтавары (а часам яшчэ і на якую цукерку дзецям, каб заахвоціць маленькага вучня да добрых заняткаў), і пра бясконцую папяровую валакіту, і бессэнсоўныя праверкі разнастайных інстанцый. Напрыклад, адна з настаўніц распавядала, як чакала праверкі, як рыхтавалася, як хацела падзяліцца сваімі здабыткамі, але «праверку» зусім не зацікавіла, як жанчына працуе з дзецьмі, бо важна толькі адно — у якім стане знаходзяцца паперы! Таксама я чула і скаргу супрацоўніцы дашкольнай установы, якая пасля працы ў дзве змены (бо на вакансію другой выхавацелькі доўга не знаходзілася ахвотнікаў) начамі сядзела і «страчыла» бясконцыя справаздачы (заўважце: не план работы з дзецьмі і не тое, што ёй неабходна для пэўнага занятку з гадаванцамі). Ды што чула — бачыла, калі прыходзіла забіраць з ясляў сваю дачку: выхавацелька замест таго каб сачыць, ці ядуць малыя, ажно зашывалася ў разнастайныя паперкі. Каму гэта трэба? Настаўнікам ды выхавальнікам? Дзіцячай установе? А мо нашым дзецям? Чула я таксама і скаргі, планы, якія ставяцца перад школамі — зарабіць неверагодныя сумы на платных паслугах.

Толькі чула я гэта не як супрацоўніца дзіцячай установы, а як мама, у шчырай размове з жанчынамі, якія таксама гадуюць дзяцей, і некаторыя з якіх — настаўнікі альбо выхавальнікі. Таму і хачу далучыцца да дыскусіі менавіта як маці. Маці, якая хоча, каб побач з яе дзецьмі былі добрыя педагогі.

Я з таго пакалення, якое ўжо разумее, што бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы і што ў сваіх малых трэба ўкладаць немалыя грошы. Напрыклад, для дашкольніка сёння амаль немагчыма знайсці бясплатных гурткоў ці секцый. Заняткі ў мастацкай студыі каштуюць ад 20 тысяч на месяц, басейн — 30—80 тысяч, гімнастыка ад 30 тысяч, танцы ад 40, кожны платны гурток у садку пацягне на трыццатку. Але засмучае не толькі кошт на такія заняткі, а самі адносіны да дзяцей у грамадстве. Здаецца, што сёння чыноўнікі думаюць не пра тое, як зрабіць лепей для дзяцей, а як зарабіць на іх. Таму і ставяць школам планы па платных паслугах.

Але што стаіць за гэтымі планамі? Ці прадумваў хтосьці, як развіццё такой камерцыйнай справы адаб'ецца на нашых дзетках? Мая сяброўка вядзе заняткі па танцах у адной са сталічных школ. Нядаўна яна паскардзілася, што з наступнага года яе заняткі хочуць зрабіць платнымі. А гэта азначае, па-першае, што некаторыя дзеці, якія раней з ёй займаліся, проста не змогуць больш танцаваць. Па-першае, таму, што не ўсе бацькі гатовыя плаціць. Па-другое, калі грошы на дадатковую адукацыю ёсць, іх лепш выкласці на тое, што, магчыма, пасля спатрэбіцца дзіцяці ў жыцці — напрыклад, на паглыбленае вывучэнне матэматыкі, замежнай мовы, а вось ці хопіць на занятак па душы? Па-трэцяе, школа прапануе шмат разнастайных платных заняткаў, і ўжо вядзецца гаворка пра перагрузку, а «разгрузіць» можна, калі «зняць» эстэтычныя прадметы. Мне падаецца, мы зараз занадта зацыкленыя на развіцці дзіцяці, ці не з садка ўжо прадумваем будучыню за сваіх дзяцей, хочам, каб яны былі паспяховымі і змаглі ўдала ўладкавацца ў жыцці. Таму і ловімся на такія платныя паслугі. Але ці вырастуць ад таго нашы дзеці шчаслівымі? І ці будуць яны сапраўды адукаванымі, культурнымі альбо проста намуштраванымі па пэўных дысцыплінах?

Ці не стане развіццё платных паслуг спрыяць большаму расслаенню грамадства? Усё ж дзеці, для якіх бацькі куплялі дадатковыя заняткі па пэўных прадметах, маюць больш шанцаў пры паступленні, чым іншыя.

Ці асэнсоўваецца неяк тое, як платныя паслугі спалучаюцца са школьнай праграмай? Напрыклад, мне цікава, што будзе рабіць на звычайных занятках па школьнай праграме дзіця, якое да таго доўгі час «атрымлівала» англійскую, як дадатковую платную паслугу?

Калі перад школай будуць стаяць планы па зароблівані грошай, ці патрэбныя ёй будуць сапраўды таленавітыя дзеці? Магчыма, у той час, пакуль настаўнікі вымушаныя займацца здабыванням платных паслуг, яны не знойдуць часу для заняткаў з адоранымі дзецьмі?

І тым не менш, я хачу выступіць ЗА платныя паслугі ў садках і школах. І не толькі таму, што гэта зручна: не трэба ўвечары, калі вяртаешся з працы, некуды цягнуць ужо стомленае дзіця, пазбаўляць яго вячэрніх ці нядзельных прагулак.

Я за платныя паслугі, калі зароблены ўстановай грошы будуць у ёй жа і астануцца. Ісці на тыя ж канцтавары, метадычкі, падпіску альбо на рэчы, якіх не хапае ўстанове і на якія збіраецца з бацькоў. Я за платныя паслугі, якія сапраўды дадуць настаўнікам зарабіць. Бо, пакуль з той сумы, што яны здабываюць, ім перападаюць невялікія працэнты і займацца платнымі паслугамі (а гэта значыць: не толькі выкладаць, але і весці папяровую фінансавую справаздачу) нявыгадна. А між іншым, менавіта платныя заняткі (калі гэтыя грошы будуць пакідацца таму, хто іх зарабіў) маглі б спрыяць, каб сапраўды добрыя настаўнікі не пакідалі школу.

І я за платныя паслугі, на якіх дзяцей не загружаюць інфармацыяй, а абуджаюць любоў да ведаў. Куды хлопчыкі і дзяўчынкі ходзяць з задавальненнем і дзе з імі займаецца лепшы, паважаны, любімы настаўнік.

Алена ВАЙЦЯХОВІЧ.

Наш фармат

Песні Вялікай Перамогі

V Міжнародны форум студэнцкіх хораў «Папараць-кветка-2010», прысвечаны 65-годдзю Вялікай Перамогі, праходзіць гэтымі днямі ў БДУ.

Сёлета ўдзельнікамі форуму стануць вялікі хор Уральскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.М. Горкага (г. Екацярынбург), хор «Astrum Tenerum» з Вялікага Ноўгарада, камерны хор «Gaudeamus» Маскоўскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэт імя Баўмана, хор «Бэзавы сад» Расійскага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры спорту і турызму (г. Масква) і жаночы хор Студэнцкага культурнага цэнтра (г. Ніш, Сербія). Беларусь жа прадставяць тры вядомыя студэнцкія калектывы: народная харавая капэла Белдзяржуніверсітэта, хор Інстытута тэалогіі БДУ і інтэрнацыянальны хор «Дамінанта» Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Арганізатар адзінага ў СНД падобнага творчага форуму — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — падрыхтаваў вялікую святочную праграму. Культурныя акцыі праходзяць на розных студэнцкіх пляцоўках, а таксама пад адкрытым небам у старажытных беларускіх гарадах — Заслаўі (6 мая) і Міры (8 мая). Кульмінацыяй жа ўрачыстых мерапрыемстваў стане выкананне 7 мая пад адкрытым небам ва ўніверсітэцкім дворыку БДУ песні «Мой родны кут» усімі ўдзельнікамі міжнароднага форуму падчас традыцыйнага віншавання ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СЁННЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

МАРЫНІНЫ МАРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Можа, і ты не будзеш парываць пераемнасць прафесіі і выбераш педагагічную ВНУ?

— Не. Я хачу быць медыкам.

— І якія ў цябе любімыя школьныя прадметы?

— Біялогія і хімія. Напачатку я выбрала біялогію, але яе немагчыма ведаць без хіміі. Калі пачала вывучаць больш глыбока, разбірацца, то і хімія мне вельмі спадабалася.

— Акрамя вучобы, у выпускніцы школы ёсць яшчэ захапленні?

— На самай справе зараз для мяне ўвесь час — вучоба. Ды калі выпадае вольная хвілінка, імкнуся пагуляць у парку. Асабліва цяпер, калі прыйшла мая любімая пара года. Вясной іду па вуліцы, усміхаюся сама сабе, сустрэчным людзям, цёпламу ветрыку, вясёлым праменьчыкам сонейка.

— Я цябе ведаю яшчэ з Дома дзіцячай творчасці. Ірына Васільеўна Дабрыянец, кіраўнік гурткоў Столінскага ДДТ, сказала, што Марына як толькі навучылася самастойна хадзіць па горадзе, прыйшла ў Дом творчасці. Гэта так?

— Мы падлічвалі: у Доме творчасці я займалася ў 11 гуртках. З кожным з іх звязана пэўнае захапленне, якое мне падабалася менавіта ў тым узросце. Наогул, Дом дзіцячай творчасці раскрыў мае магчымасці, здольнасці. Лідарскія якасці былі раскрыты ў «Школе лідара», вучылася журналісцкай справе ў гуртку «Юны рэдактар».

— Ведаю цябе як і «кавэншчыцу».

— У Клубе вясёлых і знаходлівых я з 7 класа. Хоць і да таго мяне бралі на міні-ролі ў нумары КВЗ каманд нашай школы. Справа ў тым, што мая мама раней працавала педагогам-арганізатарам, і я прымала ўдзел у рэпетыцыях. Калі патрэбна было маленькае дзіця ў нумар — бралі мяне. Наогул, мне вельмі падабаецца пераўвасабляцца. Некалі мне сказалі, што мне падыходзіць роля Бабы Ягі, але пасля таго часу сыграла шмат роляў.

— Ці не было жадання стаць актрысай?

— Мара такая была. Але яна з тых мар, якім не суджана збыцца. Стаўку ў жыцці трэба рабіць на тое, чаго ты сапраўды можаш дасягнуць.

— Ці любіш ты чытаць кнігі?

— Вельмі люблю! З дзяцінства памятаю, як мы з сястрой угаворвалі маму дазволіць нам вечарам яшчэ крыху пачытаць перад сном. Любоў да кнігі выхоўваецца з дзяцінства. Калі маці не навучыла дзіця чытаць, любіць кнігу, то пасля ўжо складана гэта зрабіць.

— Вучыцца ў школе табе лёгка?

— У пачатковых класах было лёгка. А цяпер цяжкавата. І гэта з-за таго, што па кожным прадмеце атрымліваем вялікі аб'ём інфармацыі.

— Ты лічыш сябе таленавітым чалавекам?

— Адкажу так: калі ў 11 класе ў мяне бяруць інтэрв'ю, то нейкая часцінка таленту ў мяне ёсць.

— У цябе шмат сяброў?

— Шмат. Але самых лепшых — двое, яны значаць для мяне вельмі шмат.

— Калі ты гаворыш пра маму, то адчуваецца цеплыня, павага, гонар і сяброўства.

— Мы з мамай вельмі блізкія па характары людзі. Таму і разумеем добра адна адну. Мама давала мне заўжды свабоду выбару. Свабоды ў мяне было нашмат больш, чым у маіх аднагодкаў. Методыка выхавання ў мамы асаблівая. Часам мне было б лягчэй, каб яна сказала катэгарычна «не», але яна давала мне выбар, каб я сама вырашала.

— Дзякую, Марына, за гутарку. Зычу табе здзяйснення тваіх мараў.

Гутарыла Таццяна СЕГЕН. Фота аўтара.

Беларуска выйграла серабро на міжнародным марафоне ў Дзюсельдорфе

Беларуска Вольга Салевіч выйграла сярэбраную ўзнагароду на традыцыйным марафоне ў Дзюсельдорфе.

Наша суайчынніца паказала рэзультат 2 г. 31 мін. 41 сек., паведаміла карэспандэнту **БЕЛТА** прэс-аташэ Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Настасся Марыніна.

Перамогу святкавала расіянка Наталля Волгіна (2:27:32). Бронза таксама дасталася расіянкам. Замкнула тройку прызёраў Святлана Сямёнава (2:33:01).

«ЗУСІМ НЯМА СМЕРЦІ, А ЁСЦЬ ШМАТ ЛЮБОВІ»

ЗВЫЧАЙНАЯ ГІСТОРЫЯ, ЯКАЯ МОЖА ЗДАРЫЦЦА З КОЖНЫМ ЧЫТАЧОМ «ЗВЯЗДЫ»

На маім старым гадзінніку 20:40. Утульная кавярня забіта людзьмі. Маладыя афіцыянткі толькі бегаюць навыперадкі з куфлямі піва. Залатая вадкасць у бакалах здаецца зімовым сонцам: такое яскравае, і такое пазімоваму халоднае... «Не, табе трэба нешта рабіць, — усміхаецца мой універсітэцкі сябар. — Ну, знайдзі ты сабе сяброўку. Няхай смяшыць цябе кожны дзень сваімі дзіцячымі жартамі, а калі надакучыць...». З вялікіх калонак ліецца блюзавы барытон, у спеўным падарожжы яму спадарожнічаюць саксафон, гітара і, як ні дзіўна, акардэон. Каларытнае гучанне суправаджаюць колкія каментары вакаліста. Дзіўна, але не чакаў пачуць такі добры блюз, ды яшчэ на рускай мове, ды з такім імпэтам! «Слухай, а хто гэта грае?» — пытаюся ў таварыша. «Ну гэта ж «Billy's band». Лепш бы іх не ставілі. А то толькі тугу наганяюць. Калі хочаш, то пачытай інтэрв'ю з іх вакалістам.

Піцерскі інтэлігент з ірландскімі каранямі

На вялікай карце Санкт-Пецярбурга ёсць амаль нічым не прыкметная кропачка з назвай Купчына. Гэты мікрараён амаль нічым не адрозніваецца ад спальных раёнаў нашай сталіцы. Усё тыя ж самыя блізняты-шматпавярховікі, сетка чыгункі і высокія вежы-коміны цеплаэлектрацэнтраляў. У гэтым мікрараёне гадаваўся сённяшні прэзідэнт РФ Дзмітрый Мядзведзеў, а таксама вядомы блюзмэн Біллі Новік. Дарэчы, Білі ніколі не забываецца на сваю малую радзіму ў сваіх песнях, і, можа, менавіта дзякуючы гэтай нябачнай сувязі захаваў ветлівасць, спагадлівасць ды шмат яшчэ якіх добрых якасцяў. Нягледзячы на шчыльны графік гастроляў, ён шчыра адказаў на пытанні «Звязды».

— Білі, калі паглядзець на каляндар, час надысці вясне. Праўда, кіруе ў нас пакуль зіма. Якія асацыяцыі звязаны ў вас з вясной?

— Ведаеце, у мяне двухбаковыя пачуцці. Я гадаваўся ў піцерскім раёне Купчына, і таму, з аднаго боку — гэта кожны раз нараджэнне новага жыцця, а з іншага — як у народнай прыказцы «вясна прыйшла — пабачым хто нашкодзіў».

— Чым адметным вы цікавіліся ў дзяцінстве?

— Ды нічым такім асаблівым, бадзяўся без аніякай карысці, наведваў заняткі па фотамастацтве, слухаў італьянскую эстраду. Затое я верыў у тое, што калі стану дарослым, то здолею адпомсціць усім сваім крыўдзіцелям.

— Білі, а якія ў вас любімыя дзіцячыя падарункі?

— Гэта, напэўна, мае гаршчэчкі для кветак і замежныя піўныя бляшанкі.

— Я калісьці чытаў, што ў вас ірландскія карані. Ці ўзнікала жаданне крышачку пажыць на выспе святога Патрыка?

— Ідэя цікавая. Я вось часам падумваю пра тое, як бы вярнуць сабе бабчына прозвішча О'Брн. Ці добра гучыць: Білі О'Брн? Усё ж такі не... Мне здаецца, што занадта пафасна для спадчыннага купчынскага интэлігенціка.

— Ці было ў вашым мікрараённым дзяцінстве месца для блюза і джаза?

— Я не цярпеў на слых музыкі такога кшталту. Нават у маіх любімых на той час «Beatles» слухаў кампазіцыі, як кажуць, з цяжкім гучаннем. Мне заўжды падабаліся такія песні. Блюз стаў для мяне блізкі, ужо калі я пачаў цяжка працаваць, карміць сям'ю. Паралельна з працаю існавалі падпрацоўкі, гулянкі. Ну а пры такім жыцці ўжо і да джазу было недалёка...

Напэўна не кожны з прыхільнікаў Billy's band ведае, што да жніўня 2001-га, калі быў створаны гурт, Новік працаваў доктарам, і нават меў добрыя перспектывы, але ж абраў сцяжыну музыканта.

— Адкуль у вас цікавасць да медыцыны?

— Мне здаецца, што гэта сямейнае. У мяне па матчынай лініі ўсе лекары, а па-бацькоўскай... *(смяецца)*. Гэта ўсё жарты, не зважайце.

— Кіраўнік шпітальнага аддзялення напісаў вам добрую характарыстыку. Білі, чаму Вы пакінулі медыцыну?

— Я папрасіў трэці пазачарговы адпачынак за год, каб паехаць папрацаваць у Парыж (раней Новік разам з сябрамі часта граў на вуліцах еўрапейскіх гарадоў. Падчас адной з такіх вандровак у Германію, Білі пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай. — **Т.Ш.**). Пасля таго як мы вярнуліся з Заходняй Еўропы, я вырашыў сысці з працы.

Чалавек з кантрабасам

Наогул, Білі і яго аркестрыку не давялося доўга чакаць папулярнасці. Яны пачалі граць мазаіку джаза, блюза і рока, ствараючы цікавыя версіі кампазіцый ужо добра вядомых выканаўцаў, і гэта прынесла свой плён. Вобраз рамантыкаў у расшпіленых палітo, з непаголенымі тварамі толькі вабіў слухачоў, якім ужо надакучылі падобныя адзін да аднаго выканаўцы з вялікай сцэны. Лірычны вобраз Білі Новіка — інтэлігентнага мысляра-летуценніка, які разважае пра адзіноту, віно, жанчын і пры гэтым іграе на кантрабасе, стаў фірмовым знакам калектыву. Цяпер «джазаблюзарок» у выкананні «Billy's band» пазнаюць ва ўсёй Еўропе.

— Вы пачыналі граць на вуліцах. Чым дапамагла вам падобная жыццёвая практыка?

— Вуліца — сур'ёзная школа жыцця. Паспрабуйце спыніць людзей. Паспрабуйце ўтрымаць іх. Натоўп — лепшы індыкатар цікавага і нецікавага. А яшчэ ў нас не было мікрафонаў, а гэта значыць, што спяваць трэба не толькі якасна, але і вельмі гучна. У такіх умовах голас робіцца моцным, спелым.

— Кантрабас даволі каларытны інструмент. Ён вас зацікавіў сваёй незвычайнасцю ці...?

— Мне здаецца, што цябе пачынаюць пазнаваць, калі ты рушыш па вуліцы з кантрабасам. Людзі думаюць, што ідзе сур'ёзны чалавек.

— Вы самавук, не шкадуеце, што не маеце музычнай адукацыі?

— Я мяркую, што галоўная задача музычнай адукацыі — не спыніць цікавасці да музыкі. У гэтым сэнсе я захаваў цнатлівасць і лічу, што ў кожнага свой шлях да музыкі.

— Вы бралі ўдзел у джазавых фестывалях у канадскім Таронта і ў англійскім Рачэстары. Як ставіліся да рускіх мясцовыя карыфеі джаза?

— Дзіўна, але столькі руканняў са старымі ў нас не было нават пасля выступлення на айчынным тэлебачанні. Мяне пазнаваў кожны трэці ў Рачэстары і казаў «Hey Billy! It was great show last night!» (Прывітанне, Білі! Мінулым вечарам было цудоўнае шоу. — **Т.Ш.**) Нават афіцыянтка ў кавярні мне шапнула, што яна не супраць стаць маёй жонкай.

— Цікава, ці атаясамліваецца сцэнічны вобраз Білі з тым чалавекам, які жыве іншым, сямейным жыццём? Альбо гэта проста сцэнічная гульня?

— Не, гэта сапраўды я. Толькі такім я быў пяць гадоў таму. У новым альбоме «Блошиный Рынок» я ўжо буду свежым *(смяецца)*. А наогул, мне здаецца, што людзі не змяняюцца.

— Акрамя канцэртаў вы займаецеся тэатральнымі пастаноўкамі, а хутка выступіце ў касцёле святой Кацярыны ў Вільні. Выступленне ў святыні мае для вас духоўнае значэнне?

— Так, я шмат думаў на гэты конт. Ці маральна гэта? Аднак пасля я прыдумаў апраўданне. Мы ж блазны ад музыкі. Значыць — у Бога. Цікава, а хор там будзе?

— Хор ёсць амаль у кожным касцёле. Я вось што хачу спытаць, ці захавалася ў вас сяброўства з «дамузычнага перыяду»?

— Не, я кінуў усё і пераехаў з Купчына ў цэнтр горада. Вырашыў забыць усё і забыў. Калі што і ўзгадваецца, дык толькі ў маіх песнях.

Уся справа ў капелюшы

— Вы любіце перапісвацца з прыхільнікамі ў інтэрнэце. Чым вабяць вас такія размовы?

— Мне падабаецца тое, што дыялог віртуальны. Каб з кімсьці паразмаўляць, мне не трэба сядзець у кавярні і піць каву. І ў мяне заўжды ёсць час перад тым, як сказаць камусьці «НЕ».

— Знешне і па настроі ваш калектыў нагадвае музыкаў, якія маглі б выступаць у французскіх кавярнях гадоў 80 таму. У той час людзі любілі слухаць кружэлкі. Ці ўзнікала ў вас жаданне запісаць праграму на вініл?

— Файна было б выпусціць гнуткія кружэлкі, накшталт тых, што былі ў часопісе «Кругозор», і рабіць дадаткам да якога небудзь выдання. Вінілавыя кружэлкі — гэта супер: можна слухаць музыку з канца ў пачатак і шпурляць бумерангам з акна ўласнай кватэры.

— Старыя савецкія фільмы суправаджаюцца музыкаю ў выкананні джазавых калектываў. Цяпер падобнай традыцыі няма. Ці можна яе адрадзіць?

— А ў нас ужо ёсць напрацоўкі ў гэтым кірунку. Спачатку мы запісалі саўндтрэк да нямой кінастужкі. Пасля я агучыў джазавага кракадзіла Луі ў дыснэеўскім мультфільме «Прынцэса і Жабка» і запісаў 6 кампазіцый да анімацыйнага фільма «Насферату — Чалавек ночы», які зараз рыхтуецца.

— Вы ўжо далёка не першы раз выступаеце ў Мінску. Якімі былі вашыя першыя ўражанні ад нашай сталіцы?

— Мінск — досыць чысты і прыгожы горад, аднак у 2002-м нас некалькі разоў выганялі з аўтобуса на шляху да Германіі чамусьці менавіта ў Мінску. Не ведаю, сапраўды...

— Вы ўвесь час выступаеце ў рарытэтных капелюшах. Ці ёсць у вас любімы капялюш?

— Я прызнаю толькі капелюшы, падобныя на «свіны пірог». Ніякіх барсаліно... («Свіны пірог» і барсаліно — віды мужчынскіх капелюшоў. — **Т.Ш.**).

20:55. «Ну што, прачытаў?!» — ледзь не закрычаў мой сябар. «Так, амаль што». «Ну я ж казаў, што яны песімісты самотныя», — прабубнеў таварыш. «Глупства ты кажаш, — заўсміхаўся я ў адказ. — Рамантыкі яшчэ тыя. Глядзі, як весела ён на пытанні адказвае. З іх музыкай наша надвор'е лёгка пераносіць, тым больш з такімі зусім не песімістычнымі радкамі, якія чуваць цяпер з калонак: «Зусім няма смерці, а ёсць шмат любові».

Тарас ШЧЫРЫ.

ПОЛЬСКІ СТУДЭНТ СТАЎ ДВУХРАЗОВЫМ ЧЭМПІЁНАМ СВЕТУ ПА СУДОКУ

Студэнт з Польшчы Ян Мразоўскі абараніў тытул чэмпіёна свету па рашэнні галаваломак судоку. Пра гэта ў нядзелю, 2 мая, паведаміла газета The Philadelphia Inquirer, якая выступіла ў якасці аднаго з арганізатараў турніру, які закончыўся на дзень раней.

У фінальным спаборніцтве 23-гадовы Мразоўскі, студэнт будаўнічага факультэта аднаго з універсітэтаў Кракава, рашыў дзесяць галаваломак за 54 хвіліны і 4 секунды. Гэты вынік забяспечыў яму перамогу над супернікамі і другі тытул чэмпіёна свету.

Другое месца дасталася прадстаўніку з Чэхіі, а трэцяе — японцу. Аднак у агульнакамандным заліку перамогу святкавала Германія, якая набрала найбольшую колькасць ачкоў.

ЧЫЙ САЙТ У ІНТЭРНЭЦЕ ЛЕПШЫ?

Інтэрнэт-сайт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта перамог у намінацыі «Адукацыя і навука» на 17-й Міжнароднай спецыялізаванай выставе-кангрэсе па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «TIBO-2010». Другое месца ў гэтай намінацыі заваяваў сайт Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, а трэцяе — сайт факультэта беларускай філалогіі і культуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.

Інтэрнэт-прэмія з'яўляецца прафесійнай прэміяй аргкамітэта выставы, якая штогод прысуджаецца сеткавым работам, створаным у беларускім сектары інтэрнэта. Усяго на атрыманне інтэрнэт-прэміі ў 11 намінацыях было пададзена ў гэтым годзе 369 заявак — гэта амаль на 20 працэнтаў больш, чым у папярэднім. У намінацыі «Адукацыя і навука» пераможцаў давялося выбіраць сярод 35 прэтэндэнтаў. Пры гэтым толькі 14 сайтаў прапаноўвалі адукацыйны кантэнт, астатнія ж рэсурсы ўяўлялі сабой афіцыйныя сайты ўстаноў адукацыі. Сайты ацэньваліся па такіх крытэрыях як змест, структура, навігацыйныя функцыі, візуальнае афармленне, функцыянальнасць і інтэрактыўнасць. На жаль, якасць чыста адукацыйных сайтаў пакуль што саступае якасці афіцыйных сайтаў, магчыма, таму, што такія сайты з'яўляюцца пераважна справай рук энтузіястаў, у той час як над афіцыйнымі сайтамі шчыруе цэлая каманда прафесіяналаў.

Трэба дадаць, што скарбонку БДУ папоўнілі некалькі ўзнагарод выставы «TIBO—2010». Двума дыпломамі ў намінацыі «Бібліятэкі. Сеткавыя сэрвісы» быў узнагароджаны загадчык аддзела інтэрнэт-тэхналогій ЦІТ БДУ Андрэй Пупко як аўтар і распрацоўшчык сайта www.ship.bsu.by — аднаго з найбольш наведвальных рэсурсаў у дамене bsu. by. Спецыяльную прэмію журы атрымаў таксама Інстытут журналістыкі БДУ, які з'яўляецца распрацоўшчыкам сайта дзіцячай газеты «Зорька», якая стала прызёрам конкурсу «TIBO-2010». Акрамя таго, спецыяльную прэмію журы атрымаў сайт www. asabliva.by, распрацаваны Цэнтрам інфармацыйных тэхналогій БДУ і Галоўным інфармацыйна-аналітычным цэнтрам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРАГЛЫНУЦЬ ІГОЛКУ, КАБ УСЕ ЗДЗІВІЛІСЯ

Кастынг на «Хвіліну славы»: як гэта было

...Мой знаёмы Сяргей вялікі прыхільнік праграмы «Хвіліна славы»: на памяць ведае не тое што нумары, а нават імёны ўдзельнікаў. Кожны выпуск Сяргей чакае як свята, бяжыць пасля ў інтэрнэт галасаваць за сваіх фаварытаў. Канкурсантаў шмат: Кіеў, Масква, Адэса, Берлін і нават Іерусалім...

Нарэшце кастынг прыехаў і ў Мінск. Не сказаць, каб тут ён праходзіў упершыню, але многія сапраўды чулі пра яго першы раз. У дзень, калі ўся краіна шчыравала на рэспубліканскім суботніку, у клубе НЛА беларускія самародкі здзіўлялі сваімі талентамі маскоўскае журы.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

РАНІЦА ПАЧЫНАЕЦЦА

Ведаючы, што такое кастынгі, я разумеў: калі прыйсці пунктуальна — прапусціш самае цікавае. Таму прыйшоў за гадзіну да пачатку. І... нікога не ўбачыў. Ад дзяўчыны, якая курыла на ганку клуба НЛА, я даведаўся, што запаўняць конкурсныя анкеты ўдзельнікаў пусцяць толькі ў 9:45.

Прызнацца, думаў, будзе не праціснуцца. Але было куды больш сціпла: невялічкі хвосцік з ахвотнікаў паехаць у Маскву таптаўся пры ўваходзе клуба. У асноўным гэта былі дзеці гадоў па дванаццаць, некаторыя прыйшлі з музычнымі інструментамі.

Унутры ж — за дзвярыма клуба — усе чакалі прыезду маскоўскай дырэкцыі, якая і павінна была стаць вяршыцелем лёсаў беларускіх самародкаў. Імёны дырэкцыі ніхто не ведаў, таму інтрыга толькі нарастала. Спачатку казалі пра Марціраясна і Цакалу, пасля папаўзлі чуткі пра прыезд Парфёнава...

На гадзінніку 10:15. Ні Парфёнава, ні Маслякова — нікога. Затое арганізатары ў чарговы раз варажылі над афармленнем сцэны: пераклейвалі лагатып, перасоўвалі канапы журы, рухалі тэлевізары, наладжвалі камеры... На кастынг заяўлена 150 нумароў... Але кастынг не апошні. Для тых, хто не трапіў на гэты, будзе яшчэ адзін — летам.

«ДАЙЦЕ МНЕ ХВІЛІНУ СЛАВЫ...»

Зала клуба, дзе павінен быў пачацца кастынг, вельмі нагадвала тыповую карцінку з іншага шоу — «Розыгрыш». Прыглушанае святло, скураныя канапы, і толькі музыкі не хапала. Для журы паставілі чатыры шклянкі з вадой і маленькі тэлевізар. Калі аператар у трыццаты раз пачаў настройваць камеру, я падумаў, што хутчэй састарэю, чым убачу першага канкурсанта.

На гадзінніку 11:30. Аднекуль прынеслі ўжо другі тэлевізар. Хвілінная гатоўнасць.

І нарэшце. Пачутыя малітвы дзяўчынак у чаротачных туфліках, якія сноўдалі па прыступках клуба, разносячы гул на ўвесь НЛА — кастынг пачаўся!

Першы ўдзельнік — васьмігадовая Паліна з Гродна. Прыхільніца «Ранетак» спявала іх дыскатэчны хіт « Любовь я обещаю найти». Дзяўчына з маскоўскай рэдакцыі задала некалькі пытанняў кшталту «А што яшчэ любіш спяваць?», пасля чаго Паліна спявала а капэла.

29-гадовы Мікалай, бацька дваіх дзяцей, на кастынг прыйшоў у касцюме — ніколі не скажаш, што мужчына працуе развозчыкам ежы! Гурт «Ранеткі», у адрозненні ад Паліны, мужчына не слухае. Затое аматар Сярова. Яго песню і спяваў перад журы, пакуль тое не папрасіла заспяваць «Белавежскую пушчу»...

Публіка ажывілася, калі на сцэне з'явіўся Васіль з Наваполацка. Ужо 15 гадоў, як ён займаецца фокусамі. Чаго тут толькі ні было: і грошы рваліся, і манеты з-за вуха з'яўляліся, і нават жывы трус з-пад капелюша выскокваў...

Чарговая канкурсантка Анастасія здзіўляла тэхнікай пясчанага малюнка. За дзве хвіліны на пяску яна намалявала карціну з альбома рускіх партрэтыстаў...

Час на выступленне не абмяжоўваўся толькі хвілінай. Некаторыя выступалі і ўсе тры.

ІДЗІЦЕ ШЭПТАМ

Нумары нагадвалі кастынг у кнігу рэкордаў Гінэса. Праўда, некаторыя з «рэкордаў» былі тыповымі прыкладамі стандартнай праграмы любога ДК... Школьніца Наталля, трасучы жыватом і ўсім астатнім, старалася наблізіць атмасферу Усходу з серыяла «Клон». Па рэакцыі журы стала зразумела, што серыялаў яны не любяць.

Сапраўдны фурор зрабіў дзіцячы тэатр танца «Сланечнік», галоўным танцоркам якога не было і чатырох. Маленькія матронкі ў чырвоных сукенках і хустачках у дробную крапінку танцавалі пад песню «Бабушки-старушки». Нібы размножаныя дзяўчынкі Алёнкі з вядомай рускай казкі, сваёй наіўнасцю і дзіцячай непасрэднасцю яны проста зачароўвалі.

ПРАГЛЫНУЦЬ ІГОЛКУ, КАБ УСЕ ЗДЗІВІЛІСЯ

— За пяць сезонаў было ўжо шмат супернумароў, — дзеліцца развагамі адзін з удзельнікаў кастынгу **фокуснік-ілюзіяніст Васіль ТРУНОЎ**. — Каб здзівіць, трэба каб быў нейкі новы жанр. Не нумар, а менавіта жанр. І тады ён стрэліць.

У гэтую суботу падчас кастынгу канкурсанты «стралялі» нумарамі і жанрамі ажно да дзевяці вечара. Паказана было 100 нумароў. Таленты ехалі ў сталіцу з усіх абласцей Беларусі...

— Для ўдзелу ў «Хвіліне славы» патрэбна найперш рашучасць і ўпэўненасць у сабе, — працягвае Васіль Труноў. — Нават калі ты прыйшоў праглынуць іголку, гэта трэба зрабіць з выглядам, быццам гэта канец свету, тады ўсе здзівяцца.

Ці здзівілася таленавітым беларусам маскоўская дырэкцыя, стане відома пазней. Як запэўнілі арганізатары, шчасліўчыкам неўзабаве яны патэлефануюць самі.

Толькі ці варта нам і далей пастаўляць таленты ў Маскву? Ці не час стварыць нарэшце сваю «Хвіліну славы»? Як паказаў кастынг, першыя сто ўдзельнікаў ужо забяспечаны...

Ілья ЛАПАТО.

ЧАСЦІНКА ГІСТОРЫІ

Колькі дзяўчат вырасла на казачных гісторыях пра адважных рыцараў і найпрыгажэйшых дам! І кожная ўяўляла сябе на месцы каханкі мужнага змагара, які аднойчы прыедзе на белым кані і абароніць яе ад усіх ворагаў. І нават у сталым узросце мы падсвядома чакаем такога рыцара, таму што ў кожнай з нас жыве маленькая дзяўчынка, якая верыць у казкі.

Я ведаю сапраўднага рыцара. Праўда, ён пакуль што не набыў белага каня, ды і замкаў не мае, але ж не ў гэтым сутнасць.

Называючы Віктара рыцарам, я маю на ўвазе не толькі яго маральныя якасці, але і ўдзел у клубе гістарычнай рэканструкцыі «Кром» (гэтым словам раней называлі ўмацаваны замак) горада Гродна.

— Пра магчымасць узнавіць даўніну, акунуцца ў гісторыю нашага края я задумаўся яшчэ ў школе, — успамінае Віктар. — Але мне трэба было ад'язджаць з роднага горада (Маладзечна. — **Аўт.**), таму я вырашыў адкласці гэтую справу на час пасля паступлення. І толькі на пачатку вучобы ва ўніверсітэце стаў шукаць аднадумцаў. Так і трапіў у гэты клуб.

Удзельнікі клуба не проста б'юцца адзін з адным на мячах, яны спецыялізуюцца на ўзнаўленні гістарычнай рэальнасці. Нават маюць свайго архіварыуса, які займаецца падборкай гістарычных дакументаў. Ён ведае пра перыяд, які яны вывучаюць, (а гэта XIV— пач. XV ст.) больш за ўсіх рыцараў разам узятых. Архіварыус кансультуе змагароў наконт адзення і зброі, іх фасонаў, матэрыялаў. Дарэчы, усё адзенне, як і даспехі, рыцары робяць самі пры дапамозе сваіх дам. Толькі зброю яны часткова купляюць (напрыклад, лязо мяча), таму што ў іх няма ні матэрыялаў, ні абсталявання, каб вырабіць самастойна.

А як жа баі, сечы і войны? У клуба два кірункі дзейнасці: выступленні на гарадскіх і рэспубліканскіх святах (тут хлопцы і дзяўчаты прадстаўляюць Дом афіцэраў, у памяшканні якога знаходзяцца) і ўдзел у фестывалях, манёўрах і г.д. У апошнім выпадку клуб абараняе толькі сваю годнасць, не залежачы ні ад якіх сцэнарыяў. На такіх фестывалях часцей за ўсё ўзнаўляецца пэўная бітва, якая рэальна адбылася на нашых землях, і каштэлян (галоўны ў войску) вядзе свае коп'і ці гуфы на ворага. Здараюцца на фестывалях і турніры (або паядынкі), на якіх асобныя ўдзельнікі розных гісторыка-патрыятычных клубаў выяўляюць свае спрыт, моц і ўменне весці бой.

Майстэрства рыцары адточваюць на трэніроўках, якія ўключаюць не толькі агульную фізічную падрыхтоўку, але і ўрокі вядзення бітвы. Такія трэніроўкі могуць мець форму бугурта (бітвы. — **Аўт.**), калі мэта кожнай каманды — захапіць сцяг супернікаў. Зразумела, хто захапіў, той і перамог. Акрамя таго, кожны воін павінен удзельнічаць у сеймах, якія збірае каштэлян і на якіх вырашаюцца самыя важныя пытанні дзейнасці клуба. На іх прысутнічаюць нават новенькія, хто яшчэ не прайшоў абрад прысвячэння. Гэты абрад абавязковы, калі вы хочаце стаць сапраўдным рыцарам.

Прыходзяць у клуб і дзяўчаты. Зразумела, ніхто іх біцца цяжкімі мячамі не прымушае, а вось лучніцай пры жаданні можа стаць кожная. Нярэдка на фестывалях праводзяцца спецыяльныя спаборніцтвы лучніц. Але галоўная роля дзяўчат у «замку» — шыць адзенне і натхняць ваяроў на подзвігі, а гэта ўжо нямала.

Дарэчы, амаль кожны рыцар мае сваё спецыфічнае імя, якое адпавядае эпосе і характару чалавека. Вось напрыклад, герой гэтага матэрыялу завецца Драгавіт, што азначае прыкладна «веру ў сяброўства».

Віктар-Драгавіт расказвае, што ў краінах Заходняй Еўропы таксама існуюць падобныя аб'яднанні, прычым значна старэйшыя за беларускія. Так, напрыклад, у Чэхіі гісторыка-патрыятычныя клубы дзейнічаюць з пачатку XX ст. На жаль, пакуль што беларусы не ўдзельнічаюць у міжнародных фестывалях і спаборніцтвах. Але можа так стацца, я спадзяюся, што мы «агнём і мячом» адваюем сваё права быць часцінкай еўрапейскай гісторыі.

Настасся БАРБОСАВА, студэнтка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Жыццё студэнцкае

НУ І ЖАРТАЧКІ!!!

Студэнцкія жарты... Іх існуе такая колькасць, што, калі пачаць запісваць, дык, напэўна, давялося б звесці значную колькасць паперы і чарніла. Студэнты жартуюць адзін з аднаго (калі пачуцці гумару мае месца быць) амаль што ўсюды: і падчас заняткаў, і проста ў інтэрнаце, і нават у грамадскіх месцах... Гумар гэты, вядома ж, не мае на мэце пакрыўдзіць кагосьці ці нашкодзіць, сапсаваўшы настрой. Не. Проста заўсёды ў адказ чакаецца нешта падобнае: смешнае, арыгінальнае, хітраватае. Вось і складваецца свая сістэма жартаў у студэнцкага народа, якая перадаецца па спадчыне: з 1-га курса і да... Нават выходзіць і далей, па-за межы студэнцкага асяроддзя.

Я запісала толькі некаторыя, самыя-самыя жартачкі, якімі са мной падзяліліся мае сябры-студэнты. Шчыра кажучы, з некаторых я пасмяялася, а некаторыя мяне здзівілі шырынёй і праспорам сваёй фантазіі і разнастайнасці.

Яўген, БДПУ імя М. Танка:

У нашым інтэрнаце проста немагчыма жыць без жартаў. Кожны дзень у нашым пакоі пачынаецца з нейкага новага жарту. Прычым, ніхто з нас не крыўдуе адзін на аднаго, нават у самых смешных выпадках. Але, шчыра кажучы, дастаецца больш за ўсё нашаму суседу Івану, які, як быццам, проста не хоча абараняцца. Ён усё церпіць і толькі зрэдку адказвае нам тым жа. Праўда, у такіх выпадках смяецца ён з нас ад усяго сэрца.

Жарт 1-ы і самы распаўсюджаны: крадзеж адзення...

Сутнасць яго ў тым, каб дачакацца моманту, калі хто-небудзь пойдзе ў душ. Месцы такога тыпу ў студэнцкіх інтэрнатах звычайна агульнага карыстання і маюць своеасаблівы «прылазнік», дзе прынята пакідаць адзенне, ручнікі і яшчэ тое-сёе. Галоўнае — дачакацца, пакуль «ахвяра» пакіне ўсе гэтыя рэчы тут і спакойна адправіцца займацца воднымі працэдурамі.

Не адзін раз Жэню з сябрамі даводзілася ліквідаваць і адзенне, і ручнікі сваіх сяброў, пакідаючы ім у сваю чаргу цэлафанавы пакет ці адны шкарпэткі. А пасля са смехам назіраць за тым, як небаракі цішком перабягаюць па інтэрнацкіх калідорах, стараючыся абмінуць усіх і усё на сваім шляху.

Я на свае вочы аднойчы бачыла, як хлопец, пачырванеўшы як памідор, спрабаваў дабрысці да свайго пакоя ў набедранай павязцы з цэлафанавага пакета, якога, аднак, хапіла толькі на тое, каб прыкрыць вонкавую частку свайго цела. Усё астатняе ён спрабаваў замаскіраваць рукою. І смех, і грэх, як кажуць.

Жарт 2-і: робім макіяж... хлопчыку...

І прычым робіцца гэта суседу ў той час, калі ён салодка пасопвае на інтэрнацкім ложку. Тут трэба працаваць камандна: нехта сочыць за небаракам, каб не прачнуўся раптам і не праваліў усю аперацыю, а нехта працуе з касметыкай... Прычым фарбы звычайна бяруцца самыя яркія. Выкарыстоўваюцца таксама аксэсуары рознага тыпу: вялікія завушніцы, каралі і нешта такое. Ды яшчэ ж трэба не забыцца і на пазногці: як на руках, так і нагах. Прыгажосць патрабуе ахвяраў, няхай і такіх вялікіх. Галоўнае тут — не праспаць той момант, калі «расфарбаваны» ўстане з раніцы і накіруецца на кухню ці яшчэ куды. Трэба зафіксаваць сабе выразы твараў тых людзей, з якімі яму давядзецца сустрэцца па дарозе...

Жарт 3-і: працуем з валасамі (прычым не толькі на галаве)...

Можна выстрыгчы паўгалавы, ці неяк па-асабліваму ўкласці валасы. Напрыклад, накруціць іх на бігудзі, выкарыстаць плойку ці, наадварот, выпрастаць. Гэта будзе мець вялікі эфект.

Дзмітрый, БНТУ:

Мы аднойчы надта заняліся гэтай справай, што пакінулі хлопца наогул без броваў. Калі мы зразумелі, што сітуацыя выйшла з-пад кантролю, то вырашылі яе неяк выправіць. А менавіта, узялі фламастар і... Атрымалася не надта прыгожа, шчыра кажучы. Але што ж рабіць, сітуацыя была складаная. Раніцай, зразумела, мы атрымалі, што называецца, па поўнай праграме.

Цяпер гэты хлопец успамінае аб тым выпадку з усмешкай. Новыя бровы выраслі. Праўда, часу на гэта спатрэбілася шмат.

Жарт 4-ы: гатуем ежу...

Добрым яго назваць нельга. Звяртаюцца да яго ў тых выпадках, калі хочуць правучыць чалавека ці зрабіць яму нейкае паскудства. Сэнс яго ў тым, каб прыгатаваць якую-небудзь смачную страву, дадаць у яе сродак, які тыбецкія манахі выкарыстоўваюць для ачышчэння свайго арганізма. Адным словам, слабіцельнае ці рыцына, таксама падыходзіць для гэтай справы. А пасля ад усёй душы пачаставаць таго, на каго накіраваны жарт. Гэта жорсткі спосаб, але дз

ПРАБЛЕМА СА ЗДАЧАЙ МАЛАКА БУДЗЕ НА КОНТРОЛІ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З Клічаўскага раёна патэлефанавала ўсхваляваная жанчына: дапамажыце вырашыць праблему са здачай малака. Заяўнікі маюць дзве каровы, падавалася б, можна было б мець дадатковую капейчыну да сямейнага бюджэту. Аднак, па-першае, быццам бы ў малаказборшчыка пагнуты літрамер, значыць, ужо паказанні па аб'ёмах не супадаюць. Па-другое, заяўнікі не згодныя з тымі паказчыкамі тлустасці малака, пра якія ім паведамляюць. Па-трэцяе, калі ў малацэ знаходзяць ваду, яго малаказборшчык не вяртае здатчыкам. За ім даводзіцца ехаць самім, а гэта каля двух кіламетраў. Заяўніца сцвярджала, што за апошні тыдзень страціла такім чынам больш за 100 літраў малака...

Старшыня Калбчанскага сельскага Савета Святлана КНІГА, да якой мы звярнуліся па дапамогу, была ў курсе канфлікту паміж здатчыкамі і малаказборшчыкам. Больш за тое, па скарзе нашай заяўніцы яна ўжо выязджала разбірацца адносна быццам бы «няправільнага» літрамера.

— Узяла новую ёмістасць на 10 літраў, зверыла з той, якой карыстаецца малаказборшчык. Паказанні супалі, ніякіх разыходжанняў па аб'ёмах не было. Тым не менш я сказала малаказборшчыцы, каб надалей яна карысталася толькі новым літрамерам, — патлумачыла Святлана Валер'еўна. — Тое ж прыкладна было і з праверкай тлустасці малака: калі мы ўзялі яго на аналіз, тлустасць склала толькі 2,6 працэнта, да таго ж у ім было 6 працэнтаў вады. Гаварыць пра тое, што нехта такім чынам імкнецца нашкодзіць канкрэтнай сям'і, не выпадае, бо малако ад шэрагу здатчыкаў ідзе ў адну асобную ёмістасць у малакавозе. Так, малако часам вяртаюць. Аднак развозіць яго назад здатчыкам малаказборшчык не павінен. Па-першае, таму, што такая праца яму не аплачваецца, па-другое, бітоны патрэбна падрыхтаваць да наступнага дня, значыць малако ў іх нельга захоўваць далей, напрыклад, да раніцы наступнага дня. У такіх выпадках малаказборшчык тэлефануе ўсім здатчыкам, і тыя самастойна прыязджаюць, забіраюць свой прадукт. Калі гаварыць пра сям'ю вашых заяўнікаў, дык у яе тры трактары і дзве машыны, так што праблем з транспартам у іх быць не павінна.

Высветлілася і яшчэ адна акалічнасць, з-за якой мы свядома апусцілі прозвішчы бакоў, якія аказаліся ўцягнутымі ў гэты своеасаблівы «малочны» канфлікт. Здатчык і малаказборшчык... цёткі і пляменніца. Не нам меркаваць, што насамрэч адбываецца паміж, здавалася б, роднымі людзьмі, таму мы проста ў межах сваёй кампетэнцыі і магчымасці паспрабавалі даць адказы на пытанні заяўніцы. Па нашай просьбе праблема са здачай малака гэтай канкрэтнай сям'ёй будзе ў бліжэйшы час на кантролі ў старшыні сельскага Савета. Яна, у прыватнасці, адзначыла, што малако будуць прымаць.

НА БАРДЗЮРЫ САПРАЎДЫ НЯМА ГРОШАЙ...

МАРЫЯ Васільеўна Яхно пражывае ў Жыткавічах на вуліцы Пралетарскай. Каля двух гадоў таму вуліцу рамантавалі, чаму можна было б толькі парадавацца, каб, як яно часам бывае, не адно «але».

«Дарогу падняслі, паклаўшы асфальт, а вось бардзюры з двух бакоў не ўстанавілі. Дык для насельнікаў з левага боку Пралетарскай яшчэ нічога, а вось жыхары з правага боку літаральна тонуць: вада ўвесну змывае агароды. Чакалі колькі часу, пакуль не выпраўляць хібы, ды нам адказваюць, што сродкаў няма. Спрабавалі неяк самастойна вырашыць тую праблему — цэглай, пяском стрымаць напор вады, але нічога не атрымліваецца», — даводзіла нам заяўніца. Паводле яе слоў, тыя бардзюры патрэбныя не па ўсёй даўжыні вуліцы, а толькі з 48-га па 80-ы дамы.

Як патлумачыў на наш запыт **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Жыткавіцкага райвыканкама Міхаіл ЗУБКО**, адзначаная праблема сапраўды існуе. І вырашыць яе даволі праблематычна, бо перашкода — у адсутнасці грошай. І немалых. Каб усталяваць тыя бардзюры на Пралетарскай, патрэбна каля 150—200 мільёнаў рублёў, калі не больш, як заўважыў суразмоўца. Натуральна, у раённым бюджэце на гэтыя мэты такіх сродкаў няма, не паступала іх пакуль і з дарожнага фонду. Больш за тое, памянёныя бардзюры па гэтай жа прычыне пры правядзенні рамонту вуліцы і не планаваліся.

— Праблема знаходзіцца на кантролі, пра яе ведае старшыня райвыканкама, яна неаднаразова абмяркоўвалася, аднак пакуль сказаць нешта канкрэтнае наконт яе вырашэння цяжка, — адзначыў Міхаіл Іванавіч. — Прынамсі, на бліжэйшы час ніякіх зрухаў тут не плануецца...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗЯМНЫ СЮЖЭТ



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

Франтавы хірург Ціхан ВЕТРАЎ:

Дванаццаць імгненняў вайны. Частка 10

«АСКОЛАК УВАТКНУЎСЯ Ў НАТАТНІК НАСУПРАЦЬ СЭРЦА...»

— Ставілі некалькі аперацыйных сталоў. На адным скончыў работу — ідзеш да наступнага. Спалі па дзве гадзіны ў суткі, — так Ціхан Ветраў апісвае працу вайсковага ўрача.

Тым не менш, медыкі Чырвонай арміі вярнулі ў вайсковыя шэрагі больш за 72 працэнты параненых байцоў.

Ціхан Іосіфавіч распавёў пра медсанбат часоў Вялікай Айчыннай, абстрэлы варожай, а часам і роднай авіяцыі, а таксама пра сваё цудоўнае выратаванне падчас артылерыйскага абстрэлу.

— Калі пачалася вайна, я быў слухачом 4 курса 2-га Маскоўскага медыцынскага інстытута. Гэты дзень не забудзеш, — *прасякнуўся ўспамінамі Ціхан Іосіфавіч*. — Наш ваенны факультэт стаяў лагерам на беразе Волгі пад горадам Ржэў. А на супрацьлеглым беразе былі танцы, ігралі духавы аркестр, людзі яшчэ не ведалі. Але потым хутка разышліся, напэўна, ім таксама сказалі пра напад немцаў.

Як кажуць медыкі, вайна — траўматычная эпідэмія, хірургаў для аказання дапамогі патрабуецца шмат. Нас вярнулі ў Маскву, больш увагі надалі ваенна-палявой хірургіі і выпусцілі з інстытута датэрмінова.

На фронт я трапіў у жніўні 1942-га года, быў старшым урачом артылерыйскага палка, потым трапіў у медыка-санітарны батальён на Калінінскі фронт.

— Што гэта такое — праца хірурга ў франтавым медсанбаце? Ці ўсю праўду паказваюць у кіно?

— Найчасцей паказваюць першую медыцынскую дапамогу на полі бою. Ды і то павязкі часта робяць не так, як трэба. Баі пачыналіся на досвітку і заканчваліся ў цемры, начных баёў тады не вялося. Параненых прывозілі ў медсанбат у другой палове дня. Першую ноч працуем, цэлы наступны дзень працуем. Потым перамяшчаемся ў іншае месца, дзе зноў разгортваем медсанбат. Першыя двое сутак наступлення спаць не было калі. З прыёмна-сартавальнага аддзялення прыходзяць санітары: *«Хутка адпачнём, там усяго тры чалавекі»*. Потым прыходзяць зноў: *«Там яшчэ на дзвюх машынах прывезлі»*. Вось і адпачылі.

— Як можа медык працаваць некалькі сутак запар без адпачынку?

— Галоўны хірург мне аднойчы сказа: *«Ты засынаеш, ідзі адпачывай»*. Залез я ў лагерны намёт, лёг — а сонцуць не магу, адчуваю моцную пульсацыю скроневай артэрыі. Пару гадзін паляжаў — вярнуўся. Надзеў халат і працягнуў працу.

Ставілі некалькі аперацыйных сталоў. На адным скончыў работу — медсястра пачынае перавязваць, шыны накладаць, а я ўжо каля іншага стала.

Але праца медыкаў была даволі эфектыўная. Па афіцыйнай статыстыцы 72,4 % параненых былі вернутыя ў шэрагі войска.

«Раптам прылятае наш самалёт, чырвоназоркавы, і строчыць па медсанбаце»

— Медсанбат разгортваўся побач з перадавой. Часта здараліся налёты авіяцыі, хоць медыцынская канвенцыя забараняла бамбіць такія ўстановы, — *працягвае Ціхан Ветраў*. — Ставілі белы сцяг з чырвоным крыжам. Але немцы на гэта ўвагі не звярталі. Наадварот. Даводзілася часта разгортвацца ў лесе і маскіравацца. Памятаю, аднойчы разгарнуліся ў вёсцы, дзе не было жыхароў. Намёты ставілі паміж хатамі. Прыляцеў нямецкі самалёт, заўважыў рухі, пачаў бамбіць вёску. Параненыя перапужаліся, пачалі выскокваць з намётаў. Я крычу: *«Не выскоквайце, вы са сваімі белымі павязкамі парушаеце маскіроўку. Кладзіцеся на падлогу, каб не закранулі асколкі»*. Паслухаліся, леглі. Самалёт адляцеў, ніхто не пацярпеў, толькі намёты пасекла асколкамі. А вось на пэрыферыі краі санінструктары часта расплочваліся сваім жыццём.

Адной нашай медсястры пасля ранення вымушана ампутавалі нагу. Пазней атрымалі ліст, што ёй зрабілі добрыя пратэзы, і яна нават танчыць...

Здараліся і кур'ёзы. Падчас перасоўвання медсанбата зноў-такі спыніліся ў адной з вёсак. Чакалі каманды, каб рушыць далей. Раптам пралятае наш самалёт, чырвоназоркавы, і строчыць з кулямёта па дамах. Паранена ў руку была ўрач Лабанава. Яна нешта паспела памыць і якраз на дварэ вешала бялізну на вяроўку. Гадзіны праз дзве прыехаў палкоўнік-авіятар і папрасіў прабачэння — у лётчыка на карце было пазначана, што ў вёсцы немцы.

— Якія захворванні былі найчасцейшыя ў вайну?

— Ангіна, запаленне лёгкіх. Вайсковыя антысанітарныя ўмовы, дрэннае харчаванне маглі прыводзіць да эпідэмій. Але нашы медыкі гэтага не дапускалі. Былі толькі лакальныя ўспышкі брушнога тыфу, дызентэрыі. Я праводзіў прафілактычныя работы ў палку, пацягаўся па зямлянках і таксама падхапіў брушны тыф. Але ўсе медыкі былі прывітыя вакцынай Крантоўскай. Таму хваробу перанёс у лёгкай форме.

Да таго ж на Карэльскім перашыйку падчапіў малярыю. Кожны трэці дзень прыступ: высокая тэмпература і так далей. Потым усё праходзіць, а праз тры дні зноў паўтараецца. Прымаў хінін: ён страшэнна горкі, загортваў яго ў паперу для папяросаў і стараўся хутка праглынуць. Хвароба цягнулася сем месяцаў. І толькі ва Усходняй Прусіі разведчыкі прынеслі

трафейныя нямецкія медыкаменты. У ампулах быў так званы кардыязолхінін. Медсястра рабіла штодзень па ўколе, і малярыя хутка скончылася.

— Як выглядаў медсанбат Другой сусветнай вайны?

Раптам пралятае наш самалёт, чырвоназоркавы, і строчыць з кулямёта па дамах. Паранена ў руку была ўрач Лабанава. Яна нешта паспела памыць і якраз на дварэ вешала бялізну на вяроўку. Гадзіны праз дзве прыехаў палкоўнік-авіятар і папрасіў прабачэння — у лётчыка на карце было пазначана, што ў вёсцы немцы.

— Мы разгортвалі намёты, якія служылі аддзяленнямі. Гэта — прыёмна-сартавальнае аддзяленне, куды наперш прывозілі параненых, далей — аперацыйна-перавязачнае, аперацыйная палата, супрацьшокавая палата. Калі патрабавалася, разгортвалі палату для анаэробных хворых, якія атрымлівалі газавае атручэнне. Быў так званы шпітальны намёт, дзе ляжалі пацыенты, якія перанеслі аперацыю і былі нетранспартабельныя.

У медсанбаце служыла чалавек 70. Хірургаў было 4, а таксама эпідэміёлаг, тэрапеўт, зубны ўрач.

— Ці ўдавалася ў вайсковых умовах захоўваць стэрыльнасць? Без гэтага ж немагчыма праводзіць аперацыю?

— Былі спецыяльныя аўтаклавы, інструменты стэрылізаваліся ў спірце, мы надзявалі маскі.

Часам лёгкапараненых спецыяльна затрымлівалі, каб нарыхтоўвалі дровы, дапамагалі па гаспадарцы.

Быў у нас цырульнік Федзя. Ён і нас мог падстрыгчы, і пацыентаў з раненнем чэрапа галіў. Іначай складана праводзіць трэпанацыю. І вось неяк прыехаў намеснік камандзіра дывізіі, забраў на фронт некалькіх чалавек, у тым ліку і Федзю. На наступны дзень прывозяць яго труп. Было раненне ў пахавую вобласць, перабіла сцегнавую артэрыю. Спыніць крываток не змаглі...

«Пацыенты дзякавалі не заўсёды»

— Вопытныя хірургі, у якіх вялікі стаж працы, называлі маладых, як мы, хірургоідамі. Бывалі выпадкі, калі параненыя паміралі на аперацыйным стале. Можа быць, і вопыту дзесьці не хапала. Не кожнага ўдавалася выратаваць. У такія моманты думалася: *«Які чорт тузануў мяне ісці ў медыцыну?»*. Перажывалі за кожнага, хто паміраў.

Нават калі ратавалі жыццё, пацыенты не заўсёды дзякавалі. У аднаго параненага пачалася газавая гангрэна. Галёнкі былі раздробленыя, раны — забруджаныя. Давялося рабіць ампутацыю. Газавая гангрэна пайшла вышэй — давялося рабіць ампутацыю вышэй каленнага сустава. І ўсё адно гангрэна не спынілася, выратаваць яго не ўдалося. Калі б быў тады пеніцылін, ён бы не загінуў, а так нічога нельга было зрабіць. Мы не мелі моцных сродкаў дэзінфекцыі, часта прамочвалі раны марляй з марганцоўкай.

Быў і такі выпадак: вось-вось у пацыента пачнецца газавая гангрэна, трэба было рабіць ампутацыю. Іначай загіне. А ён:

— Не, не дам ампутаваць нагу.

— Ты ж загінеш! Лепш без нагі, але жывым.

— Не, няхай загіну, а на ампутацыю не згодны.

Хоць нагрузка вялікая, параненых шмат і часу на персанальны дагляд няма, давялося зрабіць усё магчымае, каб выратаваць нагу. І атрымалася. І што вы думаеце, дзякуй сказаў?

— Вось, а вы мне хацелі нагу адрэзаць. Як бы я жыў? А цяпер я з нагой, — сказаў той пацыент.

— Ці былі раненні ў вас асабіста?

— Не было. Але аднойчы вёску, дзе разгарнулі медсанбат, абстрэльвала артылерыя. Я быў у гімнасцёрцы, кажуху. Беглі ўздоўж вёскі.

Калі ўсё скончылася, я распрануўся і палез у кішэню за грабянцом. Было што прычэсваць. А грабянец раструшчаны. Зірнуў — на кішэні дзірка. Аказалася, што снарад выбухнуў побач, асколак разбіў грабянец і ўваткнуўся ў нататнік, які мне перад адпраўкай на фронт падарыла дзяўчына. Асколак трапіў проста насупраць сэрца — калі б не нататнік, загінуў бы...

За вайну Ціхан Ветраў прайшоў некалькі франтоў, вызваляў нашу зямлю ад фашыстаў. За плённую працу ўзнагароджаны франтавымі медалямі і ордэнамі. Перамогу сустрэў пад Гданьскам (сучасная Польшча).

Пасля Другой сусветнай вайны працягваў вайсковую кар'еру. У Барысаве быў начальнікам медслужбы цяжкай танкавай дывізіі. У адстаўку пайшоў падпалкоўнікам і пасля стаў выкладаць на ваеннай кафедры сталічнага медінстытута. Сёння Ціхану Іосіфавічу 91 год.

Яўген ВАЛОШЫН.

У Беларусі зменшаць долю імпартнага піва

Забарона на распіццё піва ў грамадскіх месцах не павінна адбіцца на папулярнасці гэтага напою ў Беларусі. Разам з тым, на думку **начальніка сектара піваварнай галіны канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Яўгена МАР'ЮШЫЧА**, сёлета можа змяніцца сама структура спажывання: беларусы будуць піць больш свайго і менш замежнага піва. Дарэчы, пакуль доля імпарту тут сапраўды застаецца значнай — яна складае прыкладна 30 працэнтаў унутранага рынку нашай краіны.

Разлік на скарачэнне імпарту перш-наперш звязаны з заканчэннем трэцяй і апошняй чаргі рэканструкцыі буйнейшага айчыннага вытворцы — ААТ «Крыніца». У цэлым яна абышлася ў 306 млрд рублёў. У выніку прадпрыемства атрымала самае сучаснае абсталяванне і значна павялічыла свае магутнасці. Фактычна гаворка ідзе аб «прыбаўцы» ў чатыры разы: з 6,7 млн дэкалітраў у 2003 годзе да 24 млн дал на сёння. «Па сутнасці ў вытворчасці не засталося нявырашаных пытанняў, і надалей мы бяром інвестыцыйныя канікулы, — заўважыў **генеральны дырэктар прадпрыемства Рыгор ПЯТКЕВІЧ**. — У бліжэйшы час сродкі будуць укладвацца толькі ў развіццё рынку».

Ужо сёлета ў параўнанні з мінулым годам вытворчасць піва на «Крыніцы» павінна павялічыцца на 14 працэнтаў. Пры гэтым ёсць намер удвая павялічыць экспарт — з 1,7 да 3,4 млн дэкалітраў. Прадпрыемства актыўна працуе на рынках Расіі, Украіны, Арменіі, краін Балтыі, вядуцца перамовы аб пастаўках у Казахстан і Азербайджан. Адначасова «Крыніца» плануе выкарыстоўваць схему прыват-лейблаў — працаваць пад заказы буйных гандлёвых сетак, у прыватнасці, Літвы і Расіі.

Разам з тым, заўважыў Рыгор Пяткевіч, пры павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці ўзнікае праблема з абаротнымі сродкамі. Яна стала актуальнай удвая пасля рашэння аб павелічэнні акцызу больш чым на 100 рублёў на кожны літр. Таму прадпрыемства будзе шукаць дадатковыя сродкі. Сёння «Крыніца» разам з «Белаграпрамбанкам» адпрацоўвае праграму выпуску аблігацый амаль на 8 млрд рублёў з пагашэннем у 2015 годзе. Чакаецца, што даходнасць па аблігацыях складзе стаўка рэфінансавання плюс маржа. Наконт апошняй пакуль вядуцца перамовы.

Тым часам прадпрыемства мае намер прапанаваць спажыўцам некалькі навінак. Літаральна апошнім часам тут з'явіўся новы гатунак «Крыніца Прэміум», да пачатку чэрвеня распачнецца вытворчасць пшанічнага піва «Kult Белае». Апроч таго, у сувязі з вядомымі зменамі ў заканадаўстве актывізуецца работа ў безалкагольным напрамку. Вытворчасць бутыляванага натуральнага квасу «Старажытны» павінна ўзрасці як мінімум у 10 разоў — да 500 тыс. дэкалітраў.

— Паралельна стаіць задача павялічыць аб'ём продажу піва ў бляшанках і шкляных бутэльках, а гэта магчыма толькі за кошт прадуктаў з сур'ёзным «іміджам», — заўважыў Рыгор Пяткевіч. — У сувязі з гэтым плануецца асваенне новай імпартазамяшчальнай прадукцыі. Так, з улікам рэканструкцыі, мы разлічваем атрымаць згоду на вытворчасць вядомых сусветных марак і ўжо сёлета выйсці з гэтымі брэндамі на рынак.

Сяргей ГРЫБ.

ПАСЛЯ ВЯСЕЛЛЯЎ — ХРЭСЬБІНЫ

На кожным Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, сталіцай якога з 1996 года з'яўляецца горад Гродна, абавязкова бываюць нейкія навінкі. Два гады таму, напрыклад, на нацыянальных падворках паказваліся вясельныя абрады. А сёлета, падчас VIII фестывалю, можна будзе азнаёміцца з нацыянальнымі традыцыямі хрэсьбінаў немаўлят.

Паводле апошніх звестак, у фестывалі прымуць удзел 750 прадстаўнікоў 33-х нацыянальнасцяў, у тым ліку і дэбютанты — галандцы, кітайцы і, мажліва, ланкійцы. Упершыню цырымонія адкрыцця свята нацыянальных культур (4 чэрвеня) адбудзецца на стадыёне «Нёман» з прамой трансляцыяй на Савецкую плошчу. На другі і трэці дзень дзейства фестывалю перамесціцца на вуліцы, плошчы горада, у парк Жылібера. Сярод навінак — конкурс дзіцячай нацыянальнай песні, а таксама «канкурэнцыя» моладзевай дыскатэцы, якую складзе «Дыскатэка 80-х».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

19 мая 2010 г. в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж».

Повестка дня:

1. О приобретении акций ОАО «Сантехэлектромонтаж» на баланс общества.
2. Об оказании безвозмездной спонсорской помощи.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А. Начало регистрации участников собрания: 14.30.

УНП 400052115

Здарэнне

НЕ ЗДОЛЕЎ АБАГНАЦЬ

Каля вёскі Даманава Іванцэвіцкага раёна вялікагрузная фура зачапіла трактар. Аўтамабілем кіраваў 36-гадовы грамадзянін Польшчы, які хацеў абагнаць трактар, ды не разлічыў траекторыю руху і зачапіў культыватар. У выніку трактар перавярнуўся. 39-гадовы трактарыст з цяжкімі траўмамі дастаўлены ў бальніцу. Вадзіцель фуры не пацярпеў.

Яна СВЕТАВА.

Прамая лінія

АЛЕРГІЧНУЮ РЭАКЦЫЮ ТРЭБА СПЫНІЦЬ

(Працяг. Пачатак у нумары за 4 мая.)

На вашы пытанні адказала <u>дацэнт кафедры алергалогіі і прафпаталогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла МАСЛАВА</u>.

☎— Брэст, Наталля Іосіфаўна. Дачцэ 5 гадоў. Ад нараджэння пакутуем ад харчовай алергіі. Спіс прадуктаў такі, што ўжо вельмі мала што можна даваць. Аўсянку пачалі даваць — высыпала, манную крупу — таксама. Алергія і на зерне, і на малочнае. Перыядычна п'ём антыгістамінныя прэпараты. Ці можна зрабіць яшчэ што-небудзь?

— У першую чаргу вы павінны весці харчовы дзённік, падрабязна запісваць, чым вы корміце дзіця і як на гэта рэагуе скура. Трэба ўстанавіць прадукты, якія прыводзяць да абвастрэння. Калі прадуктаў, якія выклікаюць рэакцыю, вельмі шмат, то тут ёсць верагоднасць, што з узростам дзіця зможа ўжываць усё. А для таго, каб канчаткова пераканацца, ці з'яўляецца той ці іншы прадукт алергенам, можна зрабіць даследаванне крыві...

— Мы рабілі. І аналіз пацвердзіў алергію на малочныя прадукты і пшаніцу...

— Калі так, то гэтыя прадукты давядзецца выдаляць з рацыёну.

— Але ж высыпае і на многае іншае. З каш засталіся толькі грэчка і рыс.

— Значыць, усе злакавыя давядзецца выключаць з рацыёну.

— А са знешнімі праявамі на скуры трэба неяк змагацца?

— Калі дастаткова будзе не ўключаць у рацыён прадукты-правакатары, то лячэнне не патрэбна. Калі ж праявы ўсё роўна будуць заставацца, то можна мець на ўвазе супрацьалергічныя прэпараты.

— Яе высыпае не тое каб толькі на шчочках, а амаль па ўсім целе, практычна ўся скура становіцца сухой...

— Калі яна не ўжывае прадукты, у дачыненні да якіх даказана павышаная адчувальнасць, праблема са скурай усё роўна застаецца?

— Ну, цалкам тыя ж малочныя прадукты мы не выдалілі. Тварожок ці ёгурт час ад часу даём...

— Калі ёсць лабараторнае пацвярджэнне, то выдаляць з рацыёну прадукты, якія выклікаюць алергію, трэба ўвогуле. А з цягам часу будзе бачна, ці можна зноў ужываць забароненыя прадукты...

— А што б вы параілі з вонкавых прэпаратаў для скуры?

— Фенісціл-гель, скін-кап, элідэл... Калі працэс распаўсюджаны, то патрэбныя таблетаваныя антыгістамінныя прэпараты.

— Мы кроплі давалі...

— Можна і кроплі. Той жа эрыус, зіртэк.

— У нас яшчэ капраграма звычайна не вельмі добрая... Ежа дрэнна ператраўліваецца. Можа, і з гэтым звязана алергія?

— Таму я і кажу, што, можа быць, дзіця перарасце гэтую сітуацыю. А пакуль параіць можна толькі адно — выдаленне з рацыёну прадуктаў-правакатараў.

— Яшчэ ў яе алергія на ўсе антыбіётыкі. Мы не можам дапіць да канца ніводзін з іх, — літаральна на трэці дзень на целе не застаецца жывога месца.

— Але не думаю, што алергія — на ўсе антыбіётыкі... Проста вашаму дзіцяці не варта лячыцца самымі распаўсюджанымі з іх — тымі, што з пеніцылінавай групы. Лекавая алергія развіваецца на тыя прэпараты, якія неаднаразова прымаліся.

— Але ж высыпкі ёсць не на паўторны, а на першы прыём...

— Значыць, пры наступнай неабходнасці ўжывання антыбіётыкаў паралельна трэба прымаць антыгістамінныя прэпараты. Калі вы будзеце цярплівай, думаю, справіцеся з праблемай.

— А з чым можа быць звязана сітуацыя множнай алергіі?

— Часцей такая праблема бывае ў дзяцей, якія маюць абцяжараную спадчыннасць. Сваю ролю іграе і тое, як працякала цяжарнасць, як доўга дзіця было на грудным выкормліванні, як часта мелі месца вірусныя захворванні. Такіх фактараў шмат.

☎— Стаўбцоўскі раён, Таццяна Станіславаўна. У дачкі — экзэма на руках. Надта абвастрылася. Не ведаем, што рабіць. Урач прапісаў нейкую мазь, фенкарол, сказаў рукі не мачыць.

— Трэба строга сачыць за харчаваннем, не ўжываць прадукты крайніх смакавых адчуванняў, выдаліць з рацыёну салёнае, вострае, кансерваванае, салодкае і газіраваныя напоі. Не дапускаць кантакту з раздражняльнымі фактарамі — высокімі і нізкімі тэмпературамі. Трэба прымаць антыгістамінныя прэпараты. Фенкарол можна прымаць не больш за 10 дзён. А пры экзэме такога кароткага ўздзеяння недастаткова. Таму лепей перайсці на прэпараты, якія можна прымаць працягла — кларыцін, эрыус, парлазін, тэлфаст. Іх можна прымаць і месяц, і два — у залежнасці ад неабходнасці. У перыяд абвастрэння выкарыстоўваюць гарманальныя мазі — адвантан, лакойд, прэднізалонавую мазь. Назіравшы вашай дачцэ трэба ў дэрматолага.

☎— Іўеўскі раён, Пётр Іванавіч. 66 гадоў. Пасля ўкусу пчалы ў месцы ўкусу — на шыі — усё стала жоўтым, пачаў задыхацца. Выратавала мяне хуткая дапамога. Як можна дапамагчы сабе ў такой сітуацыі?

— Па-першае, трэба імкнуцца пазбягаць сустрэч з восамі і пчоламі. Па-другое, летам заўсёды мець пры сабе супрацьалергічны прэпарат — ампулы супрасціну ці тавегілу. Па-трэцяе, спатрэбяцца і гарманальныя прэпараты — дэксаметазон ці прэднізалон, або, скажам, метылпрэднізалон ці медрол. А трэці прэпарат, неабходны ў такой сітуацыі, — адрэналін. Калі зноў будзе мець месца такі ўкус, трэба тэрмінова прыняць лекі і выклікаць хуткую. А яшчэ раю вам звярнуцца да алерголага ў Гродна.

— А дэмідрол, кажуць, дапамагае...

— Яго можна прыняць, калі не будзе пад рукой супрасціну ці тавегілу. Але ж аднаго дэмідролу мала. Тут усё ж такі размова ідзе пра цяжкую рэакцыю.

☎— Іўеўскі раён, Наталля. Я з дзяцінства пакутую ад алергіі на пылок раслін. Апошнім часам узніклі досыць сур'ёзныя ўскладненні. Раней быў насмарк, цяклі слёзы, была крапіўніца. А цяпер — бранхіяльная астма, ацёк носа, частыя прастудныя захворванні. Адчуваю, што алергія з'явілася на прадукты харчавання, многія лекі. Якія прэпараты можна прымаць?

— У перыяд абвастрэння хваробы патрэбна сімптаматычнае лячэнне — антыгістамінны прэпарат. Што вы прымаеце?

— Цэтрын.

— Можна і яго, калі дапамагае... Але ж бранхіяльная астма — захворванне хранічнае. Трэба звярнуцца да ўрача, бо калі ў вас ёсць прыступы ўдушша, трэба падключаць яшчэ і інгалятары. У выніку прымянення такіх неадкладных прэпаратаў як сальбутамол, бератэк хутка расшыраюцца бронхі. Патрэбны і лячэбныя, гарманальныя прэпараты, якія аказваюць выражанае супрацьалергічнае, супрацьзапаленчае дзеянне. Гэта прэпараты групы флютыказону, напрыклад, флексацыд, або камбінаваны прэпарат серытыд, ці сембікорт, або прэпараты бекламетазону. Але прызначыць іх павінен урач. Увосень трэба рабіць пробы і лячыцца алергенамі.

— А да якога ўрача звярнуцца?

— Да алерголага.

— У Іўеўскім раёне такога ўрача няма.

— Тады трэба звярнуцца ў Гродзенскую абласную бальніцу.

— Звяртацца па дапамогу можна толькі ўвосень?

— Можна і цяпер, пакольк вам трэба змагацца неяк і з прыступам абвастрэння.

— Мне бліжэй было б у Мінск пад'ехаць...

— Тады звяртайцеся да мяне, у 10-ю клінічную бальніцу, на базе якой працуе наша кафедра.

☎— Магілёў, Валянціна Уладзіміраўна. Унуку 2 гады, пакутуе ад алергіі. Дыета, якую яму прапісалі, — на ўсё жыццё, ці ён можа, як кажуць, перарасці?

— Можа перарасці, калі вы будзеце строга вытрымліваць прапісаную дыету.

— А ў Магілёве ёсць алерголаг?

— Ёсць.

— А чаму нас не накіроўвалі на абследаванне?

— Па-першае, у два гады скураныя пробы не робяцца. Толькі даследаванні крыві. Такія даследаванні робяць у Магілёве, куды вы павінны звярнуцца самі.

— Мы ляжалі ў дзіцячай пульманалогіі з-за праблем з дыханнем, і нас адтуль да алерголага не накіравалі... Нам выпісвалі кроплі парлазіну на паўгода. Іх не трэба адмяняць?

— Пакуль высыпкі застаюцца, трэба прымаць.

— Бывае, нічога няма, а потым раз — і абсыпала.

— Трэба добра сачыць за тым, што дзіця ўжывае, і не даваць яму прадукты, якія прыводзяць да абвастрэння. Трэба весці харчовы дзённік, куды запісваць усё, на што ёсць рэакцыя. Нельга дапускаць, каб скура так моцна рэагавала, бо хвароба можа прагрэсаваць.

— У якім узросце дзеці могуць перарасці алергію?

— Гэта індывідуальна, і ў вашай сітуацыі гаварыць пра гэта заўчасна. Пакуль трэба змагацца з ускладненнем — праблемай з дыханнем.

— На салодкае можа быць рэакцыя?

— Нельга даваць дзіцяці салодкае, ад якога прагрэсуе хвароба.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

Вяртаючыся да надрукаванага

«Значна павялічыліся выдаткі па вытворчасці поліэтылену высокага ціску...»

20 красавіка ў «Звяздзе» пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» быў змешчаны матэрыял «Чаму падаражэла плёнка для парніка? І ў чым тут «сакрэт»?» Нагадаем, наша пастаянная чытачка папрасіла дапамагчы разабрацца, чаму сёлета, у параўнанні з мінулай вясной, так істотна — больш чым у 1,5 раза — падаражэла айчынная плёнка.

Вытворцам, са слоў прадаўцоў на сталічным Камароўскім рынку і «Ракаўскім кірмашы», заяўніца называла наваполацкі завод «Палімір». Прадаўцы і тлумачылі пакупнікам, што менавіта завод падняў адпускную цану. Ці так гэта насамрэч, прасіла ўдакладніць чытачка, бо набыццё той плёнкі для парніка стала для канкрэтнай сям'і адбівацца на кішэні: калі летась плацілі за яе 40 тысяч рублёў, дык сёлета мусілі ўжо 70 тысяч...

Аператыўна атрымаць інфармацыю на заводзе нам не ўдалося. Тры дні перамоў з сакратаркамі ў прыёмных і некаторымі кіруючымі работнікамі нічога па сутнасці не далі, у выніку ад нас запатрабавалі пісьмовы запыт. Што і было рэдакцыяй зроблена.

У афіцыйным рэагаванні на яго **дырэктар завода «Палімір» ААТ «Нафтан» Алег ЖЭБІН** паведаміў наступнае.

«Завод «Палімір» ААТ «Нафтан» не з'яўляецца манапалістам па вытворчасці поліэтыленавай плёнкі на рынку Рэспублікі Беларусь. Поліэтыленавая плёнка вытворчасці завода ў асноўным рэалізуецца ў паўночна-ўсходнім рэгіёне Рэспублікі Беларусь. У Мінскім жа рэгіёне разам з плёнкай завода «Палімір» прысутнічае плёнка вытворчасці ААТ «Барысаўскі завод пластмасавых вырабаў», ААТ «Магілёўскі завод штучнага валакна», РУП «СПА «Хімвалакно» г. Светлагорска і значнай колькасці малых прадпрыемстваў.

Цана на поліэтыленавую плёнку вытворчасці завода «Палімір» ААТ «Нафтан», згодна з дзейным прэйскурантам, з 1 красавіка 2010 года складае 4 536 000 рублёў за тону без ПДВ. Рост цаны ў адносінах да той, што дзейнічала ў студзені 2009 года, склаў 24,5 працэнта. 79 працэнтаў у выдатках па вытворчасці плёнкі займае поліэтылен высокага ціску (ПЭВЦ). Сыравінай для ПЭВЦ з'яўляецца вуглевадародная сыравіна, што атрымліваецца пры перапрацоўцы нафты. Кошт нафты, які імкліва павялічыўся з-за ўвядзення мытных пошлін пры экспарце яе з Расіі ў пачатку 2010 года, павялічэнне з 15 лютага тарыфаў на энергетыку і стаўкі ПДВ да 20 працэнтаў значна павялічылі выдаткі па вытворчасці поліэтылену высокага ціску і прывялі да стратнасці вытворчасці плёнкі.

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 285 ад 19 мая 1999 года, завод «Палімір» ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку падаў на рэгістрацыю дакументы па павелічэнні цаны на плёнку да бясстратнага ўзроўню. Прапанаваныя цэны былі ўзгодненыя на пасяджэнні камісіі па ўзгадненні цэнаў у канцэрне «Белнафтахім» 17 сакавіка (паведамленне № 62 ад 17.03.2010 г.)».

Як бачна, хоць і не так аператыўна, як таго хацелася б заяўнікам, аднак «сакрэт» (і ўвесь механізм) падаражання плёнкі для парнікоў сталі вядомымі нашым чытачам...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Культуролаг Юлія ЧАРНЯЎСКАЯ:

Асоба

«ЭТНАС МОЖА ЖЫЦЬ У ПЯЧОРЫ, НАЦЫЯ — НІКОЛІ»

ЮЛІЯ Чарняўская. Яе дзядуля пісаў для дзяцей і доўгі час узначальваў «Вясёлку». Яе муж стварыў беларускі інфармацыйны партал tut.by. Дачка заканчвае факультэт філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Маці, жонка і ўнучка. Тры якасці. Тры гісторыі. Але ёсць яшчэ. Юлія Чарняўская як культуролаг і пісьменнік. Пра іх і пагаворым.

— У сваёй апошняй кнізе «Беларусы: ад «тутэйшых» да нацыі» вы карыстаецеся цікавай формай аповеду: дасавецкі час перадаяце праз казкі, савецкі — праз ліставанне, наш час адлюстроўваеце праз блогі. Як прыйшла ідэя такога ўвасаблення тэмы?

— У многіх краінах даўно існуе такі навуковы кірунак, як даследаванне штодзённасці. Ён бярэ пачатак ад французскай «Школы Аналаў», або школы ментальнасці. У Беларусі такіх даследчыкаў мала, і часам яны нават не ведаюць адзін пра аднаго. А ва ўсім свеце накірунак вельмі развіты. Даследаванне штодзённасці: як жылі, як любілі, што елі, што лічылі нормай. Гэтыя ўстаноўкі ўзнікаюць міжволі, мы не звяртаем на іх увагі, мы іх не ведаем, пакуль не сустрэнемся з іншымі нацыямі і не супаставім лад жыцця. Штодзённасць становіцца відавочнай у тэкстах культуры. Ні ў чым больш. Прычым у тэкстах «інтымных», тэкстах, прызначаных для сябе і для блізкіх

Я спачатку займалася фальклорам — сацыяльна-бытавымі казкамі. У мяне нават кніга па казках выйшла. Гадоў пяць я чытала казкі і рабіла на іх карткі, а пасля за тры месяцы напісала кнігу. Мне хацелася як найхутчэй распавесці пра людзей, якіх я там — у гэтых казках — сустрэла.

Пасля быў аналіз прыватнай перапіскі. Руская даследчыца Наталля Казлова ў кнізе «Савецкія людзі» спрабавала зразумець, хто такі савецкі чалавек — ахвяра ці пераможца, кім ён быў і як жыў. Аб'ектыўна, без т. зв. «стыгмы». Яе кніга мяне вельмі ўразіла. Менавіта там я ўпершыню даведалася пра методыку чытання чалавечых дакументаў.

Што гэта такое? Лісты, дзённікі, жыроўкі, квітанцыі, паштоўкі... Дакументы штодзённасці. У Казловай, напрыклад, эпоха адлюстраваная праз дзённік жанчыны з трыма класамі адукацыі. Той жа шлях «чытання чалавечых дакументаў» абрала і я, аналізуючы лісты, а пасля і блогі. Пытанняў і не ўзнікала, што браць — блогі ці форумы. На форумах жыве прынцып «давай па мордзе дам», у блогах людзі аргументуюць свае думкі.

— У Беларусі прынята лічыць, што нацыя — гэта народнасць са сваёй тэрыторыяй, сімволікай і самасвядомасцю, галоўным з крытэрыяў якой ёсць мова. Як лічыце вы?

— Гэты тэзіс узнік у XIX ст. — збольшага тады гэта было праўдай. XX стагоддзе ўсё змяніла. Мяне заўсёды раздражняла, калі ў пачатку 90-х казалі, што ў беларусаў няма самасвядомасці. Думка грунтавалася на тым, што людзі размаўляюць па-руску. Я ў гэта не верыла. Хоць бы таму, што часта сама размаўляла па-руску, але заўсёды лічыла сябе беларускай. У XX ст. двухмоўных і трохмоўных нацый не менш, чым аднамоўных. Тым не менш людзі ў гэтых краінах ўспрымаюць сябе як адзіную нацыю. Узяць хоць бы швейцарцаў. У іх чатыры мовы, але паспрабуй сказаць, што яны не нацыя?! Мова — гэта важная рэч, але падчас станаўлення нацыі. Важная, але не адзіная.

Наогул монаэтнічных нацый сёння практычна не існуе. Іх ёсць сем ці дзесяць — ісландцы, палякі, ізраільцяне, армяне і інш. У большасці ж нацыі поліэтнічныя. Іншае пытанне, на якой мове яны размаўляюць. Людзі павінны абавязкова валодаць дзяржаўнымі мовамі. На якой размаўляць — іх права, а ведаць павінны абедзве. Калі да цябе звяртаюцца па-беларуску, адказаць ты павінен па-беларуску, калі па-руску, то і адказвай па-руску — гэта правілы прыстойнасці.

Наша самасвядомасць была б няпоўнай, калі б мы не адчувалі сябе грамадзянамі незалежнай краіны. Этнас можа жыць у пячоры, нацыя — толькі як сацыяльна-палітычная грамадзянская супольнасць. І калі я чытала блогі, я ўбачыла, што людзі сябе такім грамадствам усведамляюць. Каля 20 працэнтаў насельніцтва ў нас не этнічныя беларусы, але яны — грамадзяне Беларусі і, выязджаючы за мяжу, называюць сябе беларусамі. Мы — поліэтнічная білінгвістычная нацыя. Як і многія іншыя ў Еўропе.

— «Тутэйшасць» звычайна ўспрымаецца як з'ява, якая знікае развіццю. На вашу думку, ці ёсць у «тутэйшасці» дадатныя бакі?

— Тутэйшасць уласцівая не толькі беларусам. У тых жа эстонцаў былі свае тутэйшыя, ды і ў каго іх не было? У Расіі да XX стагоддзя сяляне збольшага таксама былі тутэйшымі. Але так можа жыць этнас, а нацыя звязаная ў першую чаргу з гарадской цывілізацыяй. Нацыя звязаная з эканомікай, палітыкай і г.д., а этнічная тутэйшасць — з аграрнай цывілізацыяй. Таму тутэйшасць у сэнсе «давайце жыць сваім маленькім герметычным колам, мы ўсіх тут ведаем» якраз і перашкаджае развіццю нацыі і культуры. З часоў тутэйшасці ёсць у беларусаў адна вельмі добрая рыса — інтэлігентнасць. Гэта значыць — «не грузіць» сабой субяседніка. Але ёсць тут і іншы бок: «Я ціхі і памяркоўны. Не выстаўляйся, не лезь» — гэта мы ўвабралі з малаком маці. У сваёй кнізе я апісвала якраз такога чалавека, які кожны дзень ходзіць з намі па вуліцах, стаіць у чарзе і ціснецца ў тралейбусе. Бо хто пра яго напіша? Вось я і напішу. Пры ўсіх добрых якасцях гэты чалавек не любіць, калі хтосьці побач выстаўляе сябе і пазіцыянуе вельмі ярка.

Валянцін Акудовіч — адбітак Сымона Буднага

— Ваша стаўленне да новых беларусаў?

— А хто гэта? Новыя «беларускія рускія»? (*смяецца* — **Аўт.**). Як бы іх няшмат, і я з імі ніяк не стасуюся. А вось тое пераможнае царства гламуру, якое прыйшло ў беларускую культуру, гэта страшна. Убога, бяздарна і вельмі брыдка. Але ў маім свеце гэтага няма. У маім свеце ёсць універсітэт культуры, і мае суразмоўцы — напрыклад, пісьменнікі і навукоўцы. Мама, дачка, муж і сябры. Сабака. А цяпер і вясна. У маім свеце існуе проза, якую я пішу, і навука, якой займаюся. Усё астатняе за кадрам.

— У які перыяд станаўлення беларускай нацыі вы хацелі б жыць?

— Як цікава: нядаўна, калі мы з маімі гасцямі на TV.tut.by (там я вяду перадачу «Без адказаў») размаўлялі пра Савецкі Саюз, нам задалі якраз такое ж пытанне. Мы хорам працытавалі Аляксандра Кушнера: «Времена не выбирают, в них живут и умирают(...) Время — это испытанье, не завидуй никому». Я б хацела жыць у свой час.

— У сучасных фільмах героі розных эпох падарожнічаюць у вымярэннях і перамяшчаюцца ў розныя стагоддзі. Калі паразважаць і перанесці якіх-небудзь дзеячаў Беларусі мінулых стагоддзяў у наш свет і наадварот, каго б вы выбралі?

— Ведаеце, ёсць літаральныя адбіткі людзей. Валянцін Акудовіч, на мой погляд, гэта такі адбітак Сымона Буднага. Будны — адна з самых для мяне знакавых фігур у беларускай гісторыі. З Акудовічам я незнаёмая, але ён выклікае ў мяне цікавасць і павагу — за цвёрдую і глыбокую выццёвую і творчую пазіцыю. І за талент. Верагодна, і Сымон Будны паводзіў бы сябе ў нашым часе, як Валянцін Акудовіч. Што датычыць дзяржаўных дзеячаў, то, думаю, наўрад ці хтосьці з сучаснай Беларусі адчуў бы сябе ўтульна ў іншым вымярэнні — кожны з іх стваraў свой час.

Яшчэ б я перанесла сюды Купалу, Багдановіча і Караткевіча. Інтэлігенцыя вышэйшага пілатажу зараз вельмі запатрабаваная. А гэтыя прозвішчы для беларусаў — сімвалы, легенды. Сёння, калі з'яўляюцца таленавітыя паэты і празаікі, яны мала каму патрэбныя як пісьменнікі. Ад іх чакаюць нечага яшчэ. Відаць, той місіі, якая б зрабіла з пісьменніка легенду. На вялікі жаль, часам здаецца, што ўсё меншая колькасць людзей гэтага чакае. І так не толькі ў нас — увесь свет ідзе ад працэсу ператварэння інтэлігенцыі ў інтэлектуалаў, а інтэлектуалаў — у «белыя каўнерыкі»...

— У сувязі з гэтым дадатковае пытанне — з кім з выбітных асобаў (акрамя Сымона Буднага) вы хацелі б пазнаёміцца?

— Шмат з кім. Я люблю Скарыну. З яго, па вялікім рахунку, і пачалася беларуская інтэлігенцыя. Сустрэлася б і з Агінскім — цікава даведацца, што ім рухала, калі ён спрабаваў дамовіцца з царом Аляксандрам аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах Расійскай імперыі. Але найбольш даспадобы мне фігуры рубяжа XIX—XX стст. — Луцкевіч, напрыклад. Увогуле я прыхільнік такой установкі, якая іх усіх аб'ядноўвае: мне падабаюцца людзі, якія думаюць пра штосьці і пра кагосьці яшчэ, апроч сябе.

Фота Ягора ВОЙНАВА.

ТОП-9 ДЛЯ ЮЛІІ ЧАРНЯЎСКАЙ:

1. Любімае беларускае слова?

— Дзядуля...

2. Любімая кніга?

— Ёсць шмат кніг лепшых, але самая мая, па-чалавечы любімая — «Забіць перасмешніка» Харпер Лі . З шасці гадоў і да сёння.

3. Любімае месца ў Мінску і ў Беларусі?

— Аляксандраўскі сквер і вуліца К. Маркса, бо там прайшло маё дзяцінства. У Беларусі вельмі люблю Браслаўскія азёры.

4. Дадатная і адмоўная якасць беларуса?

— Унутраная інтэлігентнасць і самаіронія — дадатныя. Адмоўная — боязь перамен.

5. Любімы блог?

— Іх некалькі: «diim-august», «hareuski», «vadzim i_z»,,,

6. Прыклад інтэлігентнасці для вас?

— У рускай культуры — Юры Лотман і Ліліяна Лунгіна, у беларускай культуры — Радзім Гарэцкі, Гурый Барышаў, сучасны паэт Канстанцін Міхееў. А ўвогуле, мой вобраз ідэальнага інтэлігента для мяне — мой дзед...

7. Любімае беларускае імя?

— Алесь і Данута. А маю дачку завуць любімым рускім — Яўгенія.

8. Якую кнігу ў 3D-фармаце хацелі б паглядзець?

— Аўтар адзін — Жазэ Сарамага. А вось кнігі дзве — «Евангелле ад Ісуса» і «Перабоі ў смерці». Слаба веру, што іх можна экранізаваць. Але калі надарыцца, відовішча будзе велічнае.

9. Калі б не культуралогія, то якая сфера дзейнасці?

— Я хацела стаць урачом, як мае бацькі. Другі варыянт — шматдзетнай маці. Трэці варыянт — няспраўджаны, пра яго змаўчу.

Гісторыя — пытанне выбару версій

— Калі я прачытала беларускія казкі, то зразумела адну цікавую рэч: беларус па натуры метафізік. Гэта было дзіўна, бо да гэтага я жыла ў коле стэрэатыпаў: беларус — прагматычны, зямны, далёкі ад высокіх матэрый. А тут убачыла: кожны крок беларускага селяніна звязаны з пэўнымі філасофскімі разважаннямі. Яны як падмурак яго штодзённасці, таго самага прагматызму. Для мяне гэта было адкрыццём.

Што яшчэ? Ёсць этнасы славесныя, а ёсць больш візуальныя. Мы — больш візуальная нацыя. Паглядзіце, як цікава рэалізуюцца беларусы ў жывапісе і дэкаратыўным мастацтве. Адзінай загадкай у сувязі з гэтым для мяне застаецца развіццё кінематографа ў сучаснай Беларусі...

— У адным з інтэрв'ю вы ўзгадалі пра ідэю беларускага нацыянальнага міфа...

— Без міфаў увогуле нічога няма, любая гісторыя ў значнай ступені міф. Некаторыя з сучасных французаў шчыра перакананыя, што ў вайне 1812 года перамог Напалеон. Гісторыя — гэта пытанне выбару версій. Поўнасцю вярнуць рэальнасць немагчыма, таму мы заўсёды гуляем з міфам. У сваёй кнізе я пералічыла сем варыянтаў беларускай гісторыі... Ёсць там і пра ліцвінаў, і пра беларусаў, і пра крывічоў, і пра так званых «саўкоў»...

— Самае вялікае ваша адкрыццё падчас напісання кнігі?

— Яно прыйшло не ў час напісання кнігі. Гэта было ў пачатку 1990-х. Я ішла па вуліцы з сябрамі, якія збіраліся ў эміграцыю. Мы якраз абмяркоўвалі гэтае пытанне: на дварэ разруха, грошай няма і не будзе, кватэры няма і «не свеціць», а ў мяне маленькае дзіця... Гэта быў перадкалядны час, і якраз насупраць я ўбачыла калядоўшчыкаў: былі там і зорка, і каза, і мядзведзь, і цыганка, у якую быў пераапрануты юнак... Усё гэта было новым для нас, мы прывыклі яшчэ лічыць сябе савецкімі людзьмі. Была там баба, быў мужык. І я ўбачыла на гэтым «мужыку» строй — ільняную кашулю з акуратненькімі латкамі. І так яны разанулі па сэрцу... Я падумала: нікуды я адсюль не паеду.

Гутарыў Ілья ЛАПАТО.

Наш культурны асяродак

ЖЫРАНДОЛЯ

Выпуск № 5 (91)

ЧАСОПІС «НЁМАН»: СПАДЗЯВАННІ І ЗДЗЯЙСНЕННІ

Ужо амаль год на чале рэдакцыйнага калектыву часопіса «Нёман» — паэт і празаік (а па сумяшчальніцтве яшчэ і літаратурна-выдавецкі чыноўнік, пакольке адначасова з'яўляецца першым намеснікам дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва») Алесь Бадак. Наколькі, на яго ўласны (разумела, суб'ектыўны) погляд, гэты час быў цікавы для чытачоў штомесячніка, даведаемся з нашай размовы з пісьменнікам.

— «Нёман» сёння — гэта часопіс, які прадстаўляе перш-наперш рускую літаратуру Беларусі?..

— Калі 65 гадоў таму было прынята рашэнне аб выданні нашага часопіса (спачатку, праўда, гэта быў альманах, які называўся «Советская Отчизна»), то перад ім ставіліся дзве задачы: па-першае, друкаваць пераклады лепшых твораў сучаснай беларускай літаратуры і, па-другое, друкаваць лепшыя творы пісьменнікаў Беларусі, якія пішуць менавіта па-руску. Хачу акцэнтаваць увагу на слове «лепшыя», пакольке, меркавалася, што іх адрасатам будзе не толькі беларускі чытач, але і ўсесаюзны, і, па магчымасці, еўрапейскі. Вядома, з таго часу шмат што змянілася і ў лёсе нашай краіны, і ў лёсе нашай літаратуры. Але калі сёння на прасторах былога Саюза ці нават за межамі яго ў літаратурных перыядычных выданнях з'яўляюцца творы пісьменнікаў з Беларусі, то вельмі часта гэта адбываецца дзякуючы нёманаўскім публікацыям. Апроч таго, вось ужо год як «Нёману» перададзены клопаты часопіса «Всемирная литература», дзякуючы чаму мы рэгулярна друкуем творы замежных пісьменнікаў. Ёсць у нас і рубрыка «Сябрына», прысвечаная літаратурам народаў СНД.

— Калі гаварыць пра ўжо зробленае ў апошні час, то чым, якімі творамі і імёнамі вылучаецца выданне?

— Мы надрукавалі дасюль невядомую шырокаму чытачу аповесць Уладзіміра Караткевіча «Перадгісторыя». І гэта супала з тым, што сёлета ж год караткевічаўскі — год 80-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Сямёнавіча... Сёлета друкаваліся раманы «Князь Мсціслаўскі» Алега Ждана і «Гэты салодкі голас Сірэны» Алены Паповай — адных з лепшых нашых празаікаў, якія пішуць на рускай мове і часта публікуюцца і ў расійскіх часопісах. Дарэчы, часы і падыходы мяняюцца відавочна. Літаральна следам за часопіснай публікацыяй раман Алега Ждана ўбачыў свет асобнай кнігай. І, наколькі я ведаю, разышлася ўжо большая частка тыражу. У нас былі надрукаваны аповесці «Нічные» Андрэя Федарэнкі і «Тата» Адама Глобуса — адных з самых папулярных сёння беларускіх пісьменнікаў не толькі ў сваім пакаленні. Мы часта забываем, што тыя пісьменнікі, каму сёння за сорак, каму ўжо пяцьдзесят, — гэта творцы, на якіх ляжыць асноўная адказнасць за лёс літаратуры. Творцы, якія сваімі раманамі, аповесцямі, п'есамі, вершамі фарміруюць чытацкае ўяўленне пра сённяшні стан прыгожага пісьменства. Так было заўсёды. У дваццаць восем гадоў Кузьма Чорны ўжо быў аўтарам рамана «Зямля», у 32 гады — аўтарам рамана «Бацькаўшчына», у 35 напісаў «Трэцяе пакаленне». Саракагадовы Іван Мележ ужо меў сваіх «Людзей на балоце», сарокатрохгадовы Іван Шамякін — «Сэрца на далоні», а «Глыбокую плынь» напісаў увогуле ў 28. Таму, лічым, нам трэба больш увагі надаваць сярэдняму пакаленню, яно, на жаль, недаацэнена крытыкай, а праз яе, у пэўнай ступені, і чытачамі. Можа быць, скажу і такое — трэба дапамагаць таленту рэалізавацца. Не баяцца рызыкаваць з творчага пункту гледжання. Хоць, безумоўна, старонкі «Нёмана» адкрытыя для ўсіх пакаленняў сучасных айчынных пісьменнікаў. Абы гэта было цікава напісана, на тым ці хоць бы прыкладна на тым узроўні, які нам дэманструюць сваімі творамі Раіса Баравікова і Алесь Разанаў, Юрый Сапажкоў і Аляксей Дудараў... Увогуле, усім нашым літаратурным выданням трэба старацца высока трымаць планку, якая дапамагае шэрыя, нецікавыя публікацыі аддзяліць ад арыгінальных. Калі мы друкуем відавочна слабы твор, мы дапамагаем аднаму чалавеку — яго аўтару, але кідаем цень на ўсю сучасную айчынную літаратуру. Пакольке тыражы беларускіх кніг, як правіла, не вельмі вялікія, і колькасць прададзеных кнігарнямі экзэмпляраў не заўсёды з'яўляецца прамым сведчаннем іх папулярнасці ці, наадварот, непапулярнасці, мы ў сваіх ацэнках арыентуемся на нашы бібліятэкі: што чытаюць, каго чытаюць. І я хачу сказаць, што вынікі такіх «даследаванняў» часам вельмі разыходзяцца з тым, што, здараецца, любяць гаварыць і пісаць пра сябе самі некаторыя нашы пісьменнікі. Хоць мушу зрабіць адну агаворку: папулярны твор і выдатны твор — не абавязкова паняцці-сінонімы. І мы гэта таксама ўлічваем у сваёй працы.

— Алесь Мікалаевіч, вяртаючыся да тэмы юбілейнага караткевічаўскага года... Ці стане яшчэ чым-небудзь заўважнай гэтая падзея для чытачоў «Нёмана»?

— Пра аповесць «Перадгісторыя» я ўжо сказаў. Магчыма, што ў лістападаўскім нумары надрукуем невядомыя апавяданні Караткевіча. Хоць, па шчырасці, я іх яшчэ не бачыў, толькі ведаю, што яны ёсць, існуюць... Але мы ўжо думалі пра інтэрв'ю з людзьмі, хто яго блізка ведаў. Каб нават той, хто чытаў выдатную аповесць-эсэ «Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча» Адама Мальдзіса, адкрыў для сябе нешта новае ў гэтым цудоўным творцы. Пасля яшчэ і аглядаем, ці ўсё з яго вядомых празаічных твораў перакладалася на рускую мову.

— Сённяшняя літаратурна-мастацкая перыёдыка вызначаецца ўвагай да гісторыка-дакументальных, гісторыка-публіцыстычных публікацый. Як складваецца з гэтым сітуацыя на старонках «Нёмана»?

— Адна з самых папулярных нёманаўскіх рубрык — «Успаміны. Дзённікі. Дакументы», без якой абыходзіцца рэдка які нумар. Летась альбо ў першыя месяцы гэтага года пад ёй мы друкавалі стэнаграмы творчых вечароў Васіля Быкава, лісты ваенных гадоў Васіля Віткі, размовы Кірыла Мазурава і Панцеляймона Панамарэнкі, біяграфічны нарыс Міхаіла Бубліева пра Міхаіла Зімяніна. У бліжэйшы час з'явіцца ваенны дзённік Міколы Лобана, дакументальная аповесць Міхася Міцкевіча, сына Якуба Коласа, пра свайго брата Юрку, што загінуў на фронце, успаміны жонкі Івана Мележа Лідзіі Якаўлеўны, успаміны ўнучкі Кандрата Крапівы Алены Ігараўны Атраховіч.

— Аглядаючы апошнія нумары часопіса, чытач адзначае, што вы шмат друкуеце замежнай літаратуры ў перакладзе на рускую мову...Гэтыя пераклады зроблены спецыяльна для «Нёмана» ці з'яўляюцца перадрукамі?

— Безумоўна, пераклады зробленыя спецыяльна для «Нёмана». Зразумела, у гэтым плане нам бывае цяжкавата, бо расійскія выданні і выдавецтвы таксама не спяць у шапку і імкнуцца найхутчэй заключаць дамовы з вядомымі замежнымі аўтарамі. Але вось неяк размаўляў з галоўным рэдактарам «Иностранной литературы» Аляксандрам Лівергантам, дык аказалася, што ў іх няма перакладчыкаў, якія маглі б індыйскія літаратуры перакладаць з арыгіналу, а не, напрыклад, з англійскай. А ў нас у Беларусі такіх двое! Ёсць каму перакладаць з англійскай, французскай, італьянскай, венгерскай, балгарскай... Хоць, безумоўна, нам трэба «вырошчваць» новых перакладчыкаў, стварацца сваю перакладчыцкую школу. Дзеля гэтага міністэрства інфармацыі краіны тры папярэднія гады адкрывала Дзень беларускага пісьменства «круглым сталом» «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», заснаваным пры ўдзеле рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва» і часопіса «Нёман». За гэты час у Беларусь па запрашэнні міністэрства інфармацыі прыязджалі пісьменнікі Сербіі, Чарнагорыі, Літвы, Расіі (і не толькі з Масквы і Санкт-Пецярбурга, але і з Удмуртыі, Татарстана, Екацярынбурга, Волагды), Таджыкістана, Казахстана, Польшчы. І літаральна з усімі з іх наладжаны добрыя стасункі... А яшчэ акно майго кабінета выходзіць на лінгвістычны ўніверсітэт, які размешчаны цераз дарогу ад нашай рэдакцыі. Я заўсёды глядзу на яго са спадзяваннем, таму што там вучацца і выкладаюць нашы патэнцыяльныя перакладчыкі.

Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.

УСМЕШКІ ДОРЫЦЬ НАМ ВЯСНА

ЧЫМ ярчэй сонца, тым больш колераў і ўсмешак расцвітае і ў душы, і на вуліцах. Аднак сонечнымі бываюць не толькі дзянькі — ёсць такія і людзі. Менавіта адным з іх з'яўляецца даўні аўтар «Звязды» мастак-карыкатурыст Марына Гарэлава. Яе персанальная выстава, якая нядаўна адкрылася ў Міжнародным цэнтры інтэграцыйнай інфармацыі грамадскага прэс-цэнтра Дома прэсы, так і называецца «Усмешкі дорыць нам вясна».

Графічныя работы ілюструюць нашу рэчаіснасць з розных бакоў. Дасціпныя сюжэты і пацешныя кампазіцыі ствараюць адмысловую атмасферу нязмушанага гумару, абуджаюць думку і ўзнімаюць настрой. Энергічная лінія і смелы штрых дапамагаюць дакладна перадаць характары герояў, іх стан. А ўмелае выкарыстанне акварэлі і пастэлі ўзмацняе яркасць выяў, надае работам вясновую жвавасць і сакавітасць.

Як мастак-карыкатурыст Марына Гарэлава супрацоўнічала больш чым з 30 перыядычнымі выданнямі. Сотні яе малюнкаў былі апублікаваныя на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў. Яна аўтар 3-х альбомаў карыкатур. Ведаюць работы Марыны і за межамі Беларусі: яна ўдзельнічала ў шматлікіх міжнародных выставах і фэстах у Італіі, Бельгіі, Польшчы, Балгарыі, Сербіі, Іране. З'яўляецца пераможцам нацыянальнага конкурсу карыкатур ў галіне эканомікі і фіналістам міжнародных конкурсаў у Бельгіі, Сербіі і Балгарыі.

Ганна ЦІМАШЭНКА.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА:

**«Бизнес-центр по ул. М. Танка. 1 этап строительства.
Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями административного, общественно-бытового назначения и подземным гаражом-стоянкой»**

Совместное общество с ограниченной ответственностью «ИТЕРАБЕЛСТРОЙ» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

Информация о застройщике:

Застройщик – СООО «ИТЕРАБЕЛСТРОЙ» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 22 апреля 2004 года № 846 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 800003891.

Адрес застройщика: 220103, г. Минск, ул. Калиновского 77А, ком. 310, тел. (017) 283 95 69, факс (017) 287 66 68, моб. тел. (029) 270 04 31.

Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.00, обед с 12.00 до 12.45, выходные дни – суббота, воскресенье.

В 2003 – 2008 гг. СООО «ИТЕРАБЕЛСТРОЙ» реализован ряд проектов по строительству жилой и коммерческой недвижимости в районе поселка «Медвежино» г. Минска.

Функции заказчика осуществляются собственными силами, имеется лицензия на осуществление функций технического надзора (специальное разрешение (лицензия) Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I-го и II-го уровней ответственности и проведение инженерных изысканий для этих целей» № 02200/1037057, действительное до 05.02.2012 г.).

Информация о проекте строительства:

Цель строительства – строительство многоквартирного двухсекционного 32-этажного 204-квартирного жилого дома повышенной комфортности со встроенно-пристроенными помещениями административного, общественно-бытового назначения и подземным гаражом-стоянкой, являющегося 1 этапом строительства объекта «Бизнес-центр по ул. М. Танка».

Земельный участок для строительства жилого дома предоставлен застройщику во временное пользование на период строительства жилого дома, составляет 1,5725 га и ограничен:

- с севера и востока – ул. Тимирязева;
- с юга – ул. Кальварийская;
- с запада – территория обувной фабрики «Луч».

Информация об объекте долевого строительства:

32-этажный, 2-секционный, 204-квартирный жилой дом повышенной комфортности со встроенно-пристроенными помещениями административного, общественно-бытового назначения и подземным гаражом-стоянкой.

Высота жилых помещений – 3,0 метра.

Подземный гараж-стоянка на 203 автомобиля и автостоянка на 3 машино-места во дворе жилого дома.

Встроенно-пристроенные помещения административного и общественно-бытового назначения, расположенные на 1-4 этажах жилого дома с отдельными входами.

Высота административных помещений – 3,6 метра.

Проектом предусмотрены все виды инженерного обеспечения.

Подъезд к жилому дому запроектирован с улицы Тимирязева по тупиковому проезду, заканчивающемуся кольцевой разворотной площадкой с островком диаметром 16 метров.

Въезд-выезд в подземный гараж-стоянку организуется со стороны улиц Тимирязева и Кальварийской.

Внутри территории жилого дома предполагается размещение двух детских площадок.

После выполнения строительно-монтажных работ вся прилегающая территория жилого дома будет благоустроена (площадки для отдыха, детские игровые площадки).

Каркас жилого дома – монолитный рамно-связевый железобетонный с плоскими безбалочными перекрытиями толщиной 180 мм.

Наружные стены жилого дома – из газосиликатных блоков толщиной 400 мм, с поэтажным опиранием на перекрытия и утеплением навесными панелями заводского изготовления.

Наружная отделка жилого дома – вентилируемый фасад с облицовкой плиткой керамической «Керамогранит», облицовка стальными панелями с полимерным покрытием, фасадное остекление (непрозрачных участков) из закаленного стекла.

Внутренняя отделка жилого дома (места общего пользования) – декоративная штукатурка, покраска акриловыми и водно-дисперсионными красками, облицовка керамической плиткой.

Каждая секция жилого дома оснащена тремя лифтами грузоподъемностью 800 кг и мусоропроводом.

Состав общего имущества, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода в эксплуатацию объекта: места общего пользования жилого дома, технические помещения.

Жилые помещения:

Все квартиры жилого дома расположены на 5–30 этажах, имеют остекленную лоджию или балкон.

На 31-м и 32-м этажах жилого дома расположены двухуровневые пентхаусы с открытыми террасами на 31-м этаже.

Согласно Указу Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396 (в редакции Указа от 31.01.2008 г. № 55) для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагается 81 (восемьдесят одна) квартира, 195 (сто девяносто пять) машино-мест в автоматизированном парковочном модуле в подземном гараже-стоянке стоимостью по состоянию на 3 мая 2010 года:

- 22 (двадцать две) однокомнатные квартиры общей площадью по проекту от 60,77 кв.м до 61,97 кв.м стоимостью 6 511 110 (шесть миллионов пятьсот одиннадцать тысяч сто десять) рублей за 1 кв.м;
- 10 (десять) двухкомнатных квартир общей площадью по проекту 83,43 кв.м стоимостью 6 511 110 (шесть миллионов пятьсот одиннадцать тысяч сто десять) рублей за 1 кв.м;
- 36 (тридцать шесть) трехкомнатных квартир общей площадью по проекту от 94,32 кв.м до 148,96 кв.м стоимостью 6 511 110 (шесть миллионов пятьсот одиннадцать тысяч сто десять) рублей за 1 кв.м;
- 13 (тринадцать) четырехкомнатных квартир общей площадью по проекту от 176,60 кв.м до 179,68 кв.м стоимостью 6 511 110 (шесть миллионов пятьсот одиннадцать тысяч сто десять) рублей за 1 кв.м;
- 195 машино-мест в автоматизированном парковочном модуле в подземном гараже-стоянке стоимостью 74 022 220 (семьдесят четыре миллиона двадцать две тысячи двести двадцать) рублей.

Строительная готовность жилых помещений:

- штукатурка стен, бетонная подготовка под полы, цементно-песчаная стяжка, гидроизоляция полов в санузлах без окраски стен и потолков;
- электроснабжение – поквартирная черновая разводка электропроводки с установкой электросчетчиков и выводом на кухне для подключения электроплиты;
- вентиляция – приточно-вытяжная;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, установка и подключение унитаза;
- канализация – стояки с поквартирной разводкой трубопроводов к приборам;
- отопление – водяное, с установкой поквартирных счетчиков учета тепла;
- телефонизация, радиофикация, телевидение – поквартирная черновая разводка;
- поэтажная разводка для подключения к центральному кондиционированию.

Нежилые помещения (административные, торгово-бытового обслуживания):

Все нежилые помещения жилого дома расположены в нижней надземной 4-этажной встроенно-пристроенной части, обеспеченные самостоятельными входными группами, вестибюлями и лестничными клетками.

В центральном вестибюле общественной зоны расположен панорамный лифт и открытая лестница, соединяющая между собой четыре уровня общественных помещений.

Согласно Указу Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396 (в редакции Указа от 31.01.2008 г. № 55) для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 81 (восемьдесят одно) административное и торгово-бытовое помещение расположенные в нижней надземной 4-этажной встроенно-пристроенной части жилого дома площадью:

1 этаж – от 4,17 кв.м до 260,48 кв.м;
2 этаж – от 12,47 кв.м до 265,52 кв.м;
3 этаж – от 12,47 кв.м до 265,52 кв.м;
4 этаж – от 10,06 кв.м до 273,33 кв.м.

Стоимость 1 кв. м общей площади помещений составляет – 8 885 360 (восемь миллионов восемьсот восемьдесят пять тысяч триста шестьдесят) рублей, включая НДС по ставке 20 %.

Строительная готовность нежилых помещений:

Помещения сдаются с выполненными отделочными работами согласно проектной документации, а именно: покрытие пола, окраска и облицовка стен, отделка потолков из гипсокартонных листов, плит типа «Armstrong», входная дверь, установка электротехнической арматуры (электророзетки, выключатели, осветительные приборы, приборы учета электроэнергии), приборы отопления типа «фэнкойл», приточно-вытяжная вентиляция, пожарно-охранная сигнализация, телефонизация, центральное кондиционирование.

Вышеназванные характеристики жилого дома подтверждены заключением РУП «Главгосстройэкспертиза» № 2762-5/08 от 24.11.2008 г. и № 01-08/2344 от 05.04.2010 г.

Застройщиком получены:

- разрешение Минского городского исполнительного комитета от 15 января 2009 года № 27 (I) на строительство многоквартирного жилого дома;
- свидетельство (удостоверение) от 08 июня 2009 г. № 500/986-1080 о государственной регистрации возникновения права временного пользования на земельный участок;
- свидетельство (удостоверение) от 08 мая 2009 года № 500/726-4262 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него;
- заключение государственной экологической экспертизы от 30 сентября 2008 года № 337;
- разрешение специализированной инспекции департамента госстройнадзора на производство строительно-монтажных работ от 30.10.09. № 8-200Ж-137/08.

Генеральным подрядчиком по строительству жилого дома является общество с ограниченной ответственностью «АДС-2000» (договор генерального строительного подряда на строительство жилого дома от 29.09.2009 г. № 122-1-10/2009).

Планируемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – июнь 2011 года.

Ознакомление дольщиков с объектом долевого строительства и условиями заключения договоров на строительство производится в офисе совместного общества с ограниченной ответственностью «ИТЕРАБЕЛСТРОЙ» по адресу: 220103, г. Минск, ул. Калиновского 77А, ком. 310.

ГАДЗІНЫ МАЎЧАННЯ

...Одежду мать достала
Из сундуков заветных,
На солнце, на веревке
Развесила ее.
Маршировали в небо,
Наполненные ветром,
Отцовские рубахи,
Отцовское бельё.

Когда пришла бумага,
Что пал он смертью храбрых,
Она не голосила,
Не плакала о нем,
А вот сегодня — плачет,
И слезы вытирает
Ей старая рубаха
Ожившим рукавом.

Сорам: хто напісаў гэтыя радкі, я не помню. Самі ж яны з першага прачытання ляглі на душу — палюбіліся, запомніліся. Больш за тое, калі мне, тады маладой дзяўчыне, даручылі штось прачытаць на вялікім святочным канцэрце перад ветэранамі, я выбрала менавіта іх.

Доўга, помню, рэпеціравала — шукала патрэбную інтанацыю. Яшчэ даўжэй — вопратку, бо верш гэты (і публіка!), як мне падавалася, прасілі нечага незвычайнага, чаго не было ў, мякка кажучы, пуставатай шафе. А ў крамах тады і тым больш.

Давялося ісці да знаёмай краўчыхі. Разам мы прыдумалі фасон маленькай строгай сукенкі. У ёй, чорнай, паводле нашай задумы, быў прыталены верх з адной чырвонай штрыфелькай і шырокі (званочкам) ніз. Да яе, ну безумоўна ж — чорныя туфелькі і чорныя калготы.

Менавіта такім тады (і ўжо, мусіць, да скону!) мне, і, бяруся сцвярджаць, тысячам (калі не мільёнам іншых зямлян) бачыўся дзень Перамогі.

Чаму?

На гэта пытанне кожны мог бы адказаць па-свойму. І аповеды іх былі б, можа, куды цікавей, але ж...

Ці не ў першыя дні вайны (мама расказвала) немцы з самалётаў сталі бамбіць іх вёску. Людзі кінуліся ўцякаць. Па чыстым полі, пад прыцэльным агнём, яны беглі да няблізкага лесу. І тыя, хто быў «не звязаны» — найперш дзецьмі — дабягалі туды раней, хаваліся...

Мама — то несла, то цягнула маленькую сястрычку. Тая вельмі баялася, плакала і ўсю дарогу маліла: «Ты толькі не кідай... Не пакідай мяне!».

Мама не кінула.

І Бог — абаім ім — дараваў жыццё. У першы раз.

У другі — выратавала карова. Нейкім цудам яна ўратавалася — і ад немцаў, і ад партызан — адна... На ўсю вёску.

У яе, безумоўна ж, была гаспадыня, у той гаспадыні — свая сям'я, уласныя дзеці... Але кожны ўдой, хоць па крысе, яна дзяліла яшчэ і на чужых. Без гэтага дзеці (хворыя... Вёска!) проста не выжылі б!

І яшчэ раз Бог маму памілаваў. Далёкая сваячка бабулі была замужам у суседнім мястэчку — за паліцаем. Сам ён, перад вызваленнем, некуды ўцёк. Сышлі адтуль і немцы — ноччу, напярэдадні. Але партызаны пра гэта, напэўна, не ведалі і бралі мястэчка, што называецца, штурмам...

Ці не ў першую чаргу ўваралася ў дом паліцая. Усе, хто там быў — жонка яго з маленькім дзіцем, мама (бабуля чагось паслала) і яшчэ двое падлеткаў-вяскоўцаў (Коля і Надзя) схаваліся пад падлогай, у склепе. Самі сядзелі ціха, але заплакала дзіця.

Іх прымусілі вылезці з хованкі наверх, паставілі да сцяны і «скасілі» аўтаматнай чаргой.

Маме (дакладней, зразумела ж, дзяўчыне, якая потым мамаю стала) куля трапіла пад пашчэнку, навылет прашыла шыю. З раны забіла кроў...

Калі апрытомнела, жывых ля сцяны не было.

Смерць была наканавана і ёй, бо ніхто не ведаў, як лекаваць такую рану: яна і праз гадзіны і праз дні крывавіла, з кроўю выходзілі дробныя аскепкі касцей.

На шчасце, адна з вясковак працавала ў нямецкім шпіталі і ўпрасіла кагось, каб маму палячылі. Дзед знайшоў дзесь каня і павёз. Туды... Вярнуцца назад (расказвала) яна нават не марыла: усю дарогу адвітвалася — з птушкамі, з небам, з зямлёй. А жыць, гаварыла, вельмі хацелася, таму і ў шпіталі, прыехаўшы, яна ўвесь час плакала...

Маладая медсястрычка (прыгожая... Катарына...) гладзіла яе па галаве і казала, што яна абавязкова паправіцца, выжыве, што сустрэне добрага хлопца, палюбіць, народзіць дзяцей...

Так (з Божай дапамогай) яно і выйшла.

Вось толькі дзеці атрымаліся не вельмі талковыя.

...У нас тады быў «Запарожац» — жоўценькі, з «вушкамі». Мы ехалі на ім у Мінск з таго самага мястэчка, і ў лесе непадалёк ад яго нас спыніла пажылая пара. «Падвязіце», — папрасіў мужчына. І толькі ўладкаваўшыся на заднім сядзенні, стаў натхнёна расказваць, што жывуць яны з жонкай (мне падалося, другой, — **Аўт.)** у Мінску, а сюды ён спецыяльна яе прывёз, каб успомніць і расказаць, дзе прайшла яго партызанская маладосць, каб на месцы ўсё паказаць...

Дурніца — з таго аповеду я не запомніла анічога, бо не магла дачакацца хоць нейкай паўзы, каб спытаць, ці браў жа ён удзел у вызваленні мястэчка?.. («Да, да... Ну, канечно!..»). Ці помніць дом паліцая?.. («Этой сволочи? Ёще бы!..»). Але ж яе, — працягвала роспыт я, — гэтай самай сволачы, — у хаце не было... Была — што яшчэ крыху зразумела — ягоная жонка! Але ж з немаўлём! Былі Богу душой не вінаватыя хлопец і дзве дзяўчыны...

На гэта спадарожнік стаў напорыста даводзіць пра «имевшее место предательство», пра «законы военного времени», пра тое, што «когда лес рубят, щепки летят непременно», аднак маска героя з яго твару стала спаўзаць, ён папрасіў спыніцца і разам з жонкай выйшаў, хоць папярэдне з намі яны збіраліся ехаць да Мінска.

...Гора хапіў і мой бацька. Расказваў, што яны елі ў палоне, як працавалі. Ён — на цагельні невялічкага гарадка Марктрэдвіц, дзе зведаў, і што такое пекла, і што такое... піва. Яго — халоднае, смачнае — ім, хоць зрэдку, прыносілі і наліваслі — найперш тым, хто лазіў у... гарачую печ, каб да ваганеткі з абпаленай цэглай прычапіць тросы.

З таго часу скура на бацькавых руках настолькі агрубела, што з вогнішча ён мог спакойна ўзяць чырвонае паленца, падварушыць ім іншыя, або ад яго ж няспешна прыкурыць.

Мы, дзеці, дзівіліся, але півам не частавалі.

Ну чаму, калі мы падраслі і бацька быў жывы яшчэ, гэты напой не разлівалі ў лягчэйшую тару?! Ну чаму яно было такім дарагім (ці мы дурнымі і безграшовымі)? Чаму амаль ніколі не частавалі яго, чаму не выпыталі ў яго ўсю праўду — пра яго вайну...

Мо таму, што яна, гэтая праўда, была не зусім такой, як казалі настаўнікі, як вучылі ў школе.

У выніку тая, школьная праўда (і няпраўда!) — захавалася. Як захоўваецца напісанае. Другая ж — акопная, асабістая — незваротна сышла ў нябыт. Разам з мільёнамі сведак. Адзінае...

Бацька расказваў, як іх вызвалілі і як, згаладалых, сталі карміць сапраўдным супам. Людзі елі яго да ванітаў, бо не маглі спыніцца. І асобныя там жа паміралі.

Ледзь жывыя, пешкі пайшлі дамоў — мужчыны, жанчыны... Асобныя з іх былі з дзецьмі. У тым ліку — народжанымі (часцей, відаць, ад немцаў)...

Адна з такіх маладзіц папрасіла мужчыну (яго прозвішча было не то ШаБлоўскі, не то ШаЎлоўскі) патрымаць малое, пакуль яна збегае да знаёмых.

Чалавек згадзіўся і доўга чакаў.

Жанчына так і не вярнулася. І дзіця тое ён панёс дамоў — да жонкі, да сваіх дзяцей.

Цягам жыцця сустракала людзей з гэтым прозвішчам, кожнага (хай даруецца!) з цікавасцю разглядала і нават, калі можна было, распытвала — ці не ён, а раптам?... Марна. Прынамсі, пакуль.

Яшчэ — бацька казаў, што некаторыя жанчыны вось такіх немаўлят тапілі, каб вярнуцца дамоў чыстымі, каб развязаць рукі.

...Гадоў дзесяць таму з досыць прыгожым магутным дзедам мы хадзілі па некалі спаленай вёсцы. Ён быў за праважатага — расказваў, як наляцелі карнікі, як зганялі людзей у пуню, як потым запалілі... Цяпер на тым месцы помнік... На ім — усе прозвішчы. Я чытала іх уголас (на дыктафон), ён тут жа тлумачыў, хто каму кім даводзіўся. І вынікала, што ў абсалютнай большасці спаленыя былі дзеці. І маці. Мужчыны (як гэта я разумела і сказала ўголас. — **Аўт.)** былі на фронце, у партызанах? «І так, і не, — уздыхнуў суразмоўца. — Людзей у гэтую пуню зганялі на досвітку, з шумам, з крыкам. Многія, пачуўшы бяду, кінуліся ў лес і ўцяклі, а жанчыны не маглі пакідаць дзяцей...

Тады ж і той самы дзед выказаў (зразумела ж, сваю, суб'ектыўную...) думку, што цяперашнія маткі-зязюлі — спараджэнне вайны, бо менавіта яна паказала, што без «ношы» ўцячэш, фізічна ўратуешся, а з ношай — загінеш...

Як загінула з дзвюма дзяўчынкамі родная сястра нашай дзядзіны.

Трэцяя яе дачка з задымленага хлява нейкім цудам выпаўзла, але шчаслівай так ніколі і не стала. Бо (як казала мне другая жанчына, у якой немцы спалілі матулю і ўсіх малодшых брацікаў-сясцёр) гэта проста немагчыма — па вызначэнні!.. Яна, прынамсі, звекавала свой век з адкрытай крывавай ранай і казала, што любая найвялікшая радасць — каханне, дзіця, новы дом і г.д. (не кажучы ўжо пра гора) — здольная страціць сэнс, калі ты не можаш расказаць, паказаць яе МАМЕ.

Бацьку — дадам ад сябе — таксама...

Наш у тым самым палоне пазнаёміўся з дзяўчынай. Яны пакахалі адно аднаго. Але цесць (па словах бацькі — ганарлівец-паляк і шчыры католік) не прыняў праваслаўнага (ці ўсё ж бязбожнага?) зяця — выжываў і такі выжыў з сям'і.

Бацька з'ехаў дамоў. Хацеў забраць і сваіх — маленькую дачку, жонку. Але ехаць з дому яна пабаялася.

Доўгі час яны ліставаліся.

А потым бацька сустрэў маму, яны ўзялі шлюб, нарадзіліся мае браты. І нарэшце я. Мы, як кажуць цяпер, выраслі ў поўнай сям'і, мы (па-свайму, хай зусім не ўмеючы...) вельмі любілі бацьку. Ён любіў нас.

Але ж не толькі! Усе адпушчаныя Богам дні і гады ён пастаянна помніў і думаў пра тое, пакінутае ім дзіця. Магчыма таму, нават перад смерцю, не змог кінуць курыць? Магчыма, таму напіваўся?..

Вайна (сухоты) загубіла яго сястру — маю родную цётку Любу. Яе дзве дачкі згубіліся недзе ў Англіі.

Яна ж, вайна, раскідала па свеце іншых бацькавых сясцёр: дзе тая Архангельская вобласць, дзе Днепрапятроўская?

Яна ж загубіла швагра і маладога, прыгожага пляменніка.

Яна ж танкам прайшлася па жыццях безлічы іншых сям'яў!..

У Польшчы пахаваны бацька майго свёкра.

Ужо ва Усходняй Прусіі ледзь не загінуў сам. Расказваў, што быў моцна паранены, непрытомны. І яго прынялі за мёртвага: разам з іншымі ў брацкай магіле хацелі пахаваць — выкапалі яму, але пайшоў дождж і работу гэту адклалі — на раніцу.

Ноччу ён ачнуўся...

Свякроў пасля вызвалення пайшла працаваць настаўніцай. У першым класе, казала, былі і 12-гадовыя, распушчаныя (ведама, без бацькаў) падлеткі і сямігадовая дзятва. Вучыць іх — без вопыту і ненамнога старэйшай — было немагчыма. Любіць — «исчадие ада» — і пагатоў!..

Але прайшоў, ды што там — прабег час, які лечыць: без малога 70 гадоў назад вайна пачалася, 65 — як скончылася. Гэта, ну безумоўна ж, шмат. І гэта, ну безумоўна ж, дата! Свята!

Да яго — паўсюль вычышчаюцца, падмятаюцца вуліцы, беляцца дрэвы, фарбуюцца лаўкі, садзяцца кветкі ля помнікаў. Да яго ж рыхтуюцца канцэртныя пляцоўкі і праграмы, ва ўсе колеры вясёлкі, апроч чорнага, прыбіраецца горад...

На яго шырокіх цэнтральных вуліцах дзявятага мая (ведаю па мінулых гадах) будуць грымець аркестры, будзе парад, салют, будзе ва ўсю працаваць выязны гандаль і разлівацца франтавыя сто грамаў, па іх будуць хадзіць па-святочнаму прыбраныя людзі, у тым ліку — ветэраны. Ім будуць уручаць кветкі, іх будуць фатаграфаваць, у асобных — браць інтэрв'ю, паказваць па тэлебачанні...

На адно з такіх свят гадоў 10 таму мы пайшлі са свёкрам (ён быў тады куды дужэйшы). На яго — з медалямі! — сталі глядзець людзі, усміхаца, а п'яныя дзецюкі нават рваліся паціснуць руку і абняць. Што ветэрана спачатку цешыла. А потым...

Бліжэй да тых самых цэнтральных вуліц на машыне, як высветлілася, не вельмі пад'едзеш, там — зноў жа — доўга не пастаіш. Стамляе натоўп...

Таму апошнім часам на свята мы з'язджаем з горада, святкуем на лецішчы альбо ў вёсцы, па дарозе туды спыняемся ля многіх маленькіх мясцовых абеліскаў, якімі такая багатая наша зямля.

Дарэчы...

У той год і ля таго помніка (ён стаіць на месцы царквы, дзе ў 1943 карнікі спалілі вёску) мы былі з васьмігадовым дзіцем. Яно — набожнае — спачатку не магло зразумець, як гэта «спалілі ў царкве»? Потым — як гэта «спалілі людзей»?.. «Што — і дзяцей?! Хто? За што?»

Заспетыя знянацку, мы, дарослыя, гаварылі, што краіны жывуць, як і людзі: хто ў міры і згодзе, хто ў зайздрасці і звадках, у якіх так не далёка да бойкі, гэта значыць, да вайны... У Нямеччыне вось да ўлады прыйшоў Гітлер, які давёў усім немцам, што яны найлепшыя, што ў іх жылах цячэ блакітная кроў і што яны павінны валодаць светам, а ўсе астатнія людзі — альбо памерці, альбо выслугоўваць...

Дзіця нас слухала — там, ля помніка. Яно ж кароткім «Маўчыце! Мне трэба падумаць!» «заткнула раты» на ўсю дарогу далей. Бо на тое, каб падумаць, каб уявіць («палілі... Дзяцей») , каб зрабіць для сябе нейкія высновы, мала хвіліны маўчання, патрэбны гадзіны. Гадзіны цішыні.

А потым — цярпенне, каб цягам года, усе 365 дзён бачыць (хто сказаў, што гэта справа толькі для ўладаў?) тых, хто заяваў, хто прайшоў праз жахі канцлагераў і палонаў, тым, хто застаўся ўдовамі і сіротамі, тым, хто дагэтуль без слёз не можа расказваць пра сваё дзяцінства... І дапамагаць...

Можа, зусім недарэчны... У далёкай сваячкі (бацьку яе, шчырага камуніста, немцы расстралялі ў першыя дні вайны) сёння радасць: «дамовілася з канём» (так у іх кажуць), на сваю сціплую пенсію закупіла прадукты і гарэлку, склікала талаку — пасеяла соткі.

Так што на 9 Мая будзе святкаваць: сходзіць на мітынг, паглядзіць на людзей, паслухае, што будуць казаць, потым разам з усімі па вуліцы, якая носіць імя яе бацькі, сходзіць да яго на магілу. Каб ускласці кветкі.

Так было летась і пазалетась, так было дваццаць і сорак гадоў назад.

І так, відаць, будзе?

Валянціна ДОЎНАР.

Памяць

Назвалі вуліцу Стралковай

ВУЛІЦА ў гродзенскім мікрараёне «Вішнявец-5» атрымала назву Стралковая — у гонар воінаў 85-й стралковай дывізіі, якія абаранялі горад над Нёманам у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Вось што апавядае пра баі ў гэтых мясцінах Георгій СЦЯПАНАЎ, былы палітрук палкавой школы 103-га палка 85-й стралковай дывізіі (гісторыка-дакументальная хроніка Гродна «Памяць»).

— У ноч на 24 чэрвеня наша дывізія атрымала загад генерал-лейтэнанта Кузняцова аб наступе на Гродна. 103-і стралковы полк павінен быў наступаць на правым фланзе і выйсці на рубеж Кашэўнікаў. 141-ы стралковы полк наступаў на левым фланзе з задачай выйсці ў лес на паўночны ад Гібулічаў. У наступным палкі павінны былі наступаць на паўднёва-заходнюю ўскраіну Гродна — Фолюш і заняць абарончы рубеж на рэчцы Ласасянка, які мы пакінулі ў ноч на 23 чэрвеня.

Астатак ночы быў выкарыстаны для падрыхтоўкі да наступу. На той час пагоршылася становішча з харчаваннем і боепрыпасамі. Перайшлі на выкарыстанне «НЗ», які складаўся з канцэнтратаў і сухароў. Падвоз боепрыпасаў быў ускладнены, паколькі авіяцыя праціўніка знішчыла аўтабат дывізіі.

Наступ з рубяжа ракі Свіслач полк распачаў у 9.30. Стаяла ясная пагода. Сонца абпякала сваімі прамянямі, з-пад касак ручаямі ліўся пот, мучыла смага. Над калонамі віселі хмары пылу. Было вельмі цяжка фізічна і маральна. Але мы наступалі з надзеяй, што адолеем ворага і выкінем яго за межы нашай Радзімы.

Нямецкія самалёты выявілі нашы наступаючыя калоны, з'явіліся варожыя бамбардзіроўшчыкі і знішчальнікі. Бамбёжка і штурмоўка калонаў вялася бесперапынна. У другой палове дня авіяцыя праціўніка прыціснула нас да зямлі. Наступ спыніўся. Задача дня не была выканана. З надыходам цемры мы прасунуліся да Жукевічаў і Горніцы. Параненых экакуіравалі ў медсанбат, забітых пахавалі.

Наступ аднавіўся раніцай, як толькі ўзышло сонца. Я знаходзіўся ў атакуючых ланцугах палкавой школы. Асабісты прыклад быў лепшым сродкам агітацыі за разгром ворага, абарону кожнай пядзі роднай зямлі. З памочнікам начальніка школы лейтэнантам Фаміным мы паднялі байцоў у атаку. Фашысты не вытрымалі штыкавога ўдару. У рове я сутыкнуўся з немцам. Чаргой з аўтамата ён цяжка параніў мяне ў нагу і тут жа быў забіты курсантам палкавой школы, які ішоў за мной. На плашч-палатцы мяне выцягнулі з поля бою і даставілі ў медчастку палка. У ноч на 26 чэрвеня нас, параненых, эвакуіравалі ў медсанбат, а днём на аўтамашыне накіравалі ў тыл. Нам пашанцавала. Рухаючыся ў абыход Слоніма, Баранавічаў, Мінска, мы не трапілі ў кольца акружэння і 30 чэрвеня прыбылі ў Магілёў.

А палкі 85-й стралковай дывізіі да надыходу цемры 25 чэрвеня працягвалі бой на бліжніх подступах да паўднёва-заходняй ускраіны Гродна. У ноч на 26 чэрвеня яны па загаду зноў адышлі на рубеж ракі Свіслач, пакінуўшы на полі бою каля вёсак Солы і Гнойніца каля тысячы загінуўшых байцоў і камандзіраў.

У наступным часткі абяскроўленай дывізіі, з баямі ва ўмовах акружэння, адыходзілі на Лунна, Дзятлава, Навагрудак, Узду і далей на ўсход. 15 ліпеня зводны атрад з рэшткамі дывізіі пад камандаваннем намесніка камдзіра палкоўніка Скарабагаткіна прарваўся праз баявыя парадкі праціўніка паўночней Магілёва. Другая група выйшла з акружэння ў раёне Мазыра разам з часткамі 24-й стралковай дывізіі генерал-маёра Галіцкага. Многія воіны трапілі ў палон і сталі вязнямі фашысцкіх лагераў смерці, у тым ліку і лагера для савецкіх ваеннапалонных Шталаг № 324 у Гродне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У суд **Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлым **Шах Ахмада** 27.08.1969 года нараджэння, які нарадзіўся ў горадзе Лагман, Афганістан, да снежня 2005 года пражываў у вёсцы Хомск, вуліца Кірава, дом 27 Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Просім усіх, каму вядома аб лёсе Шах Ахмада і яго месцазнаходжанні, на працягу двух месяцаў паведаміць аб гэтым у суд Драгічынскага раёна.

Гэта цікава

Дах хаты пад снарадамі

Пасля вайны жыхар вёскі Хадзявічы Слонімскага раёна Рыгор Важэйка пачаў будаваць сабе новую хату. Збудаваў яе хутка, а дах вырашыў накрыць... гільзамі ад снарадаў. Гэтых гільзаў пасля вайны ў мясцовым лесе валялася шмат. Вясковец запрагаў каня і ехаў у лес. Там ён знаходзіў гільзы ад снарадаў, збіраў іх і прывозіў дамоў. Потым браў зубіла і штодня высякаў роўненькія кавалачкі металу. Імі ён накрыў дах сваёй хаты, веранду і хлеў.

Дарэчы, Рыгор Важэйка меў, як кажуць, залатыя рукі. Сам зрабіў плуг, барану, сошку, хатнюю мэблю і г. д.

Даўно памёр вясковец, а ў яго хаце цяпер знаходзіцца сельскі фельчарска-акушэрскі пункт. Але дах хаты пад гільзамі — як новы. «Тысячу гадоў прастаіць», — кажуць вяскоўцы.

Сяргей ЧЫГРЫН, фота аўтара.

Прэзідэнцкі спартыўны клуб павіншаваў легенд беларускага спорту

На «Мінск-арэне» адбылася ўрачыстая цырымонія ўшанавання ветэранаў фізічнай культуры і спорту, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, прысвечаная 65-годдзю Вялікай Перамогі. Гэта стала фіналам дабрачыннай акцыі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, у межах якой была аказаная спонсарская дапамога Беларускаму грамадскаму аб'яднанню «Ветэраны фізічнай культуры і спорту» па ўсёй краіне.

Больш за два дзясяткі ветэранаў, чые імёны ўпісаны ў спартыўную гісторыю нашай краіны, сабраліся на «Мінск-арэне». Ад імя старшыні цэнтральнага савета «Прэзідэнцкага спартыўнага клуба» Дзмітрыя Лукашэнкі за шматгадовую працу і ўклад у развіццё і ўдасканаленне сістэмы патрыятычнага выхавання моладзі падзякі атрымаў 21 ветэран. Старшыня грамадскага аб'яднання «Ветэраны фізічнай культуры і спорту» Віктар Пуцькоў атрымаў вітальны адрас ад Дзмітрыя Лукашэнкі.

Сярод прысутных былі сапраўды легендарныя асобы — удзельнік Параду Перамогі 24 чэрвеня 1945 года ў Маскве Анатоль Сакалоў, начальнік штаба беларускіх арлянят Аляксей Куцэнка, трэнер першага ў БССР прызёра Алімпіяды Міхаіла Крываноса, Яўген Шукевіч (пасля яго вучні двойчы станавіліся алімпійскімі чэмпіёнамі — Васіль Рудзянкоў у Рыме ў 1960-м і Рамуальд Клім у Мехіка ў 1964-м). Яўген Міхайлавіч, дарэчы, нягледзячы на свой 95-гадовы ўзрост, дагэтуль актыўна ўдзельнічае ў спартыўным жыцці краіны, а ў Брэсце штогод праводзяцца спаборніцтвы па легкаатлетычных штурханнях на прызы знакамітага трэнера.

Яшчэ адзін прыклад актыўнасці і жыццёвага аптымізму — 100-гадовы Мікалай Нэльга, які дагэтуль захапляецца більярдам. Мікалай Аляксандравіч, былы прарэктар Беларускага інстытута фізкультуры і спорту, рэктар такога ж ВНУ ў Латвіі, старшыня навуковага савета Спорткамітэта Беларусі, член навуковага савета Спорткамітэта СССР, аўтар каля сотні метадычных і навуковых прац, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

Фота БЕЛТА.

Заслужаны трэнер БССР Аляксей КУЦЭНКА і суддзя нацыянальнай катэгорыі Георгій ЦІТКІН.

Знакамітага 89-гадовага трэнера Міхаіла Цэйціна ў Беларусі ведаюць усе выпускнікі Акадэміі фізвыхавання, дзе ён выкладае і сёння. Акрамя таго, Міхаіл Ільіч уваходзіць у штаб мінскага футбольнага клуба «Партызан», дзе з'яўляецца трэнерам па гімнастыцы. У свой час яго трэнерскае майстэрства прывяло да бронзавых медалёў чэмпіянату СССР футбольны клуб «Беларусь», а мінскае «Дынама», у тым ліку і з яго дапамогай, выйграла чэмпіянат СССР у 1982 годзе. Яго методыкі па ўмацаванні вестыбулярнага апарату выкарыстоўваліся для падрыхтоўкі касманаўтаў. Сам Міхаіл Ільіч пяць разоў станавіўся чэмпіёнам БССР па акрабатыцы, быў неаднаразовым прызёрам чэмпіянату СССР. Яшчэ адзін бок яго таленту — рэжысёрскі. Міхаіл Ільіч быў рэжысёрам масавых святаў у Маскве, Мінску, Казані і нават Манголіі. Ён дагэтуль трымае сябе ў форме: робіць стойку на руках, круціць сальта і выконвае скачкі на батуце.

Павіншаваў ветэранаў выканаўчы дырэктар «Прэзідэнцкага спартыўнага клуба» Андрэй Карповіч, пасля чаго яны былі запрошаныя на ўрачысты абед у САК «Алімпійскі». Ветэраны, у сваю чаргу, падзякавалі маладому пакаленню за клопат і ўвагу да сябе і пажадалі не ўбачыць тое, што ім давялося прайсці ў час вайны.

Алена КРАВЕЦ.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

	Наименование объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Кабина (доска обшитая жестью)	726 189 314	36 309 000
2	Кабина (доска обшитая жестью)		
3	Здание административно-хозяйственное общей площадью 278 кв.м, год постройки – 1992 (материал стен – ж/бетонные панели)		
4	Здание обрабатывающей промышленности иного назначения общей площадью 1442 кв.м, год постройки – 1992 (материал стен – ж/бетонные панели)		
5	Ограждения ж/б плиты		
6	Щиток Щ 81		
7	Стан ХПТ 32-3-8		
8	Правильная машина		
9	Индукционная установка		
10	Станок фрезерный		
11	Ванна металло-керамическая		
12	Кран-балка		
13	Станок обрезной		
14	Стан трубоволочильный		
15	Сотовый телефон		
16	Весы крановые		

Продавец имущества: Управляющий в деле о банкротстве ПУИП «Упеко Индастриз», имущество расположено по адресу: г. Гомель, ул. Лепешинского, 7, на земельном участке площадью 1,4289 га.

Срок подачи заявления	**До 17.00 11 мая 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**12 мая 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника»
Номер р/с для перечисления залога	Р/с 3012035310012 в Филиал ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условие продажи	**Цены указаны без НДС.** Шаг аукционных торгов – 8 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства жилого дома № 20 (по генплану) в микрорайоне Масюковщина-6)

Информация о застройщике: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник – четверг – 8.30-17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 64 по ул. Червякова
2. Жилой дом № 32 по ул. Янковского
3. Жилой дом № 42 по ул. Янковского

Лицензия № 02250/0589508 на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведение инженерных изысканий для этих целей», выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь на основании решения № 20 от 25.01.2010 г. и действительна до 28.02.2015 г.

Информация о проекте строительства:

1. Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Начало строительства 1 квартал 2010 г., окончание строительства – 4 квартал 2010 г., благоустройство и озеленение прилегающей территории – 2 квартал 2011 г.

Положительные заключения государственной экспертизы № 2137-5/09 от 29 декабря 2009 г.

2. Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Фрунзенский район, в микрорайоне Масюковщина-6, жилой дом № 20 по генплану.

Характеристика объекта.

Объект – 184-квартирный, 9-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-464-У1 с помещением товарищества собственников, без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, без санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза, ванной и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные – железобетонные трехслойные панели толщиной 300 мм с утеплителем из полистирольных плит, внутренние – сборные железобетонные панели толщиной 120 мм и 140 мм.

Перекрытия – железобетонные.

Крыша – мягкая рулонная.

Окна – из ПВХ профиля с поворотно-откидным механизмом открывания створок.

Двери наружные (в квартирах) – щитовые.

Отопление – центральное.

Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Цены на объекты долевого строительства

Стоимость 1м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации:

- однокомнатные и двухкомнатные квартиры - 3 200 000 руб.,
- трехкомнатные квартиры – 2 950 000 руб.

3. Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 1617 от 17 июля 2008 г., свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 16 сентября 2008 г. № 500/1035-154. Площадь земельного участка – 0,8292 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

4. Количество квартир в доме – 184.

5. Нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества, нет.

6. Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

Помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

7. Предполагаемый ввод в эксплуатацию – 4-й квартал 2010 г.

8. Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решений Мингорисполкома № 2201 от 18 сентября 2008 г., № 377 от 18 февраля 2010 г. собственными силами без заключения договоров подряда, для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Строительство осуществляется согласно Указу Президента № 396 от 15 июня 2006 г. Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 36 (тридцать шесть) следующих квартир в четвертом подъезде дома:

1. **Однокомнатные** №№ 115 (1 этаж), 120 (2 этаж), 124 (3 этаж), 128 (4 этаж), 132 (5 этаж), 136 (6 этаж), 140 (7 этаж), 144 (8 этаж), 148 (9 этаж), 150 (1 этаж), 155 (2 этаж), 159 (3 этаж), 163 (4 этаж), 167 (5 этаж), 171 (6 этаж), 175 (7 этаж), 179 (8 этаж), 183 (9 этаж) – общей площадью 40,65 м², жилой площадью 17,1 м² – по цене 130 080 000 руб. за квартиру.

2. **Двухкомнатные** №№ 119 (2 этаж), 123 (3 этаж), 127 (4 этаж), 131 (5 этаж), 135 (6 этаж), 139 (7 этаж), 143 (8 этаж), 147 (9 этаж), 154 (2 этаж), 158 (3 этаж), 162 (4 этаж), 166 (5 этаж), 170 (6 этаж), 178 (8 этаж), 182 (9 этаж) – общей площадью 61,23 м², жилой площадью 31,18 м² – по цене 195 936 000 руб. за квартиру.

3. **Трехкомнатные** №№ 116 (1 этаж), 118 (2 этаж), 121 (2 этаж), 122 (3 этаж), 125 (3 этаж), 126 (4 этаж), 129 (4 этаж), 130 (5 этаж), 133 (5 этаж), 134 (6 этаж), 137 (6 этаж), 138 (7 этаж), 141 (7 этаж), 142 (8 этаж), 145 (8 этаж), 146 (9 этаж), 149 (9 этаж), 151 (1 этаж), 153 (2 этаж), 157 (3 этаж), 160 (3 этаж), 161 (4 этаж), 164 (4 этаж), 165 (5 этаж), 168 (5 этаж), 169 (6 этаж), 172 (6 этаж), 177 (8 этаж), 180 (8 этаж), 181 (9 этаж), 184 (9 этаж) – общей площадью 79,26 м², жилой площадью 46,67 м² – по цене 233 817 000 руб. за квартиру.

4. **Трехкомнатная** № 117 (1 этаж) – общей площадью 90,73 м², жилой площадью 46,57м² – по цене 267 653 500 руб. за квартиру.

Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:

Прием заявлений от граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет № 1, тел. 207 19 15) с 13 мая 2010 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник-четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах

Складзены рэйтынг гарадоў з самымі доўгімі заторамі

Вытворца спадарожнікавых навігацыйных сістэм, кампанія Tom Tom, апублікавала вынікі даследавання 59 еўрапейскіх гарадоў з самымі буйнымі заторамі. Самым загружаным быў прызнаны Брусель (Бельгія), а другое і трэцяе месцы занялі польскія гарады Варшава і Вроцлаў. У іх больш за 30 працэнтаў усіх аўтамабіляў штодня трапляюць у заторы.

У рэйтынг самых загружаных уключаліся толькі гарады з насельніцтвам не менш за 500 тысяч чалавек, а цяжкасці руху вызначаліся па хуткасці руху машын — калі аўтамабілі перамяшчаюцца як мінімум на 30 працэнтаў марудней за ўстаноўлены ліміт.

Цалкам першая дзясятка гарадоў з самымі загружанымі дарогамі выглядае наступным чынам:

1. Брусель
2. Варшава
3. Вроцлаў
4. Лондан
5. Эдынбург
6. Дублін
7. Белфаст
8. Марсель
9. Парыж
10. Люксембург

Хочаце — верце...

У чаканні Шостага Сонца

ПАВОДЛЕ старадаўніх паданняў, жыццё на нашай планеце развіваецца цыклічна і, калі адзін цыкл завяршаецца, а яму на змену прыходзіць другі, чалавечая цывілізацыя гіне.

У славутым на ўвесь свет календары майя бягучы перыяд вызначаны як эпоха Пятага Сонца, якая распачалася ў 3114 годзе да новай эры і павінна завяршыцца 21 снежня 2012 года. Цікава, што на гэтым запісы старажытных індзейцаў абрываюцца, і што будзе далей — невядома. Самыя пужлівыя чакаюць напрыканцы 2012 года канца свету, аптымісты прарочаць надыход Залатога Веку на Зямлі.

На жаль, майя — не адзіныя, хто папярэджвае нас аб непрыемнасцях з нагоды змены эпох. Падобная інфармацыя сустракаецца і ў іншых гістарычных крыніцах.

У хроніках індзейскіх плямён Паўднёвай Амерыкі гаворыцца: «Старажытныя людзі верылі, што да таго, як з'явіліся цяперашнія неба і зямля, чалавек ужо быў створаны і жыццё адраджалася чатыры разы». Свяшчэнная кніга індусаў «Бхагавата Пурана» расказвае аб чатырох вяках «калпас» і аб «паралаях» — катаклізмах, пры якіх чалавецтва аказвалася на мяжы знішчэння. Аналагічныя ўяўленні існуюць і ў старажытных трактатах жыхароў высакагорнага Тыбету. І ўсюды «пятым векам» называюць бягучы.

Як сцвярджае доктар тэхнічных навук, прафесар, першы прарэктар Маскоўскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта імя Шолахава, аўтар кнігі «Лічбавая сімволіка ў рэлігіі і гісторыі» Міхаіл Трашчалін, у старажытных народаў сапраўды існавала сістэма перыядаў, якія аддзялялі адну эпоху ад другой. Прычым у розных народаў яны былі розныя па працягласці, аднак, магчыма, несупадзенні ўзніклі з-за рознага летазлічэння. Напрыклад, вялікі вучоны, астраном і матэматык Арыстарх з Самаса ў III стагоддзі да новай эры сцвярджаў, што кожныя 2484 гады Зямля праходзіць праз дзве катастрофы — пажар і патоп. Паводле сведчання Рашы (вядомага сярэднявечнага тлумачальніка Бібліі і Талмуда), старажытныя паданні гавораць пра перыядычныя «абвалы цвердзі нябеснай» з інтэрвалам у 1656 гадоў. Грэчаскі філосаф Геракліт сцвярджаў, што свет гіне ў агні кожныя 10 800 гадоў.

Паводле слоў прафесара Трашчаліна, ацтэкі, папярэднікі майя, таксама верылі, што сусвет існуе ў межах вялікіх цыклаў, якія яны называлі «сістэмай Сонцаў». У Антрапалагічным музеі ў Мексіцы знаходзіцца вядомы ацтэкскі каляндарны **«Камень Сонца»** — велічэзны базальтавы маналіт дыяметрам каля 4 метраў і вагой каля 25 тон. Ён дэманструе ўяўленні старажытных плямёнаў аб далёкім мінулым. У цэнтры каменя высечаны Танаціў Мая — бог Сонца бягучай эпохі. З усіх бакоў знаходзяцца сімвалы чатырох папярэдніх эпох. Сонечны камень на мове сімвалаў расказвае, што кожная папярэдняя эпоха мела свайго бога, што за гэтыя чатыры эпохі змяніліся чатыры чалавечыя расы, што ўсе мінулыя культуры зніклі ў выніку вялікіх катаклізмаў і што толькі некаторыя людзі выжылі і расказалі пра катастрофу.

Першае Сонца доўжылася 4008 гадоў, і цывілізацыя, якая існавала ў той час, загінула ў выніку патопу. Другое Сонца цягнулася 4010 гадоў і завяршылася жудасным ураганам. Трэцяе Сонца мела працягласць 4081 год, і людзі тады загінулі ў вогненным дажджы, які абрынуўся з нябёсаў, і патоках вулканічнай лавы. Нарэшце, Чацвёртае Сонца працягласцю ў 5056 гадоў завяршылася гібеллю чалавецтва ад голаду, які быў наступствам «навадненняў, мора крыві і агню». Згодна з уяўленнямі ацтэкаў, ужо даўно ідзе чарговае, Пятае Сонца, якое яшчэ называюць Сонцам Руху (бо, як верылі індзейцы, па завяршэнні бягучай эпохі адбудзецца нейкі «рух», ад якога ўсе загінуць). Некаторыя сучасныя даследчыкі мяркуюць, што пад «рухам» маецца на ўвазе змяшчэнне восі Зямлі.

Прафесар расказаў, што сёння вялікую папулярнасць мае гіпотэза, згодна з якой дзесьці 14-10 тысяч гадоў таму існавала даволі развітая протацывілізацыя, якая прыйшла ў заняпад пасля глабальнага катаклізму. Праз пэўны час развіццё культур пачалося на розных кантынентах практычна адначасова і, што самае важнае, з аднаго кораня. Рэшткі старажытных навук, астранамічных і матэматычных адкрыццяў аднаўляліся і захоўваліся жрацамі Егіпта, Вавілона, Шумера, Індыі і індзейцамі Амерыкі.

Яшчэ ў трактаце «Вісудхімага» («Шлях Ачышчэння») — помніку ранняга будызму — у главе «Сусветныя цыклы» гаворыцца, што «...ёсць тры віды разбурэнняў — вадой, агнём і ветрам». З гэтай прычыны міфы аб гібелі папярэдніх Сонцаў даследчыкі звязваюць з прыроднымі катастрофамі. Праўда, цяпер вучоныя-будысты ўносяць удакладненні ў прагнозы сваіх продкаў і сцвярджаюць, што з наступленнем шостай сусветнай эпохі, ці Шостага Сонца, «увесь свет напоўніцца дымам і насыціцца яго сажай». Тады будзе «не адрозніць дзень ад ночы», і «... тая цемра ідзе ад разбуральніка сусветных эпох, вялікага воблака» касмічнага паходжання.

Між іншым, канец Пятага Сонца супадае з пачаткам эпохі Вадалея, якая якраз цяпер і настае (і павінна доўжыцца 2160 гадоў). Астролагі лічаць гэтую эпоху своеасаблівым водападзелам у эвалюцыі чалавецтва. Што ў гэты перыяд можа адбыцца на Зямлі — бачна на старажытным задыяку, знойдзеным у Дэндэрах, у адным з храмаў Верхняга Егіпта. На ім сузор'і задыяка выяўлены ў выглядзе фігур людзей і жывёл, якія нясуць у сабе вобразную інфармацыю аб падзеях, якія чакаюцца. Вадалей паказаны ў выглядзе мужчыны, які лье з двух збаноў ваду на рыбу. Рыбе ад гэтага будзе добра. Але як чалавецтву? Прафесар Трашчалін спасылаецца на даследчыка біблейскіх тэкстаў Уладзіміра Бабаніна, паводле слоў якога магутныя навадненні і патопы зальюць зямлю. І людзі ў такіх умовах будуць нагадваць рыб, бо з усіх бакоў будуць абкружаны вадой, як у часы біблейскага Ноя.

Выходзячы з аналізу шматлікіх старажытных паданняў, можна меркаваць, што патоп адбудзецца дзесьці паміж 2012 і 2030 гадамі. Аднак дакладнай даты не ведае ніхто, падкрэсліў прафесар.

...Нават сур'ёзныя навукоўцы схіляюцца да думкі, што «міфічныя» пагрозы чалавецтву не такія ўжо і фантастычныя. Амерыканскія навукоўцы Майкл Вайсешн, прафесар сейсмалогіі Вашынгтонскага ўніверсітэта, і Джэсі Лоўрэнс з Каліфарнійскага ўніверсітэта растлумачылі, адкуль узялася вада для Сусветнага патопу. Як ні дзіўна — з нетраў Зямлі. Дзякуючы дадзеным, атрыманым ад сеці сейсмографаў, якой ахоплена ўся планета, вучоныя знайшлі ў нетрах вялізныя рэзервуары вады, якія знаходзяцца як мінімум у двух месцах — пад усходняй часткай кантынента Еўразія і пад Паўночнай Амерыкай. Сейсмолагі склалі трохмерную мадэль і запэўніваюць, што вады там не менш, чым у Паўночным Ледавітым акіяне. Паводле іх меркаванняў, перыядычна гэтая глыбінная вада выходзіць на паверхню (як гэта адбылося ў часы біблейскага Сусветнага патопу). І тэарэтычна падобная катастрафічная з'ява можа паўтарыцца ў будучыні. Прычым у такіх маштабах, што не будзе відзён і Арарат. Вайсешн папярэджвае, што ніжэй за знойдзеныя ім акіяны — у тых абласцях зямной мантыі, якія яшчэ не даследаваны, — таксама ёсць вада. Яе аб'ём можа ў пяць разоў перавышаць ёмістасць усіх паверхневых акіянаў.

Яшчэ адна непрыемная акалічнасць. На адным са здымкаў, перададзеных астранамічным спадарожнікам «Планк», што знаходзіцца ў 1,5 млн км ад Зямлі, астраномы заўважылі каласальную паласу халоднага пылу, які цягнецца праз нашу Галактыку. І паласа рухаецца ў кірунку Зямлі. Паводле падлікаў спецыялістаў, калі воблака-забойца не «збочыць», то накрые нашу планету ў 2014 годзе.

Апошні даклад амерыканскай Акадэміі навук большасць слухачоў ахарактарызавала як выключна змрочны. Адна яго назва чаго вартая: «Пагрозы касмічнага паходжання». Згодна са справаздачай спецыялістаў NASA, якія вывучаюць сонечную актыўнасць, 22 верасня 2012 года — у пік чарговага сонечнага цыкла — можа адбыцца глабальная катастрофа, так званы каранальны выкід. Геамагнітная бура як мінімум спаліць усе трансфарматары на Зямлі. Як максімум — агонь сонечнай плазмы спаліць усю планету. Наступствы раптоўнага сонечнага шторму астрафізікі параўноўваюць з ядзернай вайной ці падзеннем гіганцкага астэроіда.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.26	20.48	15.22
Віцебск —	5.10	20.43	15.33
Магілёў —	5.16	20.38	15.22
Гомель —	5.18	20.29	15.11
Гродна —	5.42	21.02	15.20
Брэст —	5.48	20.57	15.09

Месяц

Апошняя квадра 6 мая. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Віталя, Гаўрылы, Клімента, Лукі, Усевалада, Фёдара.*

К. *Ірэны, Тамары, Вальдэмара, Вінцэнта, Тодара.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЕЖА, ЯКАЯ НАС ЗАБІВАЕ

Над стварэннем рэйтынгу небяспечных прадуктаў працавалі адразу некалькі спецыялістаў з Інстытута экагігіены і таксікалогіі, Нацыянальнай медакадэміі, Украінскага НДІ харчавання і некалькіх прыватных медыцынскіх цэнтраў.

Пра вынікі расказалі на першым у Калінінградзе сімпозіуме «Харчаванне. Здароўе. Жыццё», піша «Камсамольская праўда».

Шкода прадуктаў, якія трапілі ў спіс, вызначалася выходзячы з іх здольнасці выклікаць цяжкія захворванні. Многія «ўдзельнікі» рэйтынгу часта становяцца прычынамі атручэнняў і цяжкіх алергічных рэакцый, але для здаровых людзей цалкам бяспечныя. На думку ўрачоў, усё залежыць ад дазіроўкі. У невялікай колькасці прыём такой ежы можа быць бяскшодным.

1 МЕСЦА: ЧЫПСЫ І ГАЗІРОЎКА

Чыпсы — гэта сумесь вугляводаў і тлушчу ў абалонцы фарбавальнікаў і заменнікаў смаку. З-за асаблівасцяў прыгатавання ў чыпсах утвараецца мноства канцэрагенаў — рэчываў, якія правакуюць рак. А гідрагенізаваныя тлушчы вядуць да павелічэння ўзроўню халестэрыну ў крыві, што павышае рызыку інфарктаў і інсультаў.

Салодкія газаваныя напоі — сумесь цукру, хіміі і газаў. Як правіла, утрымліваюць аспартам (Е951), сінтэтычны заменнік цукру. Фелатанін, які ёсць у аспартаме, змяняе парог адчувальнасці, пры ўжыванні ў вялікіх дозах садзейнічае развіццю маніякальнай дэпрэсіі, прыпадкаў панікі, злосці і гвалту.

Але самае галоўнае — газіроўка з аспартамам не праганяе смагу. Сліна дрэнна выдаляе рэшткі падсаладжвальніка са слізістай рота, таму пасля ўжывання такіх напояў у роце застаецца адчуванне прыкрасці, якое хочацца зняць новай порцыяй напою. У выніку напоі з аспартамам становяцца напоямі для ўзбуджэння смагі, а не для яе здавольвання. Таму калі і п'яце колу, то запівайце яе звычайнай вадой.

Акрамя таго, бензаат натрыю (Е211), які выкарыстоўваецца як кансервант, прыгнятае ферменты, што прыводзіць да парушэння абмену рэчываў і атлусцення.

2 МЕСЦА: ФАСТФУД

Беляшы, чабурэкі, бульба фры, шаўрма і ўвогуле ўсё, што смажыцца — вельмі шкодна. Таму што смажаць гэта ўсё нярэдка ў адным і тым жа алеі, мяняецца ён у самым лепшым выпадку, раз у суткі. Вынік — канцэрагены. З гадамі такое харчаванне прыводзіць да парушэнняў у вобласці стрававання — да калітаў, гастрытаў, пякоткі, запораў і да т. п.

Разнавіднасць фастфуду — чыпсы, сухарыкі, арэшкі, шакаладнаарэхавыя батончыкі і іншыя любімыя дзецьмі прадукты. Як адвучыць дзяцей ад фастфуду? Выйсце адно — цалкам выключыць яго з рацыёну. І не ўжывайце такую ежу самі. Ні ў якім выглядзе. Не бачачы перад сабой падобных «далікатэсаў», дзіця з часам перастане іх прасіць.

3 МЕСЦА: КАЎБАСА, ВЯНДЛІНА

Сасіскі, каўбасы, шпікачкі, пельмені і г.д. Прадукцыя, якую мы часцей за ўсё з вамі купляем, утрымлівае больш араматызатараў і фарбавальнікаў, чым мяса. Таксама яны звычайна ўтрымліваць глютамат натрыю. Атручэнне апошнім праяўляецца ў выглядзе галаўнога болю, спазмаў сасудаў і нават парушэння абмену рэчываў.

Вэнджаныя мяса і рыба таксама трапілі ў рэйтынг за высокае ўтрыманне канцэрагенаў. Яны ўтвараюцца ў працэсе апрацоўкі ў выглядзе рэчыва бензапірэну.

Усё больш вытворцаў пераходзіць на генна-мадыфікаваную сыравіну. Напрыклад, сасіскі, каўбасы на 80 % складаюцца з трансгеннай соі. А адзін кавалак вэнджанай каўбасы змяшчае столькі фенольных злучэнняў, колькі чалавек удыхае ў горадзе за год! Фенол вельмі таксічны.

4 МЕСЦА: АГАРОДНІНА І САДАВІНА, ПРАДУКТЫ З КАНСЕРВАНТАМІ

Нават самыя карысныя і натуральныя прадукты могуць стаць шкоднымі, калі іх вырасцілі, напрыклад, каля шашы або завода. Пакаштаваўшы такой агародніны, можна атрымаць добрую долю бензапірэну і іншых рэчываў, што выклікаюць рак.

Што да кансервантаў, то яны правакуюць алергічныя рэакцыі, выклікаюць хваробы страўнікава-кішачнага тракту і злаякасныя пухліны.

5 МЕСЦА: МАРГАРЫН, ПІРОЖНЫЯ І ЗЛАКАВЫЯ

Маргарын — гэта суцэльны трансгенны тлушч — самы шкодны від тлушчу. Шкодныя ўсе прадукты з яго ўтрыманнем. Гэта пірожныя, тарты з крэмам, пячэнне, вырабы са слоенага цеста. Празмерная любоў да гэтых насычаных цукрам і тлушчам прадуктаў практычна гарантуе парушэнне абмену рэчываў і лішнюю вагу.

Злакавыя, у прыватнасці, белы хлеб, трапілі ў спіс з-за таго, што часта выклікаюць непераноснасць. Хвароба называецца цэліякіяй. Сімптомы вагаюцца ад праблем з кішэчнікам да дыябету і бясплоднасці.

6 МЕСЦА: КАВА І ЭНЕРГЕТЫКІ, МАЛАКО

Два-тры кубкі кавы на дзень, не больш. Столькі можа выпіваць дарослы чалавек, не рызыкуючы знясіліць сваю нервовую сістэму. Энергетычнымі напоямі ўвогуле лепш балавацца як мага радзей. Малако, як і хлеб, часта з'яўляецца непераносным прадуктам. Атручэнне малочнымі бялкамі ў цяжкіх выпадках можа прывесці нават да лятальнага зыходу.

7 МЕСЦА: ХАТНІЯ НАРЫХТОЎКІ І МАРОЖАНАЕ

Калі ставіць слоікі па ўсіх правілах — захоўваць дазіроўку прадуктаў і не грэбаваць элементарнай харчовай бяспекай (правільнай стэрылізацыяй, праліваннем расолу), салёныя агуркі і памідоры можна есці без боязі.

Марожанае ўтрымлівае загушчальнікі і араматызатары, якія могуць замаруджваць абмен рэчываў. А гэта, як мінімум, павышаная рызыка з'яўлення лішняй вагі.

8 МЕСЦА: ЖАВАЛЬНЫЯ ЦУКЕРКІ, ПАСТЫЛА, ЧУПА-ЧУПСЫ

Утрымліваюць вялікую колькасць цукру, хімічныя дабаўкі, фарбавальнікі, заменнікі і да т.п. Адным словам, ніякай карысці.

9 МЕСЦА: ШАКАЛАДНЫЯ БАТОНЧЫКІ

Гэта гіганцкая колькасць калорый у спалучэнні з хімічнымі дабаўкамі, генетычна мадыфікаванымі прадуктамі, фарбавальнікамі і араматызатарамі.

10 МЕСЦА: МАЯНЭЗ

Маянэз поўны транстлушчаў, якія з'яўляюцца канцэрагеннымі і ў дадатак выклікаюць павышэнне ўзроўню халестэрыну. Нельга есці маянэзы, асабліва ў пластыкавых упакоўках. Воцат выдзяляе з пластыку самыя канцэрагенныя рэчывы! Маянэз утрымлівае вялікую колькасць кансервантаў і стабілізатараў.

Да ліку шкодных прадуктаў адносяцца і кетчуп, розныя соусы і запраўкі, якія ў шырокім асартыменце прадстаўлены на прылаўках крамаў.

БЕЛТА

Дзесяцікласнікі рабавалі пенсіянерак

Падлеткі падазраюцца ў тым, што высочвалі бабулек і адбіралі ў іх грошы і тавар.

Нападалі двое вучняў адной са сталічных школ, паводле звестак прэс-афіцэра Савецкага РУУС Вольгі Яскевіч, на тых пенсіянерак, якія гандлявалі семкамі і цыгарэтамі. Прычым крыўдзіцелі старых у такіх выпадках разлічвалі застацца чыстымі перад законам: маўляў, бабулькі не будуць звяртацца ў міліцыю, таму што і самі з'яўляюцца парушальніцамі — яны ж гандлююць незаконна. Толькі пралічыліся зладзюжкі: пасля некалькіх нападаў іх усё ж затрымалі. Што датычыцца сцэнарыя гэтых злачынстваў, то яны практычна заўсёды выконваліся нібыта пад капірку. Напачатку хлопцы знаходзілі ахвяру, пасля высочвалі яе месца жыхарства і ў зручны момант нападалі ў пад'ездзе, палюючы за сумкай. Выручку яны дзялілі, а цыгарэты, якія адбіралі, прадавалі ў школе, прычым ўдвая танней. Затрыманыя выхоўваліся ў цалкам паспяховых сем'ях. Устаноўлены чатыры факты супрацьпраўных дзеянняў школьнікаў, аднак не выключана, што пацярпелых было і больш.

Ігар ГРЫШЫН.

Абакралі канал

У Маларыцкім раёне каля вёскі Пячкі з меліярацыйнага канала прапалі металічныя часткі шлюза і механізмы рэгуляцыі вады. Аказалася, што ўсё гэта забраў 40-гадовы мясцовы трактарыст, яшчэ і 16-гадовага сына прыцягнуў для нядобрай справы.

Яна СВЕТАВА.

5 мая

Дзве даты

1819 год — у маёнтку Убель (сёння Чэрвеньскі раён Мінскай вобл.) нарадзіўся Станіслаў Манюшка, выдатны кампазітар, дырыжор і педагог, класік польскай і беларускай вакальнай лірыкі, стваральнік нацыянальнай класічнай оперы. З 1840 года — арганіст і дырыжор у Вільні, з 1858-га — дырыжор і дырэктар опернага тэатра, прафесар Музычнага інстытута ў Варшаве. Стварэнне першых вадэвіляў, музычных камедый і камічных опер Манюшкі звязана з Радзімай, з Беларуссю. У ліку найбольш вядомых опер: «Галька», «Графіня», «Страшны двор» і інш. Памёр у 1872 годзе.

1836 год — у Бельгіі адкрыўся рух па першай у Еўропе чыгунцы.

Цытата дня:

«Калі перавядуцца на свеце данкіхоты — няхай закрыецца кніга Гісторыі: у ёй ужо не будзе чаго чытаць».

Іван Тургеневў (1818—1883), рускі пісьменнік.

«ШТО ДВА, ТО НЕ АДЗІН», або Сімволіка ліку «два»

Лік «два» задае зыходную сіметрыю светабудовы, палярызацыю эмацыйнага і рацыянальнага светаўспрыняцця і светаадчування, а таксама ўвасабляе класічны прынцып дуальнага адлюстравання сусвету. Сакралізацыя ліку «два» надзейна агорнутая тайнай магіі пераўтварэння, трансфармацыі. Двойка пастаянна мімікрыруе, з аднаго боку вырастаючы з адзінкі, падзяляючы яе або пастаянна пераўвасабляючыся ў яе, а з другога — яе дваістасць правакуе ўзнікненне трэцяга.

● Сярод найбольш пашыраных бінарных апазіцый ва ўсходнеславянскай, у тым ліку і беларускай, традыцыйнай спадчыне з'яўляюцца наступныя: жыццё/смерць, мужчына/жанчына, добра/зло; дзень/ноч, правы/левы, верх/ніз і г. д. Кожная з гэтых апазіцый утрымлівае супрацьстаянне станоўчага і негатыўнага пачаткаў, закладзеных актам Боскага першатварэння, дзе першае звязана са Святлом (светам жывых), а другое — з цемрай (светам памерлых).

● Прывядзём некалькі прыкладаў палярызацыі ацэнкі і змены яе на супрацьлеглую пры ўмове наяўнасці другой складовай часткі «двойкі»: лічылася недапушчальным, каб дзіця калыхалі два чалавекі (доля дзіцяці будзе нешчаслівай), нельга было нават пераносіць калыску ўдваіх; зусім непажадана, каб у хаце знаходзіліся два венікі, забаранялася ў два венікі месці хату або двор — вымецеш з хаты долю дамачадцаў, хатнія не ўжывуцца ў згодзе, а захочуць падзяліцца, або дзяўчаты замуж не пойдуць; адначасова дзве жанчыны не будуць мыць бялізну на адной кладзі; забаранялася дзвюм жанчынам мыць бялізну ў адных ночвах; нельга дапускаць, каб два чалавекі пілі ваду з аднаго посуду (адсюль рытуальная забарона на святочным або памінальным стале «дапіваць» гарэлку з чужой чаркі, г. зн. забіраць сілу таго чалавека) або зліваць гарэлку з дзвюх бутэлек у адну; у адзін і той жа дзень у вёсцы не будуць пачынаць будаўніцтва дзвюх новых хат; два гаспадары не пачыналі аднаасова сяўбу. Лічылася, што ўвесь ураджай будзе ў руках першага гаспадара, другому ж не пашчасціць, а бывала, што хлеб не ўродзіць ні ў таго, ні ў другога.

● З гэтай самай нагоды лічылася непажаданай (і нават зусім кепскай) сустрэча двух вясельных поездаў на адной дарозе (у той пары, якая саступіць дарогу, першае дзіця можа нарадзіцца нежывым). Кепска, калі сустрэнуцца дзве нявесты (адна з іх застанецца бяздзетнай), двое сватоў з розных вяселляў або дзве парадзіхі, якія нарадзілі дзяцей у адзін і той жа дзень; калі нясуць хрысціць дзіця, то перасцерагаюцца, каб не было «зносу», г. зн. сустрэчы двух дзяцей.

● Цэлы шэраг абмежаванняў выпрацавала культура народных традыцый у дачыненні да побытавых і рытуальна-абрадавых сітуацый, да якіх існавала няпісанае прадпісанне: «Пашанцуе, калі ўдасца з першага разу»: лічылася, што сям'ю можа напаткаць бяда, калі падчас выпякання велікоднага каравая («паскі») яго давядзецца паўторна ставіць у печ, каб давесці да канчатковай гатоўнасці; нельга кусаць другі кавалак хлеба, калі першы застаўся недаедзеным; раілі толькі адзін раз адлучаць дзіця ад грудзей. Калі ж гэта зрабіць двойчы, тое дзіця стане завідушчым, вірлавокім, а праз тое будзе сурочваць людзей.

● У казачным эпасе беларусаў шырока прадстаўлены матыў дэманічнай сімволікі двойкі. Так, нячыстую сілу (чорта) можна перамагчы толькі ў тым выпадку, калі яго секанеш або ўдарыш булавой толькі адзін раз.

● Сімволіка ліку «два» выразна праяўлена перш за ўсё ў пахавальна-памінальнай абраднасці і асацыюецца са смерцю (калі быць больш дакладным, то часцей за ўсё — з прадказаннем смерці). У побытавым плане наяўнасць двух аднатыповых атрыбутаў сведчыць пра імкненне да раздваення, распаду, падзелу адзінага на дзве асобныя часткі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Віншуем паважанага **БОГДАНА Мікалая** з в. Сяменчыцы з **70-годдзем**. Жадаем моцнага здароўя, бадзёрага настрою і доўгіх гадоў шчаслівага жыцця.

Сям'я МІШУКОЎ *з в. Літва.*

Занатоўкі мастака

Юра і юрты

Юра купляе часопісы «Вакол свету» і малюе юрты. Ён марыць паехаць у Сярэднюю Азію і памаляваць тамтэйшыя краявіды з натуры. Але ў Юры брак сродкаў, ён моцна абмежаваны ў грашах, нават сваю трохпакаёвую кватэру Юра аддае сястры, бо ў той двое дзяцей, ім зацесна ў двухпакаёўцы. Юра з маці пераедзе ў меншую кватэру, а сястра з дзецьмі ў прастарнейшую. «Жыву з маці. Мне так спакойна. Калі знойдзецца добрая жанчына...» Пакуль не знайшлася добрая жанчына, Юра жыве з маці і малюе юрты ў свае пяцьдзясят два гады.

Алёнка, далонь і Нехта

Літаратарка сярэдняй рукі — Алёнка — распавядала мне, што Нехта праз яе піша і піша. Нібыта не сама Алёнка настуквае на камп'ютары паўграфаманію, а нехта ёй тую грамафонію надыктоўвае. Алёнка пастуквала сябе даланёю па патыліцы, паказваючы, як гэты Нехта дыктуе. Маўляў, стаіць той Нехта за Алёнкаю і дыктуе ёй у патыліцу. Жудасная рэч: бачыць, як чалавек пастуквае сябе даланёю па патыліцы і вочы закатвае так, што на твары застаюцца адны бельмы.

Ісачоў і Жданаў

Мастакі не любяць мастацтвазнаўцаў, як пісьменнікі не ў захапленні ад зладзейнасці крытыкаў. Пра гэта шмат разоў паўтаралася і шмат паўторыцца. Мастакі лічаць, што мастацтвазнаўцы, у большасці сваёй, няўдалыя мастакі, як музычныя крытыкі збольшага кепскія музыкі. За такое грэблівае і ў большасці выпадкаў несправядлівае стаўленне да сябе мастацтвазнаўцы пачынаюць помсціць мастакам. Як? Яны абвяшчаюць геніямі поўных ідыётаў. Здавалася б, і дзіця разумее: каб стаць мастаком, трэба доўга вучыцца, а потым — шмат працаваць. Кожны школьнік разумее, што невук і дурань у прызнаныя мастакі не патрапіць, але мастацтвазнаўцы падлюка спрабуюць падмануць школьніка з правільнымі ведамі. Яны выцягваюць са сметнікаў мярзотныя карцінкі і пачынаюць іх ухваляць. Цынізм мастацтвазнаўцаў бяздонны, бо цяжка ўявіць, з-пад якіх гурбаў смецця можна было павыцягваць саладжавы і слінявы кіч недавука Ісачова і дурнаколерныя паперкі хворага на ўсю вечна п'яную галаву Жданава. Разгрэблі смецце, дасталі брыдоту, развесілі на сценах і спяваюць хваласпевы. «Хай квітнеюць усе кветкі! Хай кожны мастак знойдзе прызнанне...» З такіх вось «хай-хай-хай» пачынаюцца ўхваленні нікчэмнасцяў, няздараў і пасрэднасцяў з іх дрэнню. Прымірыць мастакоў і мастацтвазнаўцаў мне, як і нікому іншаму, не ўдасца, бо гэта проста немагчыма, як немагчыма прымірыць хвалю і вецер, але выказацца пра недарэчнасць ухваленняў Ісачова і Жданава я лічу неабходным, бо абодва рабілі дрэнь.

Луся, Маша, Тамара і «Лас Вегас»

Быць залатым чалавекам лёгка. Табе кажуць, што ты запрошаны ў клуб «Нэкст» выконваць ролю зоркі. Апранаецца фіялетавая кашуля, апранаецца фіялетавы тоненькі швэдар, і ты выглядаеш выдатна-фіялетавай зоркай. Быць блакітнай зоркаю ў цябе кепска атрымлівалася, у афіцыйныя шэрастройныя зоркі ты таксама не рваўся, як і пазбягаў стасункаў з зоркамі колеру хакі. Фіялетавы колер самы твой. На сцэне была Луся, яна выпрошвала ў свайго партнёра сукенку на восьмага сакавіка. Партнёр у шырокім, як руковая моналыжа, гальштуку абяцаў Лусі сукенку тую падарыць. «Зорак з неба я табе, дарагая Луся, не абяцаю, а сукенка ад Цыгаль будзе тваёю!» Сукенка тая была сапраўды ад масквічкі Цыгаль. Яшчэ масквічка прывезла аксесуар. Цыгаль прывезла падушачку! Яе разыгрывалі, і я мог... Не мог! Не атрымаў я падушачку, яе атрымаў чалавек з квітком нумар 99, а ў мяне быў нумар 52. Давялося ісці дамоў без падушачкі. Я не вельмі растроіўся, бо падушачка ад Цыгаль не спалучалася з маім фіялетавым швэдрам. Са швэдрам маім добра спалучалася Тамара Ганчарова, якая кіравала паказам калекцыі апранах, нароблены Машай Цыгаль. Тамара прывяла манекеншчыц. Тамара ўмее выбрацца і прывесці дзяўчатак на паказ. Нехта за маёй спінаю сказаў, што Тамара «прывяла бракаваных дзевак». Заўжды знойдзецца паскуда, якая самых прыгожых дзяўчат назаве «бракаванымі дзеўкамі». Такім паскудам нельга верыць ні на грош, але вераць менавіта ў кепскае. Таму я скажу, што кепскім у гэты вечар быў ансамблік «Лас Вегас». Я не вялікі аматар музыкі савецкага Азербайджана. Я ніколі не захапляўся творчасцю Бюль-Бюль Аглы і Мусліма Магамаева. А тут сяджу за барнай стойкаю, п'ю яблычны сок і чую музыку савецкага Баку. Ну не маё, праўда. Для мяне гэта кепска. Можа, каму... Мне вечарына Альфа-Банка спадабалася! Праўда, самая што ні ёсць залатая праўда ад фіялетавай зоркі!

Аляксей і кавун

З суседзямі я стараюся не сварыцца, бо няўтульна жыць, калі ты пасвараны з тымі, хто штодня праходзіць побач. З суседзямі я суісную, але сябраваць з імі я не сяброю. Кватэр я памяняў шмат, а таму і суседзяў назбіралася многа. Днямі мама распавядала, што неяк бачыла нашага даўняга суседа Аляксея. Ён недабачваў на адно вока, ён наогул кепска бачыў, але пазнаў маму па голасе. А потым маме сказалі, што Аляксей памёр. Побач з Аляксеем мы пражылі пяць гадоў. Ён працаваў мастаком, ездзіў на Азоўскае мора лавіць рыбу і аднаго разу частаваў мяне кавуном. Аляксей купіў вялізны кавун, які варта было з'есці за адзін дзень. Аляксей паклікаў мяне. Кавун той быў незабыўна-ружовы, цукровы і сонечна-святочны.

Адам ГЛОБУС.

НЕДАСОЛ НА СТАЛЕ — ПЛЮС ЗДАРОЎЮ

Улады ЗША маюць намер на заканадаўчым узроўні абмежаваць утрыманне павараной солі ў прадуктах харчавання. У рамках паэтапнай праграмы, разлічанай на 10 гадоў, яны збіраюцца ўстанавіць абмежаванні на ўтрыманне солі ў мучных вырабах, соусах і многіх іншых таварах прадуктовага рынку, аб'ём якога ацэньваецца ў 600 мільярдаў долараў.

Даследчыкі з Калумбійскага і Стэндфардскага ўніверсітэтаў высветлілі, што зніжэнне спажывання амерыканцамі солі на тры грамы ў дзень дазволіць істотна зменшыць сярод насельніцтва колькасць сардэчных прыступаў, інсультаў і выпадкаў ішэмічнай хваробы сэрца. Па інфармацыі экспертаў, 77 працэнтаў солі якую спажываюць штодня амерыканцы, яны атрымліваюць разам з гатовымі прадуктамі харчавання, што істотна ўскладняе самастойнае скарачэнне яе спажывання. Так званая «салёнасць» прадуктаў будзе зніжацца паступова, каб спажыўцы гэта практычна не заўважылі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Усміхнемся!

Сапраўдны мужчына павінен памятаць тры даты: дзень нараджэння жонкі, дзень нараджэння цешчы і дату апошняга тэхагляда.

☺

— Адпачыць збіраецеся?

— Так, у паход ідзём.

— Надоўга?

— На 2 скрыні гарэлкі...

☺

**Брытанскія навукоўцы ажыццявілі прарыў. Чатыры сантэхнік